№ 38 (444) 14 кастрычніка 2005 www.nn.by

# Наша Ніва

П Е Р Ш А Я Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Э Т А

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

# Аляксандар Мілінкевіч:

## Пошліны на ўвоз аўтамабіляў варта адмяніць



СЯРГЕЙ ГРЫЦ

**А.Мілінкевіч (зьлева) у сераду правёў першае паседжаньне Палітычнай рады пры адзіным кандыдату.**

На апошнім тыдні ў СМІ шмат гаварылася аб новых мерах па рэгуляваньні імпарту патрыманых аўтамабіляў. Гэта выклікала чарговы ажыятаж на рынку. «НН» пацікавілася ў новага лідэра апазыцыі, як ён ставіцца да пастановы Лукашэнкі аб новых правілах увозу аўтамабіляў у Беларусь? Вось што ён адказаў:

— Лічу, што Лукашэнка зьбіраецца падмяць пад сябе чарговую галіну, і гэтая пастанова — чарговы крок да зьнішчэньня прыватнага бізнэсу. Чалавек вольны распараджацца сам сваім бізнэсам. Што датычыць пошлінаў, то паколькі Беларусь сваіх легкавікоў не вырабляе, варта іх зьліквідаваць, а не абараняць чыесьці інтарэсы, напрыклад, Расеі. Перавозчыкам аўтамабіляў я б сказаў: «Хлопцы, пакуль мы самі ня справімся, нічога ня будзе».

**Працяг тэмы — старонка 3.**

### 210 тысяч Мілінкевічаў

**Лавіна цікавасьці да Мілінкевіча:** у аўторак пошукавік google.com даваў 30 800 спасылак на «Мілінкевіч» і 179 000 на «Милинкевич», прычым іх колькасьць расьце лавінападобна. Яшчэ ў суботу беларускіх спасылак было толькі 24 100. Да параўнаньня: на прозьвішча «Лябедзька» маецца толькі 12 300 спасылак, на «Лебедько» — 129 000. Але да Лукашэнкі яшчэ далёка: 99 500 на «Лукашэнка» і 2 мільёны 650 тысяч на «обшчапанятнам». Дарэчы, на «Лукашенко» першым выскоквае афіцыйны сайт прэзыдэнта, а другім — рэсурс «Увесь Лукашэнка ў малюнках і гуказапісах».

### Маўчаньне «БелГазеты»

**Красамоўнае маўчаньне лукашэнкаўскіх і прарасейскіх СМІ.** «БелГазета» згадала новага лідэра апазыцыі толькі аднойчы, акцэнтуючы, што ягонае абраньне выклікала незадавальненьне сяброў АГП. «Беларусь сегодня» за тыдзень не ўпамінае гэтага прозьвішча ні разу. Лукашэнкаўцы спадзяюцца, што інфармацыйная блякада запаволіць рост рэйтынгу А.Мілінкевіча.

**«Зьнішчэньне — фізычнае ці нейкае іншае — адзінага кандыдата можа ў выніку зрабіцца адным з самых магутных мабілізацыйных фактараў» — старонка 4.**

### КАЛЁНКА РЭДАКТАРА

## Чаму Адзіны мае шанцы перамагчы

Лідэры апазыцыі шматкроць заяўлялі, што галоўная задача – «вывесьці людзей на вуліцы». Каштуніца і Ючшчанка такога не казалі. Яны ня ставілі калёсаў папярод каня і лічылі галоўным перамогу на выбарах. Калі даць людзям ідэю, справядлівейшую за Лукашэнкаву, і праграму, прывабнейшую за Лукашэнкаву, выбарцы ў разе патрэбы самі выйдуць на вуліцы. Калі папулярнасьць Мілінкевіча перавысіць Лукашэнкаву, абараніць перамогу стане справай тэхнікі.

Тонкасьць беларускай сытуацыі ў тым, што сыстэма паляціць нават раней, чым рэйтынг Мілінкевіча дасягне ўмоўнага 51%. Варта яму проста перавысіць нейкі пункт кіпеньня — цяжка сказаць, колькі гэта ў беларускіх умовах, 20, 30 ці 40 працэнтаў, — як рэжым пачне сыпацца зь сярэдзіны. Гэтым мы розьнімся ад Украіны, што ўсё ж была дэмакратычнай. Аўтарытарная сыстэма нестабільная па вызначэньні. Султанат жа ўвогуле не прадугледжвае альтэрнатывы і грунтуецца на падтрыманьні легенды аб лідэру нацыі з абсалютнай падтрымкай. Легенда рушыцца — і султан сыледам за ёй.

У гэтым выпадку не канечне да ўлады адразу прыйдуць Дэмакратычныя сілы. Але трансфармацыя рэжыму стане непазьбежнаю.

Мілінкевіч — вялізная ўдача апазыцыі. Выбар спыніўся на лідэры разумным, рэалістычным і ахвярным адначасова. Гэта кампэнсуе ўсе яго магчымыя слабіны. Самаахвярнасьць супэрважная ва ўмовах, калі апазыцыя ня мае ні гарантый, ні імунітэту. «Зьнішчэньне — фізычнае ці нейкае іншае — адзінага кандыдата можа ў выніку зрабіцца адным з самых магутных мабілізацыйных фактараў», — заявіў Мілінкевіч (старонка 4). Так, у Аляксандра Другога ёсьць і ідэйны стрыжань, і навіна.

Але ці зможа Мілінкевіч дасягнуць гэтага пераломнага рэйтынгу, калі няма рэвалюцыйнай сытуацыі?

Штосьці адзіны кандыдат набірае проста за кошт тых, хто ня церпіць «шклоўскага самародка». Нешта яшчэ — з галасоў патрыётаў. Трохі — між землякоў. Нештачкі ў яго адгрызаюць кандыдаты-раскольнікі. Для крытычнае масы патрэбная яркая, уцямная і рэалістычная сацыяльна-эканамічная праграма — вобраз іншае Беларусі, якую мы можам пабудаваць. Ці створыць?

**Працяг на старонцы 2.**

### У НУМАРЫ

**Таямніцы Сыса**
Піша Алесь Бяляцкі.
**Старонка 12.**

**Зомбі сапраўды існуюць**
Рэальнасьць XXI стагодзьдзя.
**Старонка 17.**

**Садыст, постмадэрніст, клясык**
Аляксандар Фядута пра Юрася Пацюпу.
**Старонка 9.**

### «НН» 100 гадоў з вамі

Падпісны індэкс «НН» 63125. Падпіска каштуе 4510 рублёў на месяц. Падпіска на шапікі «Белсаюздруку» таньнейшая: 3440 руб. на месяц. «Наша Ніва» — гэта 24 старонкі праўдзівай інфармацыі і вострых камэнтароў штотыдзень. Дык падпісвайся!

## Намалот языком

Рэляцыі з «Дажынак» хаваюць правальны стан сельскай гаспадаркі: намалот збожжа склаў 92% ад леташняга, збор бульбы — 63%. Але ў тэлевізары лічбы працягваюць расьці. **Зьміцер Дрыгайла** — пра мэханізм прыпісак.

Уборка скончаная. Паводле зьвестак аблсельгасхарчаў, зьмешчаных на сайтах аблвыканкамаў, сяляне Меншчыны сабралі 1,649 млн т, Гарадзеншчыны — 1,319 млн т, Берасьцейшчыны — 1,002 млн т, Гомельшчыны — 0,915 млн т, Магілёўская вобласьць і Віцебшчына сабралі найменш — 0,872 млн т і 0,599 млн т адпаведна. Разам выходзіць 6,356 млн т, што не дацягвае да абяцаных сямі мільёнаў. Дзяржаўнае агенцтва БелТА 4 кастрычніка падало лічбу 6,355 млн т. Але прапагандыстам гэтага здалося мала. Прэзыдэнцкая газэта выдала на першай паласе, што ўраджай склаў ажно 7,025 тыс. тонаў!

Апошняя лічба выклікае лёгкі сьмех, як і берасьцейскія 1,002. Дзяржаўныя СМІ ствараюць «паралельную рэальнасьць», якая ня мае нічога супольнага з сапраўдным станам справаў. У




PHOTO.BYMEDIA.NET

народзе пра гэта кажуць: «найбольш намалаціў тэлевізар».

Гомельскаму Камітэту дзяржкантролю хапіла сьмеласьці паставіць зьвесткі пра рэкордны ўраджай пад сумнеў.

**Працяг на старонцы 5.**

КАЛЁНКА РЭДАКТАРА

## Чаму Адзіны мае шанцы перамагчы

**Працяг са старонкі 1.**

Усёй той расьцярушанай большасьці людзей, якія адчувалі сябе дурнямі ўсе гэтыя гады, Мілінкевіч даў надзею. Яны нюхам адчулі — вось яна, нармальнасьць, дакраніся, яна побач, вось ён, нармальны палітык, пры якім краіна стане нармальнаю і нікому прытым ня стане горш. (Аналіз іміджу Мілінкевіча — старонка 3.)

Гэтым Мілінкевіч выклікаў вялізную цікавасьць да сябе. Газэты зь Мілінкевічам на першай паласе прадаюцца на ўлёт.

У інтэрнэт-апытаньнях на ягоную тэму ўдзельнічае рэкордная колькасьць наведнікаў. Па колькасьці спасылак на сябе ён перагнаў усіх палітыкаў. Дзівосна ўзрос грамадзкі аптымізм. Так, сярод апытаных на сайце naviny.by наконт шанцаў адзінага кандыдата на перамогу меркаваньня «лбом муру не праб’еш» трымаецца ўсяго 24%. Нечувана мала для Беларусі.

Пазытыў водгукаў Мілінкевіч сам назваў «авансам». Гэта больш адбітак грамадзкіх чаканьняў, чым зробленага самім палітыкам. Сама гэтая запатрабаванасьць фармуе фэномэн Мілінкевіча. Палітычнае жыцьцё імкнецца да альтэрнатыўнасьці, і Мілінкевіч-функцыя вяртае гэтую альтэрнатыўнасьць. Што выгадна многім-многім, а мо і ўсім. Карацей, бяры і перамагай.

# Хопіць прыкідвацца русафіламі

Валер Булгакаў пра выбары і Расею.

**Юры Дракахруст** гутарыць з рэдактарам часопісу «ARCHE» Валерам Булгакавым — з праграмы «Праскі акцэнт» радыё «Свабода».

**— Ці такую ўжо важную ролю адыгрывае Расея ў выбарчай кампаніі наступнага году? Ці правільнай Вам падаецца думка, што пераможа толькі той, каго падтрымае Расея?**

—Уплыў Расеі на вынік выбараў будзе, безумоўна, істотны. Узяць хаця б інфармацыйны фактар. Не сакрэт, што бальшыня беларусаў спажывае расейскія інфармацыйныя прадукты, якія цяпер, калі Расея спаўзае ў аўтарытарызм, прапаноўваюць крыху перакрыўленую карціну сьвету. Я б досыць радыкальна фармуляваў сваю тэзу: ня можа быць пасьпяховай агітацыйная кампанія адзінага дэмакратычнага кандыдата, калі ладная частка беларускага электарату дагэтуль жыве ў расейскім інфармацыйным сьвеце. Нават пасіўнасьць Расеі будзе азначаць, што пуцінскі рэжым працуе на падтрыманьне status quo. На апошняй жа стадыі супраць адзінага дэмакратычнага кандыдата, як летась супраць Юшчанкі, расейскія СМІ могуць разьвязаць брудную прапагандысцкую вайну.

**— Валерка, Вы ўжо разважаеце пра тое, што будзе, калі Мілінкевіч стане прэзыдэнтам. Але ёсьць меркаваньне, што беларускія палітыкі, якія ўспрымаюць Расею толькі як факт, а не спрабуюць весьці там нейкую гульню, ня маюць шанцаў ні на што. Вы ня згодны з гэтым?**

— Катэгарычна нязгодны. У Расеі паглыбляецца аўтарытарызм, яна канфрантуе з заходняй дэмакратычнай супольнасьцю. Гэта ня прыклад для перайманьня. Уся лёгіка палітычных рухаў найбліжэйшых нам краінаў — Балтыі, Украіны і нават Польшчы — паказвае, што ўваход у дэмакратычную прастору будзе адштурхоўваньнем ад Расеі, што спрацоўвае прымітыўная палітычная фізыка. Усе гэтыя хаўрусы, дамоўленасьці з боку арыентаваных на Захад беларускіх палітыкаў з Расеяй, яны абодвума бакамі ўспрымаюцца як часовы кампраміс. Расея ніколі ўсур’ёз ня будзе рабіць стаўку на сапраўднага дэмакратычнага, нацыянальнага палітыка. Трэба не заігрываць, а нарошчваць свой палітычны, інфармацыйны і культурны капітал, які зможа некалі выйсьці на парытэт сілаў і магчымасьцяў.

Гэта звычайная квазілібэральная песенька, што нацыяналісты ўзбуджаюць найбольшую нянавісьць сярод паспалітых беларусаў. Такія цьверджаньні лёгка спраставаць на матэрыяле сацыялягічных дасьледаваньняў. Нядаўна мы зрабілі аналітычную працу «Найноўшая гісторыя беларускага парлямэнтарызму». Я як рэдактар не безь зьдзіўленьня высьветліў, што найбольшы рэйтынг сярод апазыцыйных дэмакратычных палітыкаў за ўвесь пэрыяд незалежнасьці меў той самы злашчасны Зянон Пазьняк, рэйтынг якога паводле дасьледаваньняў Вардамацкага і НІСЭПД у 1995—1996 гадох сягаў 15—16%.

Я схільны прытрымлівацца думкі, што дэмакратычна арыентаваным прадстаўнікам беларускай інтэлігенцыі трэба скідаць гэтыя фігавыя павязкі, хопіць прыкідвацца русафіламі і няяснымі дэмакратамі. У Прыбалтыцы, Польшчы і ва Ўкраіне «маторам» дэмакратызацыі была нацыянальная культура, клопат пра яе, а таксама заснаваны на культурных траўмах палітычны папулізм. Гэты шлях ужо апрабаваны.

Мы маем сутыкненьне двух сьветапоглядаў: сьветапогляду празаходняга нацыянальнага і сьветапогляду напаўкаляніяльнага, які генэтычна ўзыходзіць да заходнерусізму. Кожная саступка гэтаму другому сьветапогляду непазьбежна гуляе ў пэрспэктыве супраць нас.



**На хвалі цікавасьці да Беларусі «N.R.M.» заваёўвае Эўропу. На фота: 3 кастрычніка Лявон Вольскі сьпяваў у бэрлінскім клюбе «Kato».**

БЭЦІНА ШАЙБЭ

### Дзень беларускай салідарнасьці

Журналістка Ірына Халіп, жонка зьніклага прадпрымальніка Анатоля Красоўскага Ірына і моладзевы актывіст Мікіта Сасім прапанавалі 16 дня кожнага месяца адзначаць Дзень беларускай салідарнасьці ў знак памяці пра ахвяраў палітычных рэпрэсій. Яны заклікалі 16 кастрычніка роўна а 20–й пагасіць у хатах сьвятло і запаліць сьвечы на падаконьні.

СПОРТ

### Мірны заваёўвае Крэмль

Максім Мірны выйшаў у чвэрцьфінал прэстыжнага тэніснага турніру «Кубак Крамля» (прызавы фонд — $2,3 млн) У другім раўндзе 12 кастрычніка ён перамог расейца Тэймураза Габашвілі — 4:6, 6:3, 6:1. Працягвае беларус выступ і ў парным разрадзе. У чвэрцьфінале дуэт Мірны / Міхаіл Южны згуляюць зь італьянцамі Даніэлем Брачалі і Філіпам Валяндры.

ШАПІК З ПРЭСАЙ

### «Непрыходзячая каштоўнасьць»

Такі падзагаловак сустракаецца на старонцы 3 «Настаўніцкай газеты» ад 6 кастрычніка. Як Вашаць думаеш, што гэта такое? Чытаем у тэксьце: «Непрыходзячая каштоўнасьць — А.Пушкін зь яго гармоніяй і высокімі пачуцьцямі». Ай-яй-яй, пэдагогі.

ЖАРТ

Застрайкавалі кіроўцы маршрутак. Галоўнае патрабаваньне — адмяніць правілы дарожнага руху.

## Дырэктарка «НХ»: Беларускую мову адстойвае купка апазыцыянэраў

«Народная воля» зьмясьціла рэкляму «Нямецкай хвалі», а тады яшчэ й гутарку з начальніцай расейскай службы станцыі. Вы думаеце, чытачы гнанага выданьня пачулі прабачэньне за раскол, да якога прывяло неабдуманае рашэньне «Нямецкай хвалі»? Не, спн.Рабіц заявіла: «Пачатак спрэчцы пра мову паклала і ўсё больш нагнятае сытуацыю невялічкая група апазыцыянэраў».

Заўважце словы: група, апазыцыянэры. Якое культуртрэгерскае стаўленьне да патэнцыйнае аўдыторыі! «Гэта мяне дзівіць, — працягвае К.Рабіц. — Мяне больш пацешылі б дыскусіі пра зьмест беларускай праграмы».

О так, зьмест «беларускае праграмы» будзе залаты. 138 тысяч эўра на год, ці то 177 эўра на кожную хвіліну вяшчаньня! Каб вы зразумелі: калі гэтую маю рэпліку зачытаць у этэры, гэта зойме больш за дзьве хвіліны. Бац — і 354 эўра ў кішэні. Геніяльна! Ну а беларускую мову асвоіць — то ж то праца.

Параўнайце бюджэт праграмкі пані Рабіц зь бюджэтам усяе падпольнае прэсы ў Беларусі разам узятае. Адчулі розьніцу? Можа, спадарыня гатовая дыскутаваць ня толькі пра зьмест, але і пра эфэкт?

Калі я чытаю такіх Рабіц, у мяне ствараецца ўражаньне, што пэўныя людзі робяць усё, абы толькі не зрабіць для Беларусі нічога.

Прынамсі, гульні па аббяганьні праціўніка за кілямэтар ня маюць да барацьбы беларусаў за свабоду ніякага дачыненьня.

**Барыс Тумар**

**У Рэдакцыю працягваюць пастунаць сотні подпісаў за беларускую мову «Нямецкай хвалі». Людзям гэта важна! — старонка 14.**

# Антылукашэнка: імідж Мілінкевіча


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Ярлыкі для адзінага кандыдата давядзецца шчодра намазваць сьлінай.

Нейкі «дзіўны» ў Мілінкевіча імідж — няма за што і ўчапіцца. Прынамсі, каб начапіць на адзінага кандыдата ярлык, давядзецца яго доўга і старанна сьлініць. Жменьку такіх «лэйблаў» (хоць яны і ня маюць нічога агульнага з рэальнасьцю) можна наскрэбці ўжо цяпер. Толькі ці будуць яны трымацца?

**«Мілінкевіч — заходнік».** Інакш кажучы — ня наш, západнец. Па-беларуску гаворыць. Не па-калгаснаму, а па-шляхецку галянтны. Магілу Станіслава Аўгуста Панятоўскага адшукаў. Ня зьдзівіць, калі неўзабаве прапаганда назаве Мілінкевіча палякам. Праўда, палякаў праваслаўных не бывае. А Мілінкевіч праваслаўны, прычым не атэіст. Дзед ягоны наагул у турме польскай два гады адседзеў за ўдзел у заходнебеларускім руху.

Нават ва Ўкраіне, дзе адрозьненьні Захаду і Ўсходу больш выразныя, справа расейскіх паліттэхнолягаў згуляць «дзяліць, каб уладарыць» не ўдалася. А ў Беларусі за спробы гуляць на расколе могуць і па шапцы даць… Сам Мілінкевіч у гутарцы з украінскай газэтай «Дзеркало тижня» расказаў пра ўласны вопыт з кампаніі Домаша, калі бабулькі з Магілёўскай вобласьці казалі: Домаш заходнік, дык і добра, бо ў іх там парадак і калгасы багатыя.

**«Мілінкевіч нахапаў».** Мілінкевіч мае хоць і ня новую, але машыну, дом у Бершатах. Да таго ж працуе зь нейкімі фондамі. Але прагуляйцеся ў ваколіцах новай Нацыянальнай бібліятэкі, пабачыце такія дамкі — не раўня Мілінкевічавай хатцы. Да таго ж, патэнцыйны Мілінкевічаў выбаршчык і дэманстрант любіць гаспадароў, уласьнікаў і ня любіць тых, хто хоча «усё падзяліць».

**«Мілінкевіч — агент Захаду».** «Усе гэтыя Мілінкевічы жывуць за гранты», — дзяўбе АНТ. І бяда ў тым, што ў лукашэнкаўскім судзе Мілінкевічу справу пра абарону гонару ня выйграць. Затое, між іншым, кантакты з Захадам уяўляюцца грахом якомусь Скобелеву, але не прагматычнаму беларускаму насельніцтву. «Гэтыя хлопцы інвэстыцыі ў краіну прывядуць і прамысловасьць мадэрнізуюць. А ваш Лукашэнка за 12 гадоў ніводнага заводу не збудаваў. Толькі праядае асноўныя фонды», — давялося чуць карэспандэнту «НН» ад інжынэра ў Воршы на адной з сустрэч з чытачамі.

**«Мілінкевіч — нацыяналіст».** «Бээнэфавец». Значыцца, ня любіць Расею ды прымусіць усіх размаўляць па-беларуску. Што да Расеі, дык Мілінкевіч пастаянна паўтарае, што яна — «наш сусед на вякі». І наагул, цяжка сказаць, наколькі глыбока непакоіць беларусаў антырасейскія настроі. Вунь як «Беларусь сегодня» пнецца даказаць, што Лукашэнка — таксама за незалежнасьць і расейцам не саступіць ні ў чым. А Аяцкава дзеля чаго пагналі? Дзеля таго ж нацыяналістычнага электарату.

Што да падручніка «белмовы», дык люмпэн яго сапраўды баіцца як агню. Але то люмпэн. Не на люмпэнаў разьлічаная стратэгія апазыцыі, а на 75% тых, хто на апошнім перапісе вызнаў родную мовай беларускую. А Мілінкевіч засьведчыў свой моўны дэмакратызм. Хоць ягоная душа відавочна ляжыць да беларушчыны. Як і ва ўсяго сярэдняга слою.

**«Мілінкевіч — апазыцыянэр».** То бок няўдаха. Бо апазыцыя толькі і ўмее што мітынгаваць. Аднак цяжка сказаць, якое эмацыйнае адценьне будзе ўкладацца ў слова «апазыцыя» пад выбары. Раней ці пазьней прыход да ўлады новых людзей пачне ўспрымацца народам як жаданая зьмена.

Калі кіравацца лёгкай сацыёляга Андрэя Вардамацкага, рэальную канкурэнцыю Лукашэнку можа скласьці ці Лукашэнка ў квадрацe, ці анты-Лукашэнка. Што да першага, дык у апазыцыі цяпер няма лідэра з больш рэзкай энэргетыкай, чым у прэзыдэнта. Хіба што Пазьняк, але ён за морам. А вось грунтоўны і спакойны Мілінкевіч — найбольшы, чым хто, антыпод Лукашэнкі. Пры гэтым Мілінкевіч не слабак: сваімі сіламі і дом збудаваў, і ва ўладу трапіў, яшчэ й баскетбольны чэмпіён. Так і ўяўляецца рэклямны ролік, дзе ён закладае ў колца трохачковы зь сярэдзіны пляцоўкі.

**«Другі раз жанаты».** Дык сумленна жанаты, а на свайго гляньце… Мілінкевіч абсалютна празрысты, не трымае таямніц: прызнаўся і пра выразаны камень у нырках (а што мы знаем пра здароўе Лукашэнкі?), і пра тое, што жанаты другі раз.

Дык што зробіць зь Мілінкевічам дзяржаўная прапаганда? Зьезд дэмсілаў маглі прадставіць як зламысную сходку ворагаў народу, але вырашылі зрабіць адваротнае — з дапамогай выступу псэўдагеяў кангрэс прэзэнтавалі як блазенства. І калі Мілінкевіча таксама паспрабуюць выставіць несур'ёзным палітыкам, гэта будзе знакам таго, што рэжым успрымае яго ўсур'ёз.

**Алесь Кудрыцкі**

## Лябедзька — ценявы прэм'ер

**Палітрада пры адзіным кандыдаце зацьвердзіла лідэра АГП на пасадзе старшыні Нацыянальнага камітэту.**

У сераду 12 кастрычніка ў Менску прайшло першае паседжаньне Палітычнай рады пры адзіным кандыдаце ад дэмсілаў. На прапанову Алеся Мілінкевіча Палітрада зацьвердзіла кіраўніком штабу Сяргея Калякіна. «Пакуль у штабе, акрамя старшыні, нікога няма. Усё давядзецца рабіць з нуля», — канстатаваў сп.Калякін. У вэртыкаль штабу будуць інтэграваныя актывісты, якія ўдзельнічалі ў папярэдніх палітычных кампаніях. «Ніякіх паралельных структур ня будзе», — папярэдзіў начштабу.

Алесь Мілінкевіч прапанаваў Палітрадзе каaптаваць у свой склад кіраўніка Фонду лякальнага разьвіцьця, экс–дэпутата Вярхоўнага савету СССР Віктара Карняенку — ён будзе адказваць за працу зь недзяржаўнымі арганізацыямі. «Важна, каб ніхто не апынуўся за бортам», — паабяцаў сп.Карняенка. Пра сваё прызначэньне сябрам Палітрады пры адзіным кандыдаце ён даведаўся ад журналістаў. Іх папрасілі пакінуць памяшканьне паседжаньня — абмяркоўвалася далікатная тэма: хто зробіцца старшынём Нацыянальнага камітэту — органу, які будзе выпрацоўваць інтэлектуальную плятформу для адзінага кандыдата.

Да правядзеньня Кангрэсу прагназавалася, што Камітэт узначаліць былы міністар сельскай гаспадаркі Васіль Лявонаў. Але з улікам вынікаў галасаваньня па адзіным кандыдаце, Палітрада палічыла больш апраўданым прызначыць старшынём Нацыянальнага камітэту Анатоля Лябедзьку. В.Лявонаў, хутчэй за ўсё, будзе ўведзены ў склад Палітрады. «Нацыянальны камітэт — ценявы ўрад — будзе выпрацоўваць вобраз новай Беларусі», — заявіў А.Лябедзька. Але калі гэты вобраз набудзе рысы праграмы адзінага кандыдата, пакуль сказаць цяжка.

**АК**

## Саюзны рэфэрэндум разам з выбарамі?

**На думку палітоляга Андрэя Суздальцава, А.Лукашэнка рыхтуецца спалучыць выбары-2006 з рэфэрэндумам пра «канстытуцыйны акт саюзнай дзяржавы».**

Намёкі на гэта А.Суздальцаў пабачыў у прамове А.Лукашэнкі на «Дажынках». Хоць такі варыянт палітызуе беларускае грамадзтва і радыкалізуе моладзь, ён таксама, нібыта, гарантуе прызнаньне вынікаў Расеяй. Аргумэнтацыя спрэчная: а то яны без рэфэрэндуму не прызнаюць.

## Пазьняк ідзе на выбары

**Зянон Пазьняк мае цьвёрды намер балятавацца ў прэзыдэнты.**

Як паведаміў прэс–сакратар КХП–БНФ Валер Буйвал, «у краіне досыць патрыётаў для перамогі таго, хто іх аб'яднае».

Сабраць 100 тысяч подпісаў Зянону будзе цяжка. У льготных умовах 2001–га кансэрватары сабралі свайму лідэру толькі 76 тысяч. Цяпер жа і шэрагі партыі звузіліся, і кампанія будзе праходзіць у суворых умовах. Калі б Зянону хто падсабіў рэсурсамі, кампанія–2006 ажывілася б на карысьць Мілінкевіча. Але пакуль няма прыкметаў, што нехта ў гэты бок думае.

## Будзе створаны трыбунал

**Палітрада падтрымала стварэньне Незалежнага міжнароднага грамадзкага трыбуналу, які будзе расьследаваць злачынствы рэжыму.**

Стварэньнем суду займаецца ўдава Генадзя Карпенкі — Людміла Карпенка.

**Мікола Бугай**

## АНОНС

## А.Манаеў: Рэйтынг Мілінкевіча будзе расьці на 10% у месяц

Кіраўнік зачыненага НІСЭПД прагназуе, што пад зіму рэйтынг А.Мілінкевіча дасягне 20—25%. Гутарку з сацыёлягам чытайце ў наступным нумары «НН».

# «Я проста хачу ўратаваць Беларусь»

«НН» аналізуе першыя інтэрвію адзінага кандыдата.

Перамога Алеся Мілінкевіча на Кангрэсе дэмсіл атрымала вялікі рэзананс у прэсе — як беларускай, так і замежнай. Выявілася, што Мілінкевіч не занадта шматслоўны, але і не маўчун. Ніколі не гаворыць пра сябе ў трэцяй асобе, затое займеньнік «я» выкарыстоўвае актыўна. Як і займеньнік «мы».

### Мілінкевічавы прызнаньні

У Мілінкевічу ўражвае шчырасьць. Пра апэрацыю на нырках прызнаўся карэспандэнту найбольшай у Польшчы «Газэты выборчай», дадаўшы, што, паводле ягоных зьвестак, пэўныя структуры ўжо падшукваюць атруту пад чалавека, хворага на ныркі. Ня робіць таямніцы зь сямейных праблем. «Я жанаты другі раз, але не хачу апраўдвацца», — сказаў ён у інтэрвію «Камсамолцы».

Шчыры Мілінкевіч і з самім сабой: «Цалкам відавочна, што сёньня мы ня можам прыйсьці да людзей з сацыяльна-эканамічнымі прапановамі, бо ў нас у гэтым пляне ўсё-такі адносна спакойна», — прызнаецца Мілінкевіч уплывовай украінскай газэце «Дзеркало тижня». «Ва Украіне людзі выйшлі на вуліцы не па сала ды гарэлку, а таму, што іх прынізілі», — кажа Мілінкевіч у інтэрвію чэскаму выданьню нумар адзін «Лідовэ навіны».

### Пра сваю Цімашэнку

Калі «Народная воля» параўнала Мілінкевіча з Гаўлам, адзіны кандыдат сьціпла сказаў журналісту «Лідовых навінаў»: «Не заслужыў такога параўнаньня. Гэта сусьветны палітык, а я сябе такім не лічу. З Гаўлам мяне параўналі таму, што я ня тып рэвалюцыянэра, а хутчэй падобны да спакойнага інтэлектуала». На іншым канцы лягічнага ланужка хаваецца сюрпрыз: «Але нешта ад Юшчанкі запазычыў — буду мець сваю Юлію Цімашэнку. Спадарыню Ірыну Красоўскую. Яна прыгожая, разумная і тэмпэрамэнтная».

Мілінкевіч усяляк падкрэсьлівае тое, што ня хворы на ўладу, — і нават прызнае, што ў нечым гэта ягоная хіба: «Я прапанаваў Лябедзьку і Калякіну самыя высокія пасады, на якія яны прэтэндуюць, таму што відавочна: амбіцыі ў палітыкаў ёсьць… Можа, у мяне гэтых амбіцый трошкі менш — трэба будзе вырошчваць» («Дзеркало тижня»).

### Няпэўнасьць ці хітрасьць?

Мілінкевічава шчырасьць нярэдка ўспрымаецца як няўпэўненасьць. Ён любіць выкарыстоўваць выразы накшталт «мне здаецца», «даволі», «можа», «мабыць», з прычыны чаго ўсё, што гаворыць «адзіны», набывае некатэгарычнасьць. Цьвёрдае Мілінкевічава «Так!» у адказ на пытаньне «Ці пераможаце вы?» («НН») — гэта, хутчэй, выключэньне, чым правіла. «Страху няма, але ёсьць трывога — спраўлюся ці не», — прызнаецца Мілінкевіч «БДГ». «Я не такі добры эканаміст, каб гаварыць пра тонкасьці эканамічных узаемаадносінаў з Расеяй, — кажа Мілінкевіч у інтэрвію «Дзеркалу тижня» і дадае: — Я ж зусім недасьведчаны палітык». Так і хочацца спытаць: дык чаго ж тады вас выбралі, спадар Мілінкевіч?

Відаць, Мілінкевіч заўважае, што сам сябе ставіць у слабую пазыцыю. Таму ў тым самым інтэрвію «Дзеркалу тижня» адзіны кандыдат папраўляецца і кажа, што «ў палітыцы я нібыта сьвежы чалавек». У апошнім інтэрвію «БДГ» Мілінкевіч таксама мяняе акцэнты: «Мая невядомасьць згуляе на руку ўсёй апазыцыі, на якой, як гэта ні цяжка прызнаваць, даўно ляжыць пячатка заўсёдных няўдач».

А вось ці не хаваецца пад маскай добрага дзядзі Мілінкевіч — дыктатар? «У штабе адзінага «дэмакратыяй і пахнуць не павінна — тады ідзе праца», — гаворыць ён у інтэрвію «Белорусам и рынку». «Я за тое, каб выбарчы штаб адзінага кандыдата меў абсалютна дыктатарскія паўнамоцтвы» (інтэрвію «НН»). Ціхая сьвіньня глыбака рые, — як казала мая бабуля.

### Пра рэжым

Мілінкевіч тонка прыкмячае слабыя месцы рэжыму, якія ўжо сапраўды даліся ў знакі нават прыхільнікам Лукашэнкі — ад міністраў да простых калгасьнікаў: «Нават у вёсцы ненавідзяць уладу за тое, што яна хамская», — кажа ён карэспандэнту «Дзеркала тижня». «Ніколі брыгадзіры, дробнае начальства так не хамілі. Гэта паўсюдна, як эпідэмія» («Белорусы и рынок»).

«Яе немагчыма выхаваць», — гаворыць Мілінкевіч пра беларускую ўладу расейскай службе радыё «Свабода». «Лукашенка і яго рэжым не падлягаюць рэфармацыі, як не падлягала рэформам камуністычная ўлада» («Дзеркало тижня»).

Сцэнар перамогі ў Мілінкевіча адзіны: «Надзей на тое, што ў выпадку нашай перамогі ўлады абвесьцяць рэальныя вынікі выбараў, няма ніякіх. Дыктатура ніколі не прызнае паразу. Бяз вулічных, але выключна мірных акцый не абысьцыся» («Известия»).

Што да лёсу цяперашняга прэзыдэнта, дык у інтэрвію замежным мас-мэдыя Мілінкевіч выказваецца найбольш рэзка: «Што да Лукашэнкі, дык я не зьбіраюся далучацца да гульні, якую прапануюць некаторыя, — надаць яму гарантыі бясьпекі, калі добраахвотна сыдзе. Як я магу забыць на зьніклых? Толькі суд можа вырашыць, вінаваты Лукашэнка ці не» («Лідовэ навіны»).

Мілінкевіч лічыць, што гвалт у выніку сыграе супраць самога рэжыму: «Зьнішчэньне — фізычнае ці нейкае іншае — адзінага кандыдата можа ў выніку зрабіцца адным з самых магутных мабілізацыйных фактараў» («Дзеркало тижня»). І Мілінкевіч гаворыць пра самаахвярнасьць: «Проста надыходзіць такі момант, калі клопат пра радзіму, клопат пра будучыню дзяцей робіцца больш важным, чым захаваньне жыцьця» (інтэрвію расейскай службе радыё «Свабода»).

### Алюзіі і рэмінісцэнцыі

Як выяўляецца, дзьве супрацьлеглясьці — Мілінкевіч і Лукашэнка — маюць досыць шмат падабенстваў. «Тое добрае, што было пры Лукашэнку, калі ён сыдзе — паводле закону ён даўно павінен сысьці з улады, — будзе захаванае», — абяцае Мілінкевіч у інтэрвію расейскай службе радыё «Свабода». Эканамічныя задумы Мілінкевіча не ўражваюць навізной: «Патрэбная прыватызацыя малых і сярэдніх прадпрыемстваў. Кантрольны пакет буйных прадпрыемстваў трэба пакінуць за дзяржавай, за Беларусьсю» («Белорусы и рынок»).

Мілінкевіч нават выкарыстоўвае тэрміналёгію Лукашэнкі: «Канстытуцыя прадугледжвае нэўтралітэт Беларусі, і нам трэба яго захаваць. Гэта не выключае магчымасьці шматвэктарнага супрацоўніцтва» («Белорусы и рынок»). У штабе адзінага павінна быць «вэртыкальная структура з выканаўчай дысцыплінай» («НН»). Канцэпцыя стварэньня «ідэйнай вэртыкалі» ў адказ на ўладную вэртыкаль Лукашэнкі была агучана Мілінкевічам падчас выступу на кангрэсе.

І хоць Мілінкевіч перакананы, што адзінай дзяржаўнай мовай у Беларусі павінна быць беларуская, ягоная фраза «Чалавек з расейскай мовай не павінен адчуваць сябе горш, чым чалавек, які валодае беларускай» («НН») гучыць амаль рэфрэнам да Лукашэнкавай «Расейскі чалавек у Беларусі павінен адчуваць сябе лепш, чым у Расеі».

«Расея для Беларусі — найважнейшы стратэгічны партнэр і найбліжэйшы саюзьнік», — кажа Мілінкевіч карэспандэнту газэты «Известия». І адразу робіць заўвагу пра тое, што Беларусь павінна застацца сувэрэннай. Але тое самае апошнім часам сьцьвярджае і Лукашэнка. Сьвежы прыклад — рэдакцыйны артыкул «Беларуси сегодня» за 11 кастрычніка, дзе жорстка крытыкуюцца расейскія палітыкі, якія «менш за ўсё цікавяцца думкай наконт імгненнага ўваходжаньня Беларусі ў склад Расеі самога беларускага народу». Пытаньне — ці гэта Мілінкевіч пераймае Лукашэнкаву зброю, ці Лукашэнка змагаецца за незалежніцкі электарат? Так ці інакш, выглядае, што выбары-2006 будуць барацьбой двух праектаў разьвіцьця незалежнай Беларусі.

### Мэтафары ад Мілінкевіча

За час «кандыдацтва» Мілінкевіча назьбіраўся ўжо ладны сьпіс яго фірменных выслоўяў. «Я найлепшы зьбіральнік маленькіх дэмакратычных беларускіх земляў», — з гонарам кажа ён у інтэрвію «Комсомольской правде». «Для мяне Беларусь — гэта сьвятое», — выказваецца Мілінкевіч у інтэрвію «Белорусам и рынку». «Над беларусамі ніколі не заходзіць сонца», — гэта пра раскіданую па ўсім сьвеце беларускую дыяспару ў адказах на форуме радыё «Свабода». «Беларусь у небясьпецы!» — папярэджвае ён чытачоў чэскай газэты «Лідовэ навіны». «Мы абудзім Беларусь!» — абяцае адзіны кандыдат у інтэрвію «Газэце выборчай». «Будзе барацьба не на жыцьцё, а на сьмерць», — сказаў Мілінкевіч у інтэрвію «НН» перад выбарамі адзінага. «Будзе вайна, сур'ёзная вайна», — з такімі словамі ён зьвярнуўся да дэлегатаў Кангрэсу. І пераможцы вайны ня вызначаны: «Калі мы прайграем, прама кажу — будзе "палярная ноч" («Дзеркало тижня»).

Мілінкевіч усяляк падкрэсьлівае, што ўлада для яго — ня мэта, а цяжкі абавязак: «Калі б у нашай краіне была цывілізаваная ўлада і краіна была б дэмакратычная, я ня быў бы ў палітыцы. Я выкладчык» (інтэрвію расейскай службе радыё «Свабода»). Але для Мілінкевіча «пачуцьцё адказнасьці перакрывае ўсё астатняе» («БДГ»). «Я проста хачу ўратаваць краіну» («Комсомольская правда»). Каб жа ўсё было так проста, спадар кандыдат…

**Алесь Кудрыцкі**

# «Кандыдат большасьці»

**Мілінкевіч не зьвязаны па руках партыйнымі стратэгіямі, яго штаб павінен і вымушаны абапірацца на ўласную «стратэгію перамогі», даводзіць рэдакцыйны артыкул інтэрнэт-парталу «Наша думка» пад загалоўкам «Кандыдат большасьці».**

На думку камэнтатара, які хаваецца пад псэўданімам Янаў Палескі, з выбраньнем Алеся Мілінкевіча апазыцыя знайшла свой твар. Палітычная апатыя зусім не зьяўляецца адметнай рысай беларускага народу — гэта вынік дэфіцыту палітычных навін. Але вось зьявіўся Мілінкевіч — і людзі пачалі размаўляць. Загадка Мілінкевіча — гэта загадка чэмпіёна: як ён дамогся выніку — невядома і неістотна, бо перамога ёсьць перамога.

Аўтар дапускае, што пашырэньне складу дэлегатаў кангрэсу было зьдзейсьнена для таго, каб Мілінкевіч, які выйграваў у рэгіёнах, праваліўся ў сталіцы. У выніку ён усё адно перамог, прытым на «шырокай прадстаўнічай базе», што дае яму права быць не «альтэрнатыўным кандыдатам», а «кандыдатам надзеі».

Сацыялягічныя апытаньні, паводле якіх падтрымка Лукашэнкі вагаецца на ўзроўні 40%, няслушна інтэрпрэтуюцца. Гэтая лічба паказвае толькі тое, што «большасьць лічыць, што большасьць падтрымлівае Лукашэнку», — мяркуе аналітык. Людзі не аддаюць перавагі Лукашэнку — яны проста не жадаюць залічваць сябе да апазыцыйнай рэзэрвацыі. «Большасьць зьяўляецца спэцыялістам толькі ў адным пытаньні: як не застацца ў меншасьці», — сьцвярджае Янаў Палескі.

Для таго каб быць кандыдатам большасьці, Мілінкевічу трэба «загадкавым чынам зьмяшчаць у сабе «большасьць», у дачыненьні да якой інтарэсы партый і груп улічваюцца «праз коску». Як кандыдат большасьці, Мілінкевіч больш ня зьвязаны па руках партыйнымі стратэгіямі, яго штаб павінен і вымушаны абапірацца на сваю ўласную «стратэгію перамогі».

Аўтар не адмаўляе стабільнасьці беларускага грамадзтва. Так, у вас усё стабільна — значыцца, лепей жыць ня будзеце, так ён яе расшыфроўвае. Як гібелі ў вёсцы, так і будзеце загінацца, як не маглі зарабіць на кватэру, так і не заробіце, як змагаўся Лукашэнка з карупцыяй 12 год, так і будзе змагацца і г.д. «Цяжка знайсьці чалавека, які не зацікавіцца сацыяльнай палітыкай дзяржавы, калі яму паказаць, якім чынам гэтая палітыка закранае непасрэдна яго і якім чынам можна дамагчыся яе паляпшэньня», — піша Янаў Палескі. Людзі, нават калі ім жывецца добра, заўсёды жадаюць жыць яшчэ лепш. Натуральна, ёсьць і такія, якія гэтага не жадаюць, але яны — у меншасьці. «Мы ж вядзём гаворку пра большасьць. І пра яе кандыдата», — падсумоўвае аналітык.

**АК**



Основана в августе 1927 года

Советская Белоруссия

СБ беларусь сегодня

№ 189 (22346) www.sb.by Пятница, 30.09.2005.

# Арифметика урожая

7 миллионов 25 тысяч тонн. Столько зерна по предварительным подсчетам собрано в этом году

Узнай новость!

**Помощь пожилым**

1 октября в Могилеве в День пожилых людей, пенсионеры, имеющие при себе пенсионное удостоверение, смогут ездить бесплатно в городских автобусах и троллейбусах. По решению горисполкома пожилые люди также смогут свободно посетить музеи, а билеты в кино в этот день для них будут дешевле — за один нужно будет заплатить 1 тысячу рублей вместо обычных 4 — 6 тысяч. Кроме того, пять городских парикмахерских готовы в субботу стричь виновников торжества, не взяв с них ни копейки.

Собеседник

Стр. 9 — 17

**Минздрав выдал лицензии**

На основании решения коллегии Минздрава медцентрам «Экомедсервис» и «Нордин» выданы лицензии на право осуществления медицинской деятельности. А вот у государственного учреждения «Республиканский научно-технический центр «Экомар» НАН лицензия аннулирована — за нарушения правил лицензирования медицинской деятельности.

**Тревожное ожидание Лондона**

Полиция ожидает здесь новых терактов, сообщил вчера газете «Гардиан» глава подразделения антитеррористических операций Скотланд-Ярда Эндрю Хейман. По его словам, Скотланд-Ярд выявил ряд подозрительных лиц, не связанных с лондонскими терактами, но, возможно, готовящих новые атаки.

**Закон остался без поправок**

Парламент Латвии вчера отклонил поправки к закону, предусматривающие предоставление гражданства всем «негражданам», в основном русскоязычным жителям страны. Объединение «За права человека в единой Латвии» (ЗаПЧЕЛ), инициировавшее изменения, уже обвинило депутатов сейма в национализме и нежелании строить демократическое общество.

**Космическая программа поменяет приоритеты?**

Глава американского аэрокосмического агентства НАСА Майкл Гриффин заявил, что разработка шаттлов и Международной космической станции (МКС) — ошибка. В 2018 году НАСА планирует вновь послать астронавтов на Луну.



**1,005, 1,000, 7,025... Рэкорды, шытыя белымі ніткамі.**

# Намалот языком

**Працяг са старонкі 1.**

Кантралёры зь ведамства Тозіка выявілі, што Акцябрскі раённы камітэт сельскай гаспадаркі і харчаваньня адрапартаваў, што пры канцы жніўня на прысядзібных участках скошана 15 гектараў пасеваў і намалочана 257 тон збожжа. Выходзіць, што сярэдняя ўраджайнасьць перавысіла 171 цэнтнэр з гектара, а такога няма ні ў адной краіне сьвету. Аказваецца, тоны прыбавілі, на гектары — «забыліся». Тое ж і на Жыткавіччыне, дзе, паводле зьвестак райсельгасхарчу, на прысядзібных участках сабралі ажно 797 ц/га.

Прыпіскі дзяржкантралёры выявілі ў Калінкавіцкім, Рэчыцкім, Гомельскім, Буда-Кашалёўскім раёнах. Паводле іхнай інфармацыі, скажэньне апэратыўных зьвестак адбывалася на ўсіх узроўнях — ад калгасаў да аблсельгасхарчу.

Афіцыйная прапаганда даводзіць, што ўраджай атрыманы выдатны. А.Лукашэнка нават заявіў, што «мы стварылі новую сельскую гаспадарку». Статыстыка пярэчыць: на паказчыкі мінулага году вяскоўцы ня выйшлі. Намалот збожжавых коласавых культур скараціўся на 8%, зернебабовых — на 10%, прызнавала БелТА 4 кастрычніка. Ураджайнасьць упала з 33,4 да 31,9 ц/га. Менш сабралі жыта, ячменю, аўсу, трыцікале. Толькі пшаніцы трохі больш, чым летась.

Да таго ж, сёлета Беларусь напаткаў неўраджай бульбы, яе накапана 566 тыс. т (летась — 900 тыс. т). Найбольшае зьніжэньне ўраджаю зафіксавана на Меншчыне й Берасьцейшчыне (на 49% і 44% адпаведна). Паменела і агульная ўраджайнасьць: 150 цэнтнэраў з гектара супраць 192 ц/га летась.

Але на «Дажынках-2005» пра гэта не сьпявалі. На ўпрыгожваньне Слуцку было выдаткавана 122 млрд. Бюджэт наступных «Дажынак» у Бабруйску складзе аж 150 млрд.

## ПРА ТОЕ САМАЕ

### Конь у супрацьгазе

Як сьвяткавалі «Дажынкі» ў сталінскі час? Кадры кінахронікі 1945 г. даносяць да нас НКВДыстаў у вянках і вусатых правадыроў на жытнёвым полі.

«Дажынкі» не шанаваліся як самастойнае сьвята. «Апошні сноп» жалі на «сацыялістычным спаборніцтве» і для «ўдарных намалотаў». Так, у агітацыйнай стужцы «Чырвоны дазор» 1937 г. сялянкі ў адгазьнік зьбіраюць жыта, конь у адгазьніку вязе снапы.

Чаму ўсходні таталітарызм так любіў вясковыя сцэнкі? Мусаліні толькі раз засьвяціўся на малацільні, а вось Сталін у жытнёвым полі — карцінка кананічная. Ці не таму, што ён арганізаваў галадамор 1933–га?

На сёлетніх Дажынках сучасны Бацька доўга гаварыў пра народ, пра простага чалавека й повязь зь ім. Народ таксама меўся. На вялікай адлегласьці, у глыбіні кадру, адціснуты на далёкую пэрыфэрыю ахоўнікамі. Кранальных кадраў еднасьці правадыра й народу не знайшлося. Здымаць ня ўмеюць!

**Андрэй Расінскі**

# Антыалькагольная праграма ўраду

Улады спадзяюцца зьнізіць спажываньне алькаголю на чалавека з 9,5 да 7,8 л у год. Піша **Зьміцер Дрыгайла**.

На пачатак году ліцэнзіі на вытворчасьць алькаголю ў краіне мелі 127 прадпрыемстваў. Павышэньне іх аб'ёмаў продажу за апошнія гады выклікала рост выпадкаў алькагалізму. З 1990 г. алькаголікаў-мужчынаў стала больш утрая, жанчын — у чатыры разы.

Каб абмежаваць выпуск сьпіртнога, урад зацьвердзіў праграму разьвіцьця алькагольнай прамысловасьці на 2006—2010 г. Яна прадугледжвае скарачэньне ліцэнзіяў на вытворчасьць алькаголю й зьмену структуры вытворчасьці на карысьць «якасных і натуральных напіткаў». Маюцца на ўвазе гарэлка і разьлітыя ў Беларусі вінаградныя віны, якія ніхто ў сьвеце не лічыў бы натуральнымі, ні тым больш якаснымі.

Выпуск гарэлкі й лікёра-гарэлачных вырабаў летась склаў 7,4 млн дэкалітраў (у 2000 г. было ўдвая меней). Да 2010 г. колькасьць вытворцаў будзе скарочана на трациіну. Некаторыя прадпрыемствы перапрафілююць. Гарадзенскі і клімавіцкі заводы будуць выпускаць пакетаваныя сокі, гомельскі — квас.

Адначасова плянуецца забясьпечыць рост экспарту, які хочуць павысіць у 9 разоў у параўнаньні з узроўнем 2005 г. Дзеля гэтага мяркуецца мадэрнізаваць найлепшыя лікёра-гарэлачныя заводы — «Менск-Крышталь», гомельскі, берасьцейскі й віцебскі.

Закрануць зьмены і вытворчасьць пладовых вінаў. Летась іх было выпушчана 26,4 млн дэкалітраў, у чатыры разы болей, чым у 2000 г. (6,6 млн.) Цяпер жа вытворчасьць пладовых вінаў хочуць скарачаць на карысьць вінаградных вінаў і каньяку зь імпартных вінаматэрыялаў.

З 2008 г. пладовыя віны будуць выраб ляць толькі з айчыннай сыравіны. На васямнаццаці заводах выраб «Крыжачкоў» будзе спынены, што скароціць вытворчасьць на 2,5 млн дэкалітраў. Затое павялічыцца колькасьць прадпрыемстваў — вытворцаў вінграднага віна, з 31-га да 37-мі.

Лічба вытворцаў каньяку павялічыцца з шасьці да васьмі. Новыя каньячныя лініі будуць створаны ў Берасьці й Гомелі.

Паводле дэкрэту прэзыдэнта, які набудзе сілу 13 сьнежня, колькасьць вытворцаў і гандлёвых суб'ектаў на алькагольным рынку скароціцца — дэкрэт забараняе весьці бізнэс індывідуальным прадпрымальнікам ды ўсталёўвае жорсткія ўмовы для аптавікоў. Застанецца менш за 10% кампаніяў. У адпаведнасьці з дэкрэтам для атрыманьня ліцэнзіі на аптовы гандаль алькаголем прадпрыемства мусіць мець статутны фонд ня менш за 100 тыс. эўра, склады плошчай больш за 1 тыс. м² і займацца аптовым гандлем ня менш за пяць гадоў.

Мэта ўсіх новаўвядзеньняў — зьмяншэньне колькасьці спажываньня чыстага алькаголю на аднаго чалавека ў год — з 9,5 л у 2004-м да 7,8 л у 2010-м. Пакуль Беларусь б'е ўсе адмоўныя рэкорды. Летась аб'ём продажу алькагольных напояў у пераліку на чысты сьпірт склаў 9,5 л, што на паўтара літра перавышае максымальны ўзровень, вызначаны Сусьветнай арганізацыяй аховы здароўя.

# Сухая восень

Гэтая восень радуе моднікаў, але цьвеліць аграномаў ды грыбнікоў. Дажджоў у некаторых раёнах не было зь лета. Мэтэаролягі дыягнастуюць глебавую сушу. За верасень на Меншчыне, Гомельшчыне і большай частцы Берасьцейшчыны выпала толькі 5 мм ападкаў — пры норме 50. Найгоршае становішча на пясках і пагорках — там гінуць ня толькі азімыя, але й рапс. Калі суша пратрымаецца да халадоў, а менавіта гэта й абяцаюць мэтэаролягі, паўкраіны напросту не пабачыць руні, і палі прыйдзецца перасяваць.

**Сямён Печанко**

## ГАСПАДАРКА СЬЦІСЛА

### Вайна беспрацоўным

Падрыхтаваныя ў Закон аб занятасьці насельніцтва зьмены ўвядуць больш жорсткія патрабаваньні для атрымальніка статусу беспрацоўнага. Калі беспрацоўнага накіруе на прафэсійную перападрыхтоўку аддзел занятасьці, такія людзі будуць лічыцца працоўнымі.

### Удар па аўтаперагоншчыках

У кожнай вобласьці будзе створаны мытны склад для гандлю замежнымі аўтамабілямі пад кантролем Дзяржаўнага мытнага камітэту й МУС. Такое даручэньне дадзена Лукашэнкам ураду. Дагэтуль фізычныя асобы падпарадкаваліся менш, чым фірмы. З 1 лістапада мытны склад на «Ждановічах» стане папаўняцца легкавікамі.

### Беларускі Winston

У сьнежні ў продажы зьявяцца цыгарэты Winston, вырабленыя ў Беларусі. Міжнародная кампанія JTI перадала ліцэнзійныя правы на вытворчасьць гэтай маркі менскаму ТАА «Тытуньінвэст». Беларусь стане першай крайінай, дзе цыгарэты Winston будзе рабіць не рэгіянальнае прадстаўніцтва JTI, а іншы вытворца. Зь лютага «Тытуньінвэст» выпрабляе таксама цыгарэты Magna і Monte Carlo.

### Чарговае «павышэньне»

З 1 кастрычніка павышана тарыфная стаўка першага разраду з 51 тыс. да 58 тыс. руб. Базавая велічыня павышана з 25,5 тыс. да 29 тыс. руб. Перад гэтым тарыфная стаўка павышалася 1 красавіка.

## КУРСЫ ВАЛЮТ

**на 13 кастрычніка**

1 амэрыканскі даляр — 2 151 рубель
1 эўра — 2 577,65 рубля
1 ангельскі фунт — 3750,81
1 швайцарскі франк — 1664,54
1 латвійскі лат — 3 700,01
1 літоўскі літ — 746,50
1 польскі злоты — 665,04
1 расейскі рубель — 75,14
1 украінская грыўна — 429,02

**Паводле Нацбанку**

ЛІСТЫ ЗЬ ЛЕСУ

## Адраджэньне Алешчы



ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

Алешча — першая беларуская станцыя на чыгунцы Невель—Полацак. Вакол станцыі — колькі дзясяткаў хатаў. Ані назваў вуліц, ані нумароў на хатах. Міліцыянты, якія прыяжджаюць разьбірацца з чарговым здарэньнем на лесапагрузцы, так і запісваюць сьведку: «Жыве ў трэцім доме ад крамы».

Здарэньняў хапае. За апошні тыдзень спалены тартак, узламана і абрабавана сталоўка, тры траўмы на вытворчасьці. Рэакцыя майстроў, міліцыі ды паспалітага люду аднолькавая: «Спалілі нападпітку», «Напіліся — залезьлі».

Тут толькі два кірункі жыцьця, вызначаныя каляінай чыгункі: з Расеі дызэль возіць тэхнічны сьпірт, у бок Полацку адгружаюць лес і зьяжджаюць людзі. Большасьць алешчынцаў працуюць тут жа, на станцыі. Тут жа бадзяюцца дзеці, козы абдзіраюць кару са штабэляваных круглякоў. У цяньку адлежваюцца пераможаныя зялёным зьмеем.

— Трэба нешта рабіць, — зьвяртаецца да мяне кабета, чый дом стаіць ля самай транспартэрнай стужкі. — Я нават не магу сюды прывезьці ўнука — сап’еццa! Тут усё гэтым заканчваецца. Прападае Алешча!

Жыхарку мясцовыя завуць Багамолкай. Яна зьбірае подпісы, каб пабудаваць у Алешчы царкву. Сельсавет, лесапунктаўскае начальства й бацюшкі з Полацку «ня супраць». Размаўляю наконт гэтага з рабочымі падчас перакуру. Тыя слухаюць напаўвуха, як занудлівую мараль. Адзін не вытрымлівае:

— Ну дык і ўзначальвай Партыю адраджэньня Алешчы.

Партыя — гэта Багамолка, сям’я майстра, разьметчыца Мая ды некалькі жыхароў, што голасна наракаюць на тутэйшы павальны алькагалізм. Супрацоўнікі называюць іх «язьвеньнікі-трэзьвеньнікі». Астатні народ — пасярэдзіне але пасьля заробку сама менш на тыдзень змыкаецца са «сьпіртавозамі» і ўтварае агрэсіўную большасьць.

Алешча вымірае. Як спыніць дэградацыю беларускай вёскі на стыку з буйной індустрыяй? Плян Лукашэнкі называецца «аграгарадкі». Пабудуем замест сельпо ўнівэрсам, замест лазьні — басэйн ды цырульню, і тады зажывяце!

Не зажывуць. Ня зьменіць гэта. Тут душы ратаваць трэба. Пачынаць варта са спрыяньня хрысьціянскім суполкам. У кожнай вёсцы — ільготы царкве, касьцёлу, малітоўнаму дому. Толькі Богу пад сілуператварыць амярцьвелыя, засьпіртаваныя паселішчы ў здаровую беларускую вёску, дзе не ўпіваюцца, ня крадуць, шануюць працу.

Другое — прыватная ўласнасьць ды прадпрымальніцтва. Яшчэ савецкага часу груваcткія вытворчасьці, што ледзь ліпяць дзякуючы дзяржманаполіі, так і просяцца ў гаспадарскія рукі. Дробны гандаль, лясное зьбіральніцтва, агратурызм, нават паляваньне ў Эўропе ўжо даўно пастаўлены на шырокую камэрцыйную аснову і кормяць цэлыя краі й дзяржаўныя бюджэты. Інакш у які басэйн пойдзе алешчынскі штабялёўшчык, што атрымлівае за месяц 150 тысяч «брудным»?

Нарэшце, трэцяе — мясцовая ўлада. Маласіценскі сельсавет нічога не вырашае і ні пра што ня дбае ва ўласнай вёсцы — куды ўжо суседняй Алешчы. Галоўнай уладай з уласным бюджэтам, правам распараджацца дзяржаўнай зямлёй ды ліцэнзіямі, з абавязкам падтрымліваць чысьціню ды парадак у навакольлі тут мусіць быць павет на чале з войтам, а ня «Полацаклес» ды абласныя рэвізоры наездамі раз на год.

Каб адрадзіць Алешчу, у 2006-м абавязкова трэба перамагаць.

*Малое Сітна*

# Сасіма, як Багрыма, здаюць у салдаты



Юлія Дарашкевіч

**Актывіста незарэгістраванай арганізацыі «Зубр» Мікіту Сасіма затрымалі ўвечары 7 кастрычніка за распаўсюд улётак з заклікам удзельнічаць у Дні салідарнасьці ды адвезьлі ў спэцпрыёмнік-разьмеркавальнік на Акрэсьціна. 10 кастрычніка ён быў дэ-юрэ асуджаны на трое сутак арышту «за нецэнзурныя выразы ў грамадзкім месцы». Аднак міліцыянты — сьведкі абвінавачаньня — гэтага не пацьвердзілі. Пасьля вызваленьня 10 кастрычніка Сасіма зноў затрымалі, адвезьлі ў Баранавіцкі райваенкамат, дзе ўручылі пазоў у войска.**

## СЬЦІСЛА

**2000 даляраў штрафу за набажэнства**

Адміністратара пратэстанцкай царквы «Новае жыцьцё» **Васіля Юрэвіча** 7 кастрычніка суд Маскоўскага раёну Менску пакараў штрафам у 150 базавых велічынь (3 млн 825 тыс.) за правядзеньне набажэнства. Агулам Юрэвічу ўжо прысудзілі каля 6000 даляраў (у эквіваленце) штрафу.

**Цісьнуць на прафсаюзы**

Супрацоўнікі юрыдычнага аддзелу Гарадзенскага гарвыканкаму 4 кастрычніка правяралі дзейнасьць базавых арганізацыяў **Беларускага незалежнага прафсаюзу** на ААТ «Горадня-Азот». Для праверкі дакумэнтаў прафсаюзу гарвыканкамаўскія чыноўнікі зьвярнуліся да намесьніка дырэктара па ідэалягічнай працы.

Сяброў **прафсаюзу РЭП** з РУП «Канструктарскае бюро дакладнага электроннага машынабудаваньня оптыка-мэханічнага абсталяваньня» 10 кастрычніка апытвалі ў пракуратуры Ленінскага раёну Менску па 40 хвілін кожнага. Адміністрацыя прадпрыемства ў чэрвені адклікала юрыдычны адрас суполкі, матывуючы гэта малой колькасьцю чальцоў. Пасьля скаргі ў гарадзкую пракуратуру рашэньне было адменена. Раённая пракуратура праводзіла гэткім чынам яшчэ адну праверку колькасьці чальцоў суполкі.

Старшыню прафсаюзу РЭП **Генадзя Фядыніча** выклікалі 10 кастрычніка ў пракуратуру, дзе ён даваў тлумачэньні наконт інфармацыі ў прафсаюзным бюлетэні «Экспресс-инфо» №22 за 8 жніўня. Паводле БАЖ, супрацоўніца пракуратуры Сьвятлана Ганчарова сумнявалася, што трэба распаўсюджваць нэгатыўную інфармацыю пра сацыяльна-эканамічную сытуацыю ў краіне.

**У Ганцавічах**

Недзяржаўнай газэце **«Ганцавіцкі час»** 6 кастрычніка раённы вузел электрасувязі адмовіў у разьмяшчэньні на мясцовым радыё рэклямнай абвесткі пра падпіску.

**Скаргу Букаса не задаволілі**

Намесьнік пракурора Менскай вобласьці ў лісьце ад 29 верасьня не задаволіў скаргу галоўнага рэдактара газэты «Борисовские новости» **Анатоля Букаса** на папярэджаньне, вынесенае яму пракурорам Барысава. Пракуратура ўпэўненая, што журналіст ня мае права ня толькі публікаваць матэрыялы справы, яшчэ не завершанай судом, але й сваё меркаваньне пра яе.

**У Белаазёрску**

6 кастрычніка на кватэру да актывісткі БСДП («Грамада»), дэпутаткі Белаазёрскага гарсавету **Натальлі Акаронкі** зьявіліся судовыя выканаўцы: Берасьцейскі раённы суд завочна прысудзіў яе да штрафу ў мільён руб. Аднак абласны суд адмяніў гэтае рашэньне, бо Акаронка не магла быць у судзе з паважнай прычыны. Але судовыя выканаўцы ўсё ж прыйшлі апісваць маёмасьць.

**Затрыманьні ў Віцебску. Сканфіскаваны «ARCHE»**

У Віцебску 6 кастрычніка падчас распаўсюджваньня дэмакратычнае прэсы затрыманы актывісты КХП—БНФ **Аляксандар Салаўян** і **Ўладзімер Плешчанка**, а таксама беспартыйны **Барыс Хамайда**. У той самы дзень у Хамайды апісалі маёмасьць за нясплачаныя штрафы. 7 кастрычніка міліцыянты канфіскавалі ў яго ўсе асобнікі «БДГ. Деловой газеты», мясцовай газэты «Выбар» і часопісу «ARCHE» для экспэртызы.

**Справа Скрабца ў судзе**

Справу палітвязьня **Сяргея Скрабца** 7 кастрычніка перадалі ў Вярхоўны суд.

**Затрыманьні за «Народную волю»**

У Горадні 7 кастрычніка міліцыянты затрымалі прафсаюзнага актывіста **Івана Романа**, які раздаваў рабочым Заводу аўтаагрэгатаў «Народную волю». У аддзяленьні на яго склалі пратакол.

**Леванеўскі зьвяртаецца ў суд**

Палітвязень **Валер Леванеўскі** 7 кастрычніка зьвярнуўся ў Канстытуцыйны суд з просьбай выправіць сытуацыю, якая склалася са скаргамі вязьняў: ён сьцьвярджае, што не працуе норма Канстытуцыі, паводле якой грамадзянін Беларусі мае права абскардзіць у судзе любое накладзенае на яго пакараньне.

**Суд над Лябедзькам і Шушкевічам**

У Берасьці 11 кастрычніка адбыўся суд над лідэрам АГП **Анатолем Лябедзькам** і лідэрам БСДГ **Станіславам Шушкевічам**. Іх абвінавацілі ў арганізацыі несанкцыяванага сходу 9 ліпеня падчас вылучэньня дэлегатаў на Кангрэс. А.Лябедзька на тым сходзе нават ня быў: яго затрымалі на пад’езьдзе да месца правядзеньня.

**АШ**

# Восеньскі кірмаш

Па ўсёй краіне праходзяць восеньскія кірмашы. У цэнтры гарадоў і мястэчак, дзе-нідзе парушаючы правілы руху вялікага транспарту, цягнуцца калёны грузавікоў. І іх зь нецярплівасьцю чакаюць згаладалыя гараджане, што не нарыхтавалі сабе на сотках запасу ежы на зіму. Таму раніцай можна сустрэць руплівых мінакоў, што цягнуць дахаты ў вазках ці на плячах мяхі з бульбаю, капустай ці буракамі. У вачах, што сьвецяцца шчасьцем, чытаецца ўпэўненасьць у заўтрашнім дні.

Мая цешча, капаючы на сотках бульбу, бедавала, што сёлета — няўрод, ды прагназавала жахлівыя цэны на другі хлеб — 800 рублёў за кілё. Але пасьля па вёсках пайшла пагалоска: Лукашэнка загадаў прадаваць картоплю ня больш чым за 350! І сапраўды, цэны ў Баранавічах вагаюцца ад 200 да 340 рублёў.

Але яшчэ больш сьпявае душа ў кіраўніцтва гаспадарчых кааператываў і іх набліжэнцаў. Шырокі прастор маюць на гэткіх кірмашах гэтыя «былыя» старшыні калгасаў. Падчас продажу ніхто не выпісвае квіткоў, таму пракантраляваць колькасьць прададзенага немагчыма. Вельмі проста ўкінуць у кузаў дадаткова якіх пару дзясяткаў мяхоў.

Тут вам не адсталая Чэхія, дзе гародніна й садавіна прадаецца толькі ў адмысловых крамах цягам усяго году, а пра сапраўды народны й вольны гандаль даўно забыліся. Нашыя восеньскія кірмашы — паказчык праўдзівай вольнай эканомікі. Цэны ўзрастаюць згодна з попытам бліжэй да вясны, а не трымаюцца штучна цягам усяго году, як у Празе. Таму і набірае наш чалавек сабе як узяць. А потым захоўваючы тыя запасы ў неспрыяльных умовах — каморы ды склепы ня кожны мае — душыцца па зіме падпсаванымі, падгнілымі, зьвялымі караняклубнямі.

**Руслан Равяка, Баранавічы**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Кірмаш у Стоўпцах.**

## СЬЦІСЛА

### Вашкевіч прывёз у Полацак Глёбуса

7 кастрычніка сваю выставу жывапісу адкрыў у Мастацкай галерэі Руслан Вашкевіч. Мастак толькі вярнуўся з Вэнэцыянскай біенале, таму быў у гуморы. На публіцы Вашкевіч зьявіўся на некалькі хвілін, падзякаваў прысутным ды падарыў музэю тры ўласныя працы — палатно «Манія перасьледу» і дзьве літаграфіі. Сярод прывезеных у Полацак карцінаў ёсьць і партрэт Адама Глёбуса, які сікае ў ваду пасярод лужыны. Праца называецца «Высокае—нізкае».

**Васіль Кроква, Полацак**

### Дзе вы, людзі ў белых халатах?

Усяго тры маладыя дактары прыехалі сёлета ў Воршу пасьля інстытутаў. Згодна з штатным раскладам, у горадзе павінны працаваць 460 лекараў. Не хапае 130 спэцыялістаў — анколягаў, эндакрынолягаў, кардыёлягаў, нэўрапатолягаў, траўматолягаў. Сярод дактароў кожны чацьвёрты — пэнсіянэр.

### Небясьпечны жарт

Рэха выбуху ў Віцебску прымушае быць пільнымі да паведамленьняў пра выбуховыя прадметы. Так, у Воршы 4 кастрычніка нехта патэлефанаваў, што замінаваны будынак мэдыцынскай вучэльні. Як высьветлілася, званок быў жартам. За апошні час такіх тэлефанаваньняў у Воршы было шэсьць. Усіх жартаўнікоў апэратыўна знайшлі й пакаралі, у тым ліку пазбаўленьнем волі.

### Аршанская анамалія

У адрозьненьне ад усяе краіны сярэднія заробкі жыхароў Аршанскага раёну значна пераўзыходзяць заробкі гараджан. Так, работнікі прамысловасьці раёну атрымалі ў мінулым месяцы 477 тыс. руб., у горадзе — амаль на 100 тыс. меней. Нават у сельскай гаспадарцы атрымоўваюць болей, чым у гарадзкой прамысловасьці. Выключэньнем зьяўляюцца заробкі работнікаў культуры — усяго 209 тыс. на вёсцы. Ці ня стаць у такім выпадку Воршы аграгарадком?

**Яўген Жарнасек, Вoрша**

### Два эсэсаўцы і сабака

Пры рамонце кабэлю на тэрыторыі НДІ гароднінаводзтва ў Самахвалавічах пад Менскам былі знойдзены парэшткі нямецкіх вайскоўцаў на нязначнай глыбіні — да 30 см. Добра захаваліся парэштні двух чалавек. Побач зь імі ляжаць таксама косткі сабакі. Месца пахаваньня было знойдзена акурат пад сьцежкай, па якой гадамі хадзілі людзі. Міліцыянты, агледзеўшы вайсковыя адзнакі жаўнераў, прыйшлі да высновы, што гэта эсэсаўцы. Знаходка перададзена супрацоўнікам нямецкай амбасады.

**Сямён Печанко**

### Завод запусьціўся

З 1 кастрычніка спыніў працу бабруйскі малаказавод. Усіх работнікаў прымусова адправілі ў бестэрміновы адпачынак з захаваньнем дзьвюх трацін акладу. У апошняй палове верасьня ў гарадзкім гандлі выявілася нястача малака бабруйскай вытворчасьці. Калі ў мінулыя гады, згодна з пастановай гарвыканкаму, крамы прымусова павінны былі аддаваць перавагу «свайму» малаку, дык сёлета сытуацыя зьмянілася.

Гармалзавод у стане перапрацоўваць да 80 т малака ў суткі. Але паступленьне яго скарацілася да 15 т. Сельскія гаспадаркі палічылі эканамічна выгаднейшым вазіць малако ў Рагачоў альбо Магілёў, бо бабруйскі завод ня ў стане быў рабіць перадаплату.

Пасьля рашэньня аблвыканкаму аб перадачы гармалзаводу ў падпарадкаваньне Асіповічам працоўны калектыў прадпрыемства застаўся «беспрацоўным». Як доўга працягнецца пярэрва, кіраўніцтва сказаць не бярэцца.

А пакуль работнікі шукаюць абвесткі ў бабруйскіх газэтах.

**Надзея Лісоўская, Бабруйск**

НАД ШУМАМ ДЗЁН

# Мяцёлкай па рэпе

Наступная раніца па Кангрэсе дэмсіл. Я ў лякарні.

У знаёмых доктарак знаходжу тую інтэлігентнасьць, якая робіць жыцьцё жыцьцём. Людзкая карэктнасьць і ўзаемапавага — жудасна рэдкая зьява. Яшчэ і на адной мове!

Пашанцавала з загадчыцай аддзяленьня. Вытанчаная жанчына, туфелькі з высокімі абцасікамі. Цок-цок. Пабегла. Зашчабятала. Па-беларуску.

— Ха-ха, дзяўчаты!..

Няўрымсьлівая, сур'ёзная, вясёлая. Ну дзе вы бачылі ў суворай беларускай больніцы такі тып? Прыгожая жанчына ў халодных сьценах — хіба ня сонца сярод лёду нашага жыцьця? А гаворыць як, заслухаесься: з такім мяккім «сьсь»…

Загадчыца нешта піша.

— І што ж вы мне пішаце?

— Працэдуры вашы, — пайшла ўжо другая старонка шэрай паперы расейска-лацінскаю «трасянкаю», даведзенай да аўтаматызму.

— Добра было б гэта ўсё кампутарызаваць, а то пераводзіцца драўніна дарма! Хто ж тое чытаць будзе? — выказваю я дужа «арыгінальную» ідэю…

— Мяне тады ўжо ня будзе, як кампутарызуюць, — падымае слухаўку, глядзіць у нікуды. — Алё! Не, вядома, — вешае трубку, паварочваецца да мяне. — Клічуць на выстаўку. Нашто мне яна! Каб зь яе ўзяла чаго для свайго аддзяленьня, а то… Мая дачка канчае мэдынстытут, і што? За 150 тысяч яна пражыве? Чаму яна сама са сваёй адукацыяй ня мае магчымасьці зарабіць?..

Што я магу сказаць? Не люблю гаварыць пра Палітыка, але тут, як ні круці, усё спаўзае да Ягамосьці.

— Вы ўчора глядзелі вечарам па тэлевізары? — так многа хочацца сказаць, падзяліцца з суразмоўцам, які цябе разумее.

— Я ня маю тэлевізара, — адказваю. А што? — ніхто не паясьняе, *дзе* і *што* адбывалася, усе разумеюць, *аб чым* гаворка.

— Якую брыдоту паказваюць! Я не апазыцыянэрка, але ж што яны паказваюць? Нетрадыцыйнай арыентацыі сьпявалі «Блакітны вагон»… Хіба не зразумела?..

— Гэта нам з вамі ясна. А тым, хто глядзіць БТ, — не. Яны вераць, што ураган у ЗША — гэта насланьнё за Ірак...

На першым паверсе чакаю аўдыенцыі. Саджуся на лавачку, перада мною заходзіць дзяўчына, наступны я. Нейкая бабка ўсаджваецца побач, дэманстрацыйна павярнуўшыся сьпінаю да мяне і прыставіўшы ногі да дзьвярэй. Чытаю ў яе паставе: «Пайду я, хоць задушыся!» Перапытваю: «Вы займалі, прабач?..»

«Це» не пасьпяваю вымавіць — «Я зьдзесь вабшчэ с утра хаджу!».

Дзьверы расчыняюцца: «Новак!»

— Добры дзень!

— Калі ласка! Рая, афармляй накіраваньне!

— А чаго тая кабета гэтак раўла?

— Вы яшчэ дзівіцеся! — чытае ў картцы хворай: «Прыбіральшчыца». — Чаго ж вы спадзяваліся?

Мы вось дзеля такіх працуем і жывём.

Па лякарні бягу ў амбасаду адной з краін ЭЗ. У чарзе заходзіць некалькі размоў. Сёй-той гамоніць пра КДС і «адзінага», ад якога — увага! — чакаюць: 1) вэнджанае заміж варанае каўбасы на стале, 2) магчымасьці адукаваць дзяцей і 3) пабудаваць уласны дом.

— Як чарга ідзе? — падышла жанчына гадоў сарака-пяцідзесяці. — Ня ведаеце, ці доўга?

— Страхоўку афармілі?! — падбягае страхаўшчыца.

— Мне на два-тры дні. Толькі пракантралюю і назад.

— І што ж маеце кантраляваць? — ня ўстрымліваюся ад цікаўнасьці.

— Пагляджу, як дачка вучыцца. У ЭГУ ў Вільню. На дызайнэра.

Далей кароткая споведзь: ВНУ закрылі, нашто? Хіба краіне не патрэбная талковая моладзь? Ці ж лепш, каб яны за граніцай «асядалі»?..

Асядуць. Бо тут затаўкуць, замятуць. Паралельна гадуецца *іншая* зьмена — верная ідэалам…

— Што, надта разумны? А ў рэпу?!

Інтэлігенцыя прагне інтэлігентнага да сябе стаўленьня — і ад прыбіральшчыцы, і ад міліцыянта. Яна прагне адукацыі для сваіх дзяцей, добрае працы і стабільнасьці для іх, калі ўжо не для сябе. Ды ці ж толькі інтэлігенцыя? Таго ж хочацца кожнаму чалавеку.

Але, навучыўшыся *рукамівадзіць* гэтай дзяржавай, прыбіральшчыцы мяцёлкі так проста не аддадуць.

З прынцыпу. І хай хоць зямля гарыць пад нагамі! Чаго захацелі, інцелігенцішкі!

**Тадэвуш Новак**

# На Жызэль упала дэкарацыя

73-ці сэзон Опэры адчыніўся 11 кастрычніка на сцэне Дому афіцэраў. Балет выступае на сцэне Палацу Рэспублікі. Сымфанічны аркестар курсуе між двума будынкамі. Піша **Зьміцер Дрыгайла**.

Па вайне архітэктар Опэры Іосіф Лангбард спытаўся ў сяброў пра разбураны Менск: «А ці ацалеў будынак Опэры?» Пачуўшы станоўчы адказ, засмуціўся: «Шкада». З тых самых паваенных часоў (1947) Опэру не рамантавалі. Тэхніка, гук, сьвятло, ліфты, сцэна, цэхі фізычна й маральна састарэлі.

Плянуецца, што рэканструкцыя зойме тры гады. Але ніводзін тэатар у сьвеце ня быў адрэстаўраваны за такі малы тэрмін. Рамонт Адэскага, Рыскага, Львоўскага опэрных тэатраў доўжыўся прыкладна сем-восем гадоў.

Рэканструкцыя Менскай опэры будзе праходзіць паэтапна. Спачатку будзе рэканструявацца палова будынку, у другой палове будуць рэпэтаваць. Пасьля заканчэньня першага этапу ў адрамантаваную частку пяройдуць артысты, а рэканструкцыя пачнецца ў другой частцы. Але дагэтуль ня вызначаны генэральны падрадчык. Тэндэрная камісія не зрабіла выбару паміж беларускім і сэрбскім варыянтам. Уласна, менавіта арганізацыя-падрадчык канчаткова вырашыць, якім чынам рамонт будзе адбывацца. Ад самага пачатку спэцыялісты МНС заяўлялі, што для якаснага рамонту будынку трэба мяняць перакрыцьці, гэта значыць разьбіраць дах.

73-ці сэзон опэры адчыніўся 11 кастрычніка на сцэне Дому афіцэраў. Тут па першым часе спэктаклі будуць ісьці сем дзён у месяц. Опэра таксама дамовілася зь філярмоніяй, што канцэртныя пастаноўкі будуць ісьці на філярманічнай сцэне, як і канцэртныя варыянты некаторых опэр, дэкарацыі якіх ня могуць разьмясьціцца на сцэне Дому афіцэраў, напрыклад, «Барыса Гадунова». Балет месяц таму сэзон пачаў праз дарогу, на сцэне Палацу Рэспублікі.

Склад абодвух тэатраў працуе ў звыклым рэжыме. Двух салістаў Опэры звольнілі і адправілі на пэнсію, некалькіх перавялі на палову стаўкі, матывуючы гэта складанымі ўмовамі існаваньня тэатру. А вось склад аркестру павялічыўся. Гэта дазволіць у выпадку супадзеньня па часе спэктакляў опэрнага й балетнага тэатраў адначасова іграць у абодвух будынках.

Сёлета заплянавана некалькі прэм’ераў. У сьнежні — «Пірацкі трохкутнік» італьянскага кампазытара Гаэтана Даніцэцці, а таксама спэктакль пад рабочай назвай «Запіскі», які будзе выключна мужчынскі. Пры канцы сэзону чакаюцца прэм’еры «Джані Скікі» Дж.Пучыні і опэра «Ягоныя жонкі» лідэра беларускай музыкі Віктара Капыцькі.

Зьменаў у кіраўніцтве тэатраў няма. Галоўным дырыжэрам аркестру застаўся Віктар Галанаў. Дырэктарам тэатру опэры працуе Галіна Вагнер — дачка клясыка беларускай музыкі Генрыха Вагнера. Мастацкая кіраўніца — жонка «бога беларускага балету» Валянціна Елізар’ева Маргарыта Ізворска. Апошняя нядаўна заявіла, што без нармальнай аркестравай ямы ў Доме афіцэраў опэра сэзон не пачне. Хоць для павелічэньня ямы былі зьнятыя чатыры першыя рады крэслаў, але цяпер не хапае глыбіні — галовы аркестрантаў узвышаюцца над сцэнай.

У балету свае праблемы. У Палацы Рэспублікі вялікая заля. У выніку на балетных пастаноўках у залі ёсьць вольныя месцы, а праз вялікую аркестравую яму цяпер не абысьціся безь мікрафонаў, інакш аркестру ня будзе чуваць. Пражэктары ў Палацы настолькі магутныя, што скіраванымі на сцэну яны «падсьвечваюць» таксама й першых 20 радоў. На «Жызэлі» 6 кастрычніка пры канцы першага акту, якраз калі на сцэне аднachасова знаходзіліся салісты й кардэбалет, правая дэкарацыя з грукатам павалілася, падняўшы клубы пылу. На шчасьце, абышлося без ахвяраў і траўмаў.

Але галоўная праблема для беларускага балету — фінансы. Арэнда залі Палацу Рэспублікі для аднаго спэктаклю абыходзіцца ў 5 тысяч эўра, столькі каштуе адна рэпэтыцыя. У месяц патрэбна недзе 20 рэпэтыцый, 10 спэктакляў — 150 тысяч! Таму балет будзе шмат гастраляваць за мяжой — ад Кіпру да Карэі.

**У адпаведнасьці з урадавай праграмай, да 2010 г. у краіне маюць рэканструяваць больш як 20 тэатраў. Агульны праектны кошт рэстаўрацыі й рэканструкцыі будынку Опэры ацэнены на 133 млн рублёў.**

# «Яр» выклікае дрыжыкі



Юлія Дарашкевіч

Новае пакаленьне беларускага фольк-мадэрну. Піша **Сяргей Будкін**.

Пра гурт «Яр» шырокі слухач даведаўся сёлета. Аднак аўтарка песень Марыйка «Яр» Лагодзіч у фольк-музыцы дзесяць год — палову жыцьця. Яна пасьпявала ў трох калектывах і нават выступіла з маэстра Фінбергам.

«Яр» не баіцца выходзіць за межы прыдуманага колісь лідэрам «Палацу» Алегам Хаменкам фольк-мадэрну. «Яр» не выкарыстоўвае экзатычных інструмэнтаў ды не схіляецца ў бок фольк-року. Сьпеў, флейта, віялянчэль, танцы, стукі, грукі — вось і ўвесь пералік «інструмэнтаў».

У верасьні дуэт даў шэсьць сольнікаў у Нямеччыне і ўзяў удзел у двух фэстывалях. Спачатку быў чатырохдзённы Singetraffen, на які зьбіраюцца музыкі з усяе Эўропы. «Немцаў вабяць беларускія сьпевы тым, што яны не падобныя да вядомых ім народных песень. Не сустракала яшчэ немца, які б ня ўмеў сьпяваць, — усе маюць музычную адукацыю, закладзеную ў маленстве», — падкрэсьлівае Маша. Немцы хутка падхопліваюць песьні, хоць ім цяжка навучыцца беларускай манеры выкананьня. Маша развучыла з замежнікамі «Ой, рана на Йвана», «Ой, борам», а супэргітом стала «Купалінка»: «Я ўжо не магла сьпяваць гэтую песьню, а яны ўсё прасілі яе выканаць».

На другі фэстываль — Burg Waldeck, фэстываль з 30-гадовай гісторыяй — дзяўчаты вырашылі дабрацца з Singetraffen пешкі. «Праз горы — сем гадзін. Нас, цяплічных расьлінак, гэта добра загартавала». Асаблівых патрабаваньняў да канкурсантаў на фэсьце, што доўжыцца два дні, няма. Хіба толькі творы выконваюцца ў камэрнай абстаноўцы. Выступ «Яру» выклікаў шмат спрэчак, паколькі на фэсьце збольшага былі прадстаўлены клясычныя нямецкія «піўныя» ансамблі — кантрабас, гітара і скрыпка. Журы вырашыла адзначыць беларускую групу спэцпрызам — «За непадобнасьць да іншых».

Музычнае жыцьцё Марылі пачалося ў 1996 г., калі навучэнцы Берасьцейскага музычнага каледжу стварылі фольк-групу «Кола». Потым Маня ўвайшла ў склад гурту «Юр’я». Тры гады таму яна і яшчэ адна вакалістка «Юр’я» Натальля Пятровіч вырашылі заснаваць сваю групу. Летась яны пайшлі на экспэрымэнт і зрабілі некалькі песень супольна з сынці-поп-праектам Logika metro. У выніку іх песьні трапілі ў інтэрнэт-, радыё- і тэлератацыі. Цяпер іх «Салдацкая» бярэ ўдзел адразу ў некалькіх гіт-парадах — на БТ у «Скрыжаваньнях Эўропы», на «Music.fromby.net» і радыё «Менск». Даспадобы Машы прыйшоўся і яшчэ адзін экспэрымэнт — выступ «Яру» з аркестрам Фінберга на фэстывалі «Маладэчна».

Маша наступным чынам характыразуе сучасны стан беларускага «фольк-мадэрну»: «Гурты жывуць за кошт старога рэпэртуару, таму ствараецца ўражаньне, што ўсе народныя песьні ўжо перапетыя. Але ж гэта невычэрпная крыніца». Выконвае Маша й свае песьні. «Самы галоўны крытэр для мяне — выступ мусіць выклікаць дрыжыкі. Калі музыка не выклікае такіх эмоцый, яна пустая. Мы стараемся ўзрушыць нашых слухачоў», — крэда дуэту «Яр».

**Сяргей Будкін**

**«Вясна-красна»**

**«Jar», «БМА Group», 2005**




**Альбом запісаны ў мінімалісцкім стылі — вакал і віялянчэль. Але як калярытна!**

«Яр» — самая цікавая зьява на беларускай этнасцэне апошніх год. Яны прапаноўваюць іншы погляд на фольк-спадчыну. Часам — правакацыйны. Калі б Джэніс Джоплін выконвала беларускія народныя, гучала б гэта прыкладна як трэк №11 альбому «Вясна-красна». Усе творы дуэту збудаваны на эмоцыях, вакалістка цалкам уваходзіць у песьню, як увасабляецца ў сваю ролю добры актор. Яна крычыць і шэпча, заклінае і заклікае, варожыць і калыша. У купальскай песьні яе голас набірае звышшалёныя абароты. У «Па пясочку», наадварот, супакойваецца. Альбом ірваны па настроі, тым і цікавы. Як на арэлях.

**СБ**

# Садыст, постмадэрніст, клясык

Постмадэрнізм даў беларускай літаратуры двух вялікіх паэтаў. Гэта Андрэй Хадановіч і Юрась Пацюпа. Калі Хадановіч паступова ператвараецца ў постаць папсовую, дык Пацюпа строгі і выбіральны. Кожны ягоны верш — адточаны красворд. Піша **Аляксандар Фядута.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Як бы ні запэўнівалі філёлягі, што беларуская літаратура прайшла ўсе тыя ж стадыі разьвіцьця, што і іншыя эўрапейскія літаратуры, відавочна — паэзія на беларускай мове пачала паўнаварта разьвівацца толькі пры канцы рамантызму. Прычым польскага. І першая хваля паэтычнага экспэрымэнтатарства, характэрная для эпохі барока, беларускую мову з натуральна-гістарычных прычын — проста таму, што ў гэтую эпоху яна не была мовай літаратурнай, — абмінула.

Як абмінула і другая хваля — эпохі дэкадансу. У расейскай літаратуры былі Блок і Севярацін, у францускай — Малярмэ, а ў нас — Гарун і Цётка, асобы харызматычныя, але зь літаратурнага гледзішча аселыя ў эпосе народніцтва, недзе паміж Іванам Сурыкавым і Іванам Нікіціным (францускіх аналягаў падабраць не магу праз адсутнасьць апошніх).

Трэцяя хваля, якую звычайна зьвязваюць з паняцьцем «постмадэрнізм», прыпала акурат на наша чытацкае пакаленьне. І трэба проста сказаць — найбуйнейшая дасьледніца літаратуры постмадэрнізму — Ірына Скарапанава — жыве і квітнее ў горадзе-героі Менску. Праўда, займаецца Ірына Сьцяпанаўна расейскім постмадэрнізмам, бо пра існаваньне аналягічнай зьявы ў беларускай літаратуры ня ведае. А дарма. Менавіта паэты новага пакаленьня зьяўляюцца маральным апраўданьнем існаваньня сучаснай літаратуры на беларускай мове.

Я не пра Глёбуса, хоць несумненна, што гэты «традыцыяналіст у прозе» паводзіць сябе ў жыцьці зусім як постмадэрніст.

І нават не пра нэаавангардыстаў, якіх песьцяць клапатлівы выдавец Алёнка Кіхана Логвінаў і яго Санча Вішнёў.

Сёньня постмадэрнізм даў беларускай літаратуры двух вялікіх паэтаў, месца якім у будучых падручніках літаратуры забясьпечана. Гэта Андрэй Хадановіч і Юрась Пацюпа.

Пра Хадановіча будуць пісаць як пра заснавальніка новай літаратурнай школы, першага ляўрэата Нобэлеўскай прэміі зь ліку беларускіх пісьменьнікаў, Пацюпу будуць пералічаць сярод таленавітых экспэрымэнтатараў, першаадкрывальнікаў новых літаратурных формаў — недзе побач зь Віктарам Жыбулём, вялікім эквілібрыстам вершу.

Гэта будзе справядліва.

І гэта будзе крыўдна.

Таму што Пацюпа ня зводзіцца да слоўнай эквілібрыстыкі Жыбуля. Ён умее тое, чаго ня ўмее ніводзін іншы, нават самы масьціты і ўвянчаны лаўрамі (можа, паўтарымся, за выняткам таго ж Хадановіча, які ўмее ўсё).

> Здаўна дабро гуманізмам людзі завуць між сабою,
> зьмеі ж, напэўна, зьмязмам празвалі б, каб ведалі словы,
> а пацукі — пацучызмам, як павукі — павучызмам.
> Лепей, каб спрэчак пазбыцца, назвалі б яго сябелюбствам.

У гэтым насьледаваньні Ксэнафану — захаваньне ня толькі грэцкіх памераў і грэцкіх жа манер, але і грэцкага сьветаўспрыманьня. Пацюпа жыве, шырока расплюшчыўшы вочы і навастрыўшы вуха (як і належыць клясычнаму філёляґу). Яму не запярэчыш: сапраўды, з пункту гледжаньня здаровага сэнсу, што ёсьць гуманізм, як не людзкое сябелюбства? Цалкам антычная мудрасьць, адкрытая занава — ці, дакладней, упершыню, паколькі само паняцьце «гуманізм» — і Пацюпа пра гэта добра ведае! — зьявілася на шмат стагодзьдзяў пазьней.

І тут жа:

> Помніш, мы неяк купілі шчіблеты, віна і закускі —
> доўга на беразе Кронану сьвята бадзягі спраўлялі.
> Тыя шчіблеты даўно ўжо валяюцца, просячы кашы,
> толькі віно мы, здаецца, пілі не даўней як учора.

І памер нібыта той самы, але антычная адасобленасьць ад сьвету, што дазваляе выяўляць ісьціны, якія яшчэ не зрабіліся прапіснымі, саступае месца юнацкай гарэзьлівасьці, амаль студэнцкай. Дзякуй богу, што Пацюпа малады, інакш давялося б гаварыць не пра студэнцкую гарэзьлівасьць, а пра «сварлівы старэчы задзёр» (гэта я не пра «Дуліну»! Хоць не — і пра яе таксама).

Пацюпа не баіцца быць банальным. Банальнасьць для яго — клясычны цуд, які зрабіўся прывычным:

> Розум наш — кволая сьвечка, што цемру быцьця асьвятляе,
> толькі запаліш агонь — цемра гусьцее вакол.

Насамрэч усё зноў гранічна дакладна. Цемрашальства ж і ўзмацняецца ў той момант, калі зьяўляецца чарговы шалёны, што «абвяшчае чалавецтву сон залаты». А Пацюпа якраз і паводзіць сябе як спэцыяліст па снах, разважлівы паэт сярод густой цемры. І ён нібыта шукае разумную аснову шалёнага нашага быцьця, акунаючыся ў мінулае і знаходзячы там уцеху.

> У чарах млее ноч. За рэчкаю ў аддалі
> гамоняць радасна паміж сабой кусты
> па той бок. Што па той? І ўжо зьнікаеш ты.
> Так многа шчасьця, хоць яго было так мала.
> О, сэрца, ты ня плач! — яшчэ не перастала
> нясьціхна гаманіць у часе цемнаты.
> Пільнуеш, быццам сьмерць, гадзіны, дні, гады,
> калоціца агонь, што губіць і ўздымае.
> Шкада разьбітых мар. На цёмным дне жыцьця
> мінулае сваё прыпамінаю я,
> і кожны трэск, і стогн, і звонкі птушак сокат…
> Прыходзь у гэты лес, паветра тут глытай —
> у хвалях возера разьліта пазалота:
> Само–Сіера, Рэйн, Аара, По, Дунай!

Гэта санэт-цэнтон (вы яшчэ чытача такога ў Беларусі пашукаеце, які ўспомніў бы — і наагул ведаў бы! — значэньне слова «цэнтон»), у якім кожны радок належыць новаму паэту — дакладней, старому паэту, знаёмаму*, аб'екту вывучэньня, а ўсе ў сукупнасьці і ствараюць новае паэтычнае быцьцё. Тут паэзія халодна сканструяваная — але застаецца паэзіяй. Так задумаў паэт. І дзякуй яшчэ, што ён не пакідае гэты цэнтон нам у якасьці красворду, таму што — нізавошта не разгадалі б! Усе, уключаючы Хадановіча!

У Пацюпы кожны апублікаваны верш — красворд, прадуманы і адточаны. Але — красворд, які сьвядома не прызначаецца для разгадваньня. Калі Хадановіч паступова ператвараецца ў постаць папсовую (мушу прызнацца, ад «Гары Потэра — ліцэіста», «Землякоў» і «Прадмовы да Кнігі Юдыф» і аўтар гэтай рэцэнзіі млее), дык Пацюпа строгі і выбіральны. Яго чытач павінен быць пісьменным, падкаваным ня тое што на абедзьве нагі, але баюся, што і на абедзьве рукі, бо прайсьці па ўхабах пацюпінскіх экспэрымэнтаў далёка ня проста.

> Маркіз дэ Сад укладваў каталёг
> сухіх мэтафізычных экзэкуцый
> і так у працу дзікую залёг,
> перабіраючы даўнейшыя паскудзтвы
> усіх краёў, народаў і эпох,
> што нават ён, дазнаны ў той навуцы,
> прызнаны мэтр, стаміўся ды зьнямог
> і меўся ўжо спаліць натхненьне ў грубцы…
> Аднак — архіў тутэйшы напаткаў,
> і сьлёзы пацяклі ў яго, а сьліна
> юрлівая сачылася між спраў.
> Эстэцтвам і эротыкай ліцьвінаў
> захоплены — маркіз адно шаптаў:
> «О Беларусь, мая шыпшына!..»

Здавалася б: надумана ўсё гэта! Прычым маркіз дэ Сад да радка з Дубоўкі? Як ужо іх можна кантамінаваць?! Можна! Пацюпа ўкідвае свайго чытача ў сьвет шалёнага маркіза, даўшы перад санэтам два эпіграфы: першы — з Грыгорыя Каніскага: «На маіх вачах сечана дзявуля, сьпярша розгамі, потым шыпшынай…» — і другі — з Абуховіча: «…Загадалі яму трымаць за ногі Магдалену, якая ўвесь час, як яе білі, паказвала яму ўсе свае «сакрэты». І аказваецца, што традыцыя садызму ў беларускім побыце ву-у-нь адкуль цягнецца!

Ды Пацюпа і сам паводзіць сябе як садыст, загадкі свае загадваючы. Ён атрымлівае асалоду ад гульні словам — і сэнсам (што яго, уласна, ад Жыбуля і адрозьнівае, таму што Жыбуль гуляе ня словамі, а гукамі — і асколкамі сэнсу). Ён забраўся ў збудаваную ім вежу са слановай косьці, каб цешыцца ў ёй асаладамі філялоства, хвошча чытача сваімі радкамі і назірае за рэакцыяй. Яму добра.

Але ў вежы доўга ня выседзіш. Трэба спускацца ўніз, у рэальнае, нефіляляґічнае жыцьцё. Ад эпохі паэтычнага барока трэба ісьці да тых, каго — таго і глядзі — сашлюць на «хімію». А ў бараках не да барока. І ў гермэтычны сьвет высокай навукі і высокай паэзіі ўрываецца жыцьцёвая проза. І зьяўляецца п'еска-пастыш «Зьяўленьне героя» — прыклад таго, што і палітыка можа быць зьявай культуры. І зьяўляецца Прамэтэй як вобраз, што зьвязвае старажытнагрэцкіх і новабеларускіх паэтаў:

> Быў прыкуты даўней Прамэтэй
> да сьняжыстай
> Каўкаскай гары —
> там ён, кажуць,
> пакінуў дзяцей,
> там агонь яго ў саклях гарыць.
> Ды панадзіўся ў саклі лятаць
> дзьвюхгаловы расейскі арол
> і дзяцей Прамэтэя хапаць —
> зьнюхаў, пёс, што
> адважная кроў!
> Ды і ноч не хацела мінаць,
> каб хоць гора між гор загаіць,
> бо арол, прыляцеўшы зьвідна,
> да зьмярканьня
> ня стоміцца піць.
> Але ёсьць і ў нядолі канец:
> кажуць, выкуе Сонца стралу,
> каб за морам узьняў Гэркулес
> і пусьціў яе ў грудзі арлу.

Гэта таксама вершы. Але іншыя. У падручніках іх называюць «грамадзянскімі». Аказваецца, Пацюпа можа пісаць амаль гэтак жа, як Яндарбіеў у перакладзе Барадуліна.

І я ня ведаю, добра гэта ці дрэнна.

Я — усяго толькі чытач. А паэзія барока шмат у чым і будуецца на тым, што чытач ня ў стане вызначыцца.

* Аўтары, радкі якіх скарыстаныя ў цэнтоне: М.Багдановіч (10, 11); А.Гарун (12); М.Грамыка (6); К.Кірэенка (4); В.Ластоўскі (14); Г.Леўчык (5); А.Моркаўка (7); А.Паўловіч (1); А.Разанаў (3, 8); Хв.Чарнышэвіч (2, 13); Янук Д. (9).

# Украінскі актор на беларускай сцэне

Пасьля беспасьпяховых спроб утаймаваць Лукашэнку Захад вырашыў падключыць да гэтага «аранжавы» Кіеў.
Піша **Раман Якаўлеўскі**.

Пасьля Аранжавай рэвалюцыі актыўнасьць паміж Менскам і Кіевам зьбольшага праяўлялася ў прапагандысцкай сфэры. У Беларусі на розных паверхах улады можна было пачуць шматлікія крытычныя заўвагі на адрас новых улад у Кіеве. Былі нават абвінавачаньні, што на тэрыторыі Ўкраіны рыхтуюць «баевікоў» для рэвалюцыі ў Беларусі. Але не прайшло і году, як палітычная сям'я сп.Ющанкі распалася. І пакуль безь бійца мордаў. У адрозьненьне ад Расеі — і вонкава спакойнай Беларусі — палітычныя пэрыпэтыі адбываюцца ва Ўкраіне адкрыта. Як адзначаюць назіральнікі, куды лепей, калі прэзыдэнт выбачаецца перад журналістамі. А Ющанка рабіў гэта неаднаразова. І пакуль электарат не адмаўляе ў падтрымцы ні Ющанку, ні Цімашэнцы. Адпаведна, адзначае расейскі экспэрт Лілія Шаўцова, украінцы не ідуць назад, яны проста пакутліва ідуць наперад, сьцягваючы зь сябе «прагнілую скуру».

Са зьменамі на ўнутрыпалітычнай арэне Ўкраіна стараецца заняць пазыцыі рэгіянальнай сілы. На думку некаторых заходніх экспэртаў, прапанова выступіць пасрэднікам паміж Польшчай і Беларусьсю пасьля досьведу ў вырашэньні прыднястроўскага канфлікту толькі пацьвярджае згаданае імкненьне.

Пачатак працэсу актыўнага дыялёгу між Кіевам і Менскам паклала сустрэча Ющанкі і Лукашэнкі падчас саміту СНД у Казані. Напярэдадні беларускія дзяржаўныя СМІ спрабавалі пераканаць сваіх спажыўцоў, што Лукашэнка ніякай сустрэчы з украінскім калегам у найбліжэйшы час не плянуе. Тым ня менш, сустрэліся і пагаварылі. Тады і высьветлілася пра намеры Ўкраіны адыграць ролю пасярэдніка. А гэта можа ўзмацніць пазыцыю Ўкраіны як рэгіянальнага актора ва Ўсходняй Эўропе, паміж ЭЗ і Расеяй, Беларусьсю.

Дыялёг быў прадоўжаны ў Кіеве падчас рабочага візыту міністра замежных справаў Сяргея Мартынава. Але міністар рашуча адхіліў прапанаваную дапамогу Ўкраіны ў зносінах Беларусі і ЭЗ. Сваю думку з гэтай нагоды выказаў Станіслаў Шушкевіч: «Гэтая ініцыятыва была прасякнута зычлівасьцю. Але я таксама лічу, што канкрэтныя дзеяньні павінны прымацца ў вельмі кансультацый — як з уладай, так і з апазыцыяй. І толькі тады гэта пойдзе на карысьць... Мае кантакты паказваюць, што да Беларусі ў Кіеве вельмі правільнае і дастойнае стаўленьне».

Дырэктар міжнародных праграм кіеўскага Цэнтру Разумкова Валер Чалых, камэнтуючы заяву Мартынава, сказаў: «У гэтай заяве ёсьць асьцярога людзей, якія лепш ведаюць унутрыпалітычную сытуацыю ў краіне наконт таго, што стабільнасьць, якая там існуе, нясе некаторыя пагрозы. Відавочна, няма ўпэўненасьці, што ў краіне ў іх усё ў парадку».

Прысутныя на выніковай прэс-канфэрэнцыі міністра замежных справаў Украіны Барыса Тарасюка і Сяргея Мартынава журналісты дружна адзначылі нешматслоўныя і дзіўныя для дыплямата замкнутыя паводзіны госьця зь Менску. Кажуць, адчувалася нейкая яго трагічная раздвоенасьць. Ёсьць падставы казаць, што гэта магла быць апошняя сустрэча Мартынава з Тарасюком у рангу кіраўніка замежнапалітычнага ведамства Беларусі. Мартынаву прадказваюць пасаду пасла ў Брусэлі.

Не пасьпеў Тарасюк нацешыцца ўражаньнямі ад сустрэчы зь беларускім калегам, як зноў давялося яму сустракаць госьця зь Менску. У Кіеў прыехаў дзяржсакратар Рады бясьпекі генэрал-лейтэнант Генадзь Нявыглас. Кіраўнік украінскага замежнапалітычнага ведамства зьвёў генэрала з шэфам Бюро нацыянальнай бясьпекі Польшчы Ежы Барам. Дарэчы, да гэтай пасады Бар працаваў паслом у Вільні і ўжо ў якасьці калегі генэрала Нявыгласа прыяжджаў у Менск, спрабуючы прадухіліць канфлікт уладаў з Саюзам палякаў Беларусі. Ня выйшла.

Афіцыйна Б.Тарасюк, Е.Бар і Г.Нявыглас меліся абмяркоўваць «пытаньні разьвіцьця трансгранічнага супрацоўніцтва, гарантаваньне бясьпекі межаў у кантэксьце процідзеяньня такім пагрозам, як транснацыянальная злачыннасьць, нелегальны абмен наркотыкаў і нелегальная міграцыя». Спробы ўкраінскага боку ўнесьці міратворчы струмень у трохбаковыя дачыненьні посьпехам не ўвянчаліся. Зноў у жорсткім стылі, як і папярэдні Тарасюкоў суразмоўнік, чарговы госьць зь Менску адхіліў прапановы Кіева паспрыяць нармалізацыі стасункаў з Варшавай. Але «скачкі» працягваюцца.

Пасьля візытаў у Маскву і Брусэль у Менск мае прыехаць кіраўнік часовага ўраду Ўкраіны Юры Еханураў. У сакавіку 2006 г. маюць адбыцца парлямэнцкія выбары, і Ўкраіна перастане быць прэзыдэнцкай рэспублікай. Галоўнай фігурай на палітычнай сцэне стане прэм'ер-міністар, вылучаны партыяй альбо блёкам, што пераможа на выбарах. І на зьмену Еханураву, відаць, прыйдзе нехта іншы. Але, калі ў Маскву і Брусэль украінскаму прэм'еру ўдалося трапіць, то зь Менскам атрымалася асечка. Паводле словаў прэс-сакратара Еханурава Валянціна Мандрыеўскага, прэм'ер адклаў візыт у Беларусь на больш позьні тэрмін. Папярэдне паездка перанесена на 18 кастрычніка. Мандрыеўскі таксама адзначыў, што паездка Еханурава перанесена па просьбе беларускага боку. Паводле неафіцыйнай інфармацыі, паездка Еханурава ў Беларусь перанесена ў сувязі са зьменамі рабочага графіку Аляксандра Лукашэнкі.

Як адзначалі ўкраінскія СМІ, візыт Еханурава ў Брусэль закончыўся гэтак жа, як і ў Маскву. Абяцаньнямі, што рэпрыватызацыйныя працэсы засталіся ў мінулым, а замежным інвэстарам будуць створаны самыя спрыяльныя ўмовы для вядзеньня бізнэсу ва Ўкраіне.

Візыт у Менск, на ўсякі выпадак, афіцыйна называюць падрыхтоўкай да сустрэчы Ющанкі з Лукашэнкам. Менавіта ад іх чакаюць вырашэньня такіх пытаньняў, як ратыфікацыя Беларусьсю Дагавору аб мяжы, так званага ўкраінскага доўгу, пагадненьня аб рэадмісіі. Дагавор гэты Лукашэнка ляшчэ ў сярэдзіне 1990-х з Кучмам падпісваў. Праз некалькі год вырашылі ў Менску ўвязаць ратыфікацыю дагавору з украінскай запазычанасьцю, якую запазычанасьцю ў Кіеве не прызнаюць. Паводле неафіцыйнай інфармацыі, украінцам нечак былі нават гатовы «дараваць» доўг у абмен на кавалачак зямлі ў Крыме для нейкай VIP-будоўлі. Але Кучма абяцаў, абяцаў… дый забыўся. А па рэадмісіі пазыцыя Беларусі такая: падпісваць пагадненьне па рэадмісіі ў пакеце, з усімі пяцьцю суседзямі. Уся загагуліна ў пазыцыі Расеі, якая пакуль да гэтага не гатова. Цікава, у чым праявяць пры абмеркаваньні гэтых пытаньняў кампраміс два прэзыдэнты? Цікава і тое, калі адбудзецца гэтая важная сустрэча Ющанкі і Лукашэнкі — да ці пасьля візыту з 18 да 21 кастрычніка ў Кіеў па чарзе генэральнага сакратара NATO і расейскага прэзыдэнта?

## СЬЦІСЛА

### Варонін: Расея ня зломіць Малдовы

Прэзыдэнт Малдовы абвінаваціў улады Расеі ў правядзеньні эканамічнай блякады. «Краіна гатова пражыць і бяз экспарту віна ў Расею. Будзе складана, аднак мы гатовы жыць у холадзе, замярзаць без расейскага газу, але не здамося», — заявіў Уладзімер Варонін у інтэрвію румынскай службе BBC. Расейскія ўлады блякуюць экспарт віна, адзін з галоўных крыніц даходаў Малдовы.

### Ванкувэр найлепшы

Экспэрты брытанскага выданьня Economist Intelligence Unit прызналі Ванкувэр (Канада) найлепшым па якасьці жыцьця горадам сьвету. Другое месца ў аўстралійскага Мэльбурну, трэцяе — у Вены (Аўстрыя). У дзясятку найлепшых гарадоў уваходзяць таксама аўстралійскія Пэрт, Адэлаіда і Сыднэй, канадзкія Таронта і Калгары, швайцарскія Жэнэва і Цюрых. Цікава, што ў Таронта, Адэлаідзе, Мэльбурне й Сыднэі жыве найбольш актыўныя беларускія дыяспары ў вольным сьвеце, а Ванкувэр апошнім часам становіцца новым асяродкам беларускай эміграцыі ў Канадзе. Дарэчы, найлепшым горадам у ЗША прызнаны «самы беларускі горад» — Клііўлэнд. Дзясятку найгоршых гарадоў складаюць Тэгеран, Дуала (Камэрун), Харарэ (Зымбабвэ), Абіджан (Кот д'Івуар), Пнампэнь, Лягас (Нігерыя), Карачы (Пакістан), Дака (Банглядэш), Альжыр і Порт-Морсбі (Папуа-Новая Гвінэя).



WWW.CDU-ODENTHAL.DE

**Ангелу Мэркель, першую ў гісторыі Нямеччыны жанчыну-канцлера, называюць нехарызматычным, але эфэктыўным палітыкам. Расея ня можа разьлічваць на блізкае сяброўства з Мэркель. Усходненямецкае маленства Мэркель пакінула не найлепшыя ўспаміны пра расейскіх «партнэраў». А вось Шродэр, якому выбарцы адмовілі ў даверы, цяпер разьлічвае на грашавітую пасаду ў «Газпроме».**

### Шродэр піша рэзюмэ

Экс-канцлер Нямеччыны Герхард Шродэр можа стаць дарадцам у канцэрне «Газпром». Паводле чуткак, гэтае пытаньне нават абмяркоўвалася на нядаўняй сустрэчы ў Санкт-Пецярбургу на найвышэйшым узроўні. Пасьля таго як канцлерам ФРГ стала лідэр ХДС/ХСС Ангела Мэркель, Шродэр прыняў рашэньне сысьці з палітыкі. Беларусы будуць шкадаваць пра такую зьмену наймення.

### «Букера» ўзялі ірляндцы

Фаваратам «Букера» лічыўся Джуліян Барнз з раманам «Артур і Джордж». Але ляўрэатам Букераўскай прэміі стаў ірляндзкі пісьменьнік Джон Бэнвіл, ганараваны за раман «Мора». Прэстыжная прэмія памерам 50 тыс. фунтаў стэрлінгаў (каля 190 млн рублёў) прысуджана Бэнвілу за кнігу пра чалавека, што сутыкнуўся са сваім мінулым у гарадку, у якім бавіў вакацыі.

### Выбар сярод правых

Польшчы спатрэбіцца другі тур прэзыдэнцкіх выбараў. У першым туры лібэрал Дональд Туск сабраў 36,3% галасоў, а кансэрватар Лех Качыньскі — 33,1%, а ў выбарах узялі ўдзел 49,74% грамадзян. Польскі Жырыноўскі, любімы палітык беларускіх дзяржаўных СМІ Анджэй Лепэр, заняў трэцяе месца — 15,11%. На ўчастку ў Менску перамог Туск, у Берасьці і Гародні — Качыньскі.

### Аўтамабіль Мусаліні

На аўкцыёне ў ЗША за 140 тыс. даляраў прадалі аўтамабіль, на якім езьдзіў дучэ. Выкшталцоная «Лянча», зробленая паводле спэцзаказу ў 1939 г., была захоплена амэрыканскімі вайскоўцамі і апошнія гады захоўвалася ў музэі аўтамабіляў. І прадавец, і пакупнік палічылі за лепшае застацца ананімнымі. Вырučаныя грошы будуць ахвяраваныя канадзкай дабрачыннай арганізацыі, што дапамагае цяжкахворым дзецям.

**AP**

# Нобэлі-2005

На мінулым тыдні былі ўручаныя Нобэлеўскія прэміі ў галіне фізіялёгіі й мэдыцыны, хіміі і фізыкі, а таксама прэмія міру. У панядзелак, 10 кастрычніка, Нобэлеўскую прэмію па эканоміцы атрымалі **Робэрт Аўман** і **Томас Шэлінг**. Літаратары па традыцыі будуць самыя апошнія, ляўрэат стане вядомы пры канцы тыдня. Афіцыйна прэміі, эквівалентныя 1,29 млн даляраў, будуць уручаны ў сьнежні на ўрачыстай цырымоніі ў Осла.

### Досьлед на сабе

Ляўрэатамі прэміі ў галіне фізіялёгіі і мэдыцыны сталі аўстралійскія навукоўцы — 54-гадовы Бары Маршал і 68-гадовы Робін Уорэн, ганараваныя за дасьледаваньні гастрыту і язвы страўніка. Маршал і Уорэн даказалі, што прычынаю захворваньняў зьяўляюцца бактэрыі helicobacter pylori. Аўстралійцы зрабілі адкрыцьцё яшчэ ў 1982 г., выявіўшы, што большасьць хворых на гастрыт і язву страўніка інфікаваны пэўнымі бактэрыямі. Маршал выпрабаваў адкрыцьцё на ўласным арганізме: увёў бактэрыі, а потым вылечыўся з дапамогай антыбіётыкаў. Да гэтага лічылася, што прычынай гастрыту і язвы ёсьць няправільны лад жыцьця, празьмерна вострая ежа, стрэсы. Цяпер дзякуючы адкрыцьцю Маршала й Уорэна можна цалкам вылечыцца ад гастрыту ці язвы страўніка. Бактэрыямі, што выклікаюць гэтыя хваробы, інфікавана дзьве траціны насельніцтва Зямлі, аднак у большасьці людзей яны не выклікаюць аніякіх захворваньняў.

### Крок да ідэальнай дакладнасьці

У галіне фізыкі «Нобэля» атрымалі амэрыканскія навукоўцы Рой Глабэр і Джон Хол, а таксама нямецкі дасьледчык Тэадор Хэнш. Глабэр, навуковец з Гарвардзкага ўнівэрсытэту, які яшчэ ў 1963 г. паклаў пачатак квантавай аптычнай тэорыі, атрымае роўна палову ўзнагароды. Такім чынам Нобэлеўскі камітэт ацаніў ягонае апісаньне паводзінаў сьвятлавых часьціц. Ён растлумачыў прынцыповую розьніцу паміж гарачымі крыніцамі сьвятла (як лямпы напальваньня), якія маюць розную частату і фазу, і лазэрамі, якім уласьцівая пэўная частата і фаза.

Хол і Хэнш падзялілі другую частку прэміі за працу па лазэрнай прэцэзійнай спэктраскапіі (звышдакладнае вызначэньне колеру сьвятлавых малекулаў). Вынік дасьледаваньня навукоўцаў з унівэрсытэту Каларада (ЗША) і Людвіга-Максіміліяна ў Мюнхэне — магчымасьць вымярэньня аптычных частот з дакладнасьцю да 15 знакаў. Гэта паспрыяе распрацоўцы звышдакладных гадзіньнікаў і спадарожніка глябальнага пазыцыянаваньня.

### Паскораны хімічны сынтэз

«Нобэля-2005» у галіне хіміі падзялілі тры навукоўцы — француз Іў Шавэн, амэрыканцы Робэрт Грабс і Рычард Шрок — за распрацоўку новых мэтадаў абменных рэакцый (мэтатэзіс) у арганічным сынтэзе. Навукоўцы зьвярнулі ўвагу на працэсы рэарганізацыі малекулаў вугляроду, фармаваньне і разбурэньне новых хімічных сувязяў і стварылі прынцыпова новыя каталізатары. Мэтад мэтатэзісу зьявіўся пад сорак гадоў таму, але яго ня надта практыкавалі хімікі. Цяпер мэтатэзіс станецца адной з самых важных рэакцыяў у арганічнай хіміі. Гэта дазволіць рабіць найбольш дакладны, хуткі і чысты сынтэз рэчываў у вытворчасьці лекаў, полімэтэрыялаў і клятчаткі. Вынікі гэтых дасьледаваньняў будуць мець вялікае значэньне для фармацэўтыкі і распрацоўкі новых сынтэтычных матэрыялаў, а таксама дапамогуць зьменшыць колькасьць небясьпечных адкідаў хімічнай індустрыі.

### Сярод 200 кандыдатаў

Прысуджэньне Нобэлеўскай прэміі міру выклікала шмат спрэчак. Прэзыдэнтаў Ючшанку й Саакашвілі, сьпевака Бона зь U-2 і яшчэ 196 кандыдатаў апярэдзіла Міжнароднае агенцтва ААН па атамнай энэргіі (МАГАТЭ) і ягоны кіраўнік Махамэд эль-Барадэй. Юрыст па прафэсіі, эгіпцянін эль-Барадэй ганараваны прэміяй за «дзеяньні, скіраваныя супраць выкарыстаньня ядзернай энэргіі ў ваенных мэтах і за выкарыстаньне ядзернай энэргіі ў мірных мэтах з максымальнаю бясьпекаю».

Эль-Барадэй, які кіруе МАГАТЭ цягам васьмі гадоў, камэнтуючы прысуджэньне прэміі, зазначыў, што ўзнагарода толькі заахвоціць агенцтва да вырашэньня пытаньняў ядзернага раззбраеньня ў Паўночнай Карэі і Іране. Яшчэ год таму МАГАТЭ лічылі звычайным бюракратычным утварэньнем, але за год агенцтва стала важным гульцом у справе вырашэньня спрэчак наконт ядзернай зброі.

Іншай думкі трымаецца кіраўнік Інстытуту дасьледаваньняў праблем міру Стэн Тонэсан, які маркуе, што прэмію міру атрымалі тыя, хто не дасягнуў цягам году ніякага посьпеху. За апошнія гады далучыліся да ліку ядзерных дзяржаў Індыя і Пакістан, Ізраіль і Паўночная Карэя. Цяпер ядзерныя працы актыўна праводзіць Іран.

У панядзелак, 10 кастрычніка, была ўручана Нобэлеўская прэмія ў галіне эканомікі. Дарэчы, гэта адзіная прэмія, не заснаваная ўласна Альфрэдам Нобэлем. У 1968 г. ейнае ўручэньне ініцыяваў Цэнтральны банк Швэцыі. Сёлета «Нобэля» ў галіне эканомікі атрымалі супрацоўнік цэнтру рацыяналізацыі пры Ерусалімскім унівэрсытэце Робэрт Аўман і Томас Шэлінг з унівэрсытэту Мэрылэнду (ЗША) за «паляпшэньне нашага разуменьня канфлікту і супрацоўніцтва праз тэорыю гульняў». Эканамісты патлумачылі, чаму адны суб'екты рынку працуюць пасьпяхова, а іншыя — не.

**Сяргей Будкін**


AP

**Многія крытыкуюць выбар кіраўніка МАГАТЭ Махамэда эль-Барадэя на прэмію міру.**


AP

**Бэры Маршал увёў бактэрыі, што выклікаюць гастрыт, ва ўласны арганізм, а потым вылечыўся.**


AP

**Амэрыканскі фізык Рой Глабэр чакаў Нобэля 42 гады.**

### Анты-Нобэль—2005

У чацьвер у Гарвардзкім унівэрсытэце ўручана прэмія «Ig Nobel» («Шнобэлеўская» прэмія) за 2005 год, якая прысуджаецца за сьмешныя і непатрэбныя адкрыцьці.

Прэмію ў галіне хіміі атрымалі супрацоўнікі ўнівэрсытэту Мінэсоты Эдвард Касьлер і Браян Гетэльфінгер, якія высьветлілі, што людзі ў сыропе плаваюць гэтак жа хутка, як і ў вадзе.

Бэна Мэер–Рохаў (унівэрсытэт Оўлю, Фінляндыя) і Ёзэф Галь з унівэрсытэту Лёранда (Вугоршчына) атрымалі прэмію за тэарэтычны аналіз працэсу спаражненьня пінгвінаў. У ходзе досьледаў яны высьветлілі, што экскрэмэнты далятаюць да 40 см. Пры гэтым яны вывучылі ціск, неабходны для спаражненьня: ён аказаўся ад 10 да 60 кілапаскаляў (0,1—0,6 атмасфэры), што больш, чым у людзей.

Прэмію па літаратуры атрымалі спамэры зь Нігерыі, якія маляўніча прасілі дапамогі ў пошуку скарбаў, што нібыта належаць ім.

Гаўры Нанда з Масачусэцкага тэхналягічнага інстытуту атрымала «Шнобэля» ў галіне эканомікі. Вынаходніца прыдумала будзільнік «Clocky», які хаваецца ад уладальніка, перасоўваючыся на колцах. Тэарэтычна, гэта мае эканоміць працоўны час, бо ў пошуках будзільніка людзі павінны канчаткова прачынацца.

Прэмію па фізыцы прысудзілі за досьледы зь бітумам, якія праводзіў Томас Парнэл з унівэрсытэту Кўінзлэнду ў 1972 г., а цяпер працягвае яго калега Джон Мэйнстоўн. Дасьледчыкі лічаць, што насамрэч астылы бітум — вадкі, хоць і знаходзіцца ў цьвёрдым стане. Для доказу Парнэл зьмясьціў астылы бітум у варонку. Першая кропля ўпала праз восем год, другая — яшчэ праз дзевяць. Мэйнстоўн дачакаўся восьмай кроплі ў 2000 г.



УЛАДЗІСЛАЎ ЯНДЗЮК

**Лідэр Аб'яднаных дэмакратычных сілаў Аляксандар Мілінкевіч распачаў свой візыт у Прагу з ускладаньня кветак да магілаў першых прэзыдэнтаў Беларускай Народнай Рэспублікі Пётры Крэчаўскага і Васіля Захаркі на Альшанскіх могілках. У сталіцы Чэхіі А.Мілінкевіч сустрэўся зь міністрам замежных справаў Чэхіі, кіраўнікамі чэскага парляманту і экс-прэзыдэнтам Вацлавам Гаўлам.**

## Памяць пра трагедыю Канюхоў

Канадзкія палякі ініцыявалі сьледзтва па факце спаленьня савецкімі партызанамі ў 1944 годзе вёскі Канюхі, што за Беняконямі.

Трагедыя вёскі Канюхі (цяпер Канюкай у Літве) здарылася ўначы на 29 студзеня 1944 г. а 5-й раніцы. Савецкія партызаны атачылі вёску і зьнішчылі яе жыхароў. Гэта была помста за тое, што сяляне арганізавалі атрад самааховы — бараніцца ад партызанскіх набегаў. Сяло ў той час уваходзіла ў склад Лідзкае акругі.

Расьсьледаваньне ініцыявалі канадзкія палякі, потым падключыліся Інстытут нацыянальнай памяці ў Варшаве й Галоўная камісія дасьледаваньня злачынстваў супраць польскага народу. У Цэнтральным вайсковым архіве выявілі тры дакумэнты, якія пацьвярджаюць факт злачынства. Так, нямецкая справаздача даводзіць, што ў Канюхах у студзеньскую ноч былі застрэлены 36 жыхароў, а 14 былі паранены. Іншыя дакумэнты — што напад зьдзейсьніў атрад у 100—200 чалавек, сярод якіх найбольш было ўцекачоў, што ўратаваліся зь віленскага гета. Вёску падпалілі з абодвух канцоў, а па тых, хто спрабаваў уцячы, стралялі. Не шкадавалі нікога. Удалося ўратававацца толькі групе жанчын.

«Тыгоднік Віленшчызны» піша, што сярод зьнішчальнікаў Канюхоў былі партызаны з атрадаў «Сьмерць фашыстам», «Да перамогі», «Сьмерць акупантам». У мэмуарах Хаіма Лазара «Зьнішчэньне і супраціў» (Destruction and Resistance. New York: Shengold Publishers, 1985) так апісваюцца гэтыя падзеі: «Штаб брыгады вырашыў зраўняць Канюхі зь зямлёй, каб даць прыклад іншым».

У траўні 2004 г. у Канюхах пастаўлены помнік памяці ахвяр — на ім 34 вядомыя на сёньня імёны.

**АШ**

# Трагедыя Толіка Сыса

### Тры беларускія паэты

Упершыню мы пазнаёміліся з Анатолем Сысом, калі вучыліся на I курсе гомельскага філфаку. Чаму я кажу «мы» — бо на адным патоку са мной вучыўся Едрусь Акулін і Сяржук Сыс, які паходзіў з Заспы, суседняй з Гарошкавам вёскі. Да нас у аўдыторыю зазірнуў малады хлопец са сьветлымі валасамі ды трохі выпучанымі вачыма й безапэляцыйна абвясьціў: «Я — паэт Анатоль Сыс! Калі сярод вас ёсьць паэты ці празаікі — увечары прыходзьце на пасяджэньне літаратурнага гуртка «Крынічка»!»

Мы ўтрох і пайшлі туды. Дзе і пазнаёміліся. Сыс вучыўся на III курсе і быў вядомы на ўвесь філфак паэт, хоць добрых жывых настаўнікаў ці паплечнікаў у яго не было. Віктар Ярац, які вёў тады пасяджэньні «Крынічкі», таксама Толікаў зямляк з Заспы, хутчэй, быў за сябра. А нас, маладзейшых, пакуль што ён ня браў у разьлік. Пазьней ужо, у Менску, убачыўшы нас зь Едрусем, заўсёды ганарліва абвяшчаў усім: «Глядзіце, гэта мае дзеці!» І сапраўды, першых пару гадоў ва ўнівэрсытэце мы «глядзелі яму ў рот».

аддаленасьць ад літаратурнага Менску наклала адбітак на ягонае далейшае жыцьцё і літаратурны шлях, які ён церабіў выключна сам. Адсутнасьць аўтарытэтаў — небясьпечная рэч. Яна дазваляе бясстрашна ісьці наперад, захоўваць прыродную чысьціню і дасягаць неймаверных вышынь, але часам даводзіць жыцьцё да поўнага анархізму і робіць яго проста бессэнсоўным.

### Толькі не ўгражайце!

Ён любіў гучны сьмех, цікавыя, а часам і балючыя жарты. Прыгожы і вельмі дужы, ён падабаўся многім філялягіням. І часам круціў зь імі раманы. Але ўжо ў тыя гады ён прысьвяціў сябе адной паненцы — паэзіі. Імкнучыся дасягнуць максымальнай шчырасьці ў паэзіі, ён амаль не адрозьніваў паэзію ад жыцьця і быў гэткім жа шчырым у жыцьці, што часта ставіла яго ў драматычныя сытуацыі. Разы два яго зьбіраліся выганяць з унівэрсытэту. Не за тое, што кепска вучыўся, а за тое, што ён заўсёды быў шчыры і казаў праўду выкладчыкам у вочы. Былі выкладчыкі, якія



АРХІЎ А. БЯЛЯЦКАГА

**Анатоль Сыс (зьлева), Эдуард Акулін і Алесь Бяляцкі ў будатрадзе ў Бабчыне на Гомельшчыне. 1980 год. Збудаваныя імі дамы сёньня стаяць пустыя — вёска трапіла ў зону адсяленьня.**

Толік сам шукаў і выбіраў сабе паэтычных настаўнікаў. Ня памятаю, каго хваліў з расейскіх паэтаў, а з беларускіх горда абвяшчаў: «У маладой літаратуры ёсьць тры сапраўдныя паэты: Разанаў, Някляеў і Пашкоў!» Трэба сказаць, што амаль не памыляўся. Прынамсі, два зь іх дакладна застануцца ў беларускай літаратуры.

Добра памятаю першы пачуты мною верш Сыса, які ён прачытаў на «Крынічцы». Там было штосьці пра забітага дэльфіна, які плаваў па сініх хвалях, а побач зь ім плавалі ягоныя мазгі.

Гэтая пэўная саматужнасьць,

любілі яго, а былі такія, што ненавідзелі. Спраўджвалася банальная ісьціна: мізэрнасьці ненавідзяць талент за тое, што ён не такі, як яны. Упершыню ў жыцьці я бачыў такую непрыхаваную зайздрасьць да яскравага таленту і жаданьне зламаць чалавека, даказаць, што ён — нікчэмнасьць. Але Сыс не ламаўся, не ўгінаўся і горда, як карабель, ішоў сваім шляхам.

Што да жартаў — Толік любіў сам ствараць розныя недарэчныя і сьмешныя сытуацыі. Ужо ў Гомелі ён з двума аднавяскоўцамі, таксама мажнымі хлопцамі, прыйшоў у рэстаран. Селі за столік. Афіцыянтка прапанавала зрабіць заказ. Абсалютна сур'ёзна хлопцы далі заказ: «Тры міскі баршчу і булку хлеба!» Афіцыянтка разгубілася і перапыталася: «Что? Что?» «Тры міскі баршчу і булку хлеба!» — з каменнымі тварамі паўтарылі яны. Афіцыянтка спалохалася і, адыходзячы ад іх задам, адно толькі паўтарала: «Не ўгражайце! Не ўгражайце!»

Наступным разам яны са сваім сябруком у гомельскім парку голасна наўзрыд аббрахалі маленькага сабачку, які на ворцы ў сваёй

> Ён зачароўваў людзей. Кожнае слова клалася ў сэрца і душу, гонячы мурашак па целе і выбіваючы сьлязу.

гаспадыні ўздумаў пабрахаць на іх. У выніку ўцякаў спалоханы сабачка, а разам зь ім і не менш спалоханая ягоная гаспадыня.

### Палеская салідарнасьць

У нечым ён, безумоўна, паўплываў на наша станаўленьне як асоб, унутраную незалежнасьць. Самае каштоўнае, што ён навучыў цаніць асабістым прыкладам, дык гэта волю, якая тады яшчэ ня значылася ў сыстэме савецкіх каштоўнасьцяў. Добра памятаю, як, ходзячы паўсюль з нататнікам зь вершамі, якія ён пісаў пакутліва доўга, літаральна хварэў, перапісваючы, прагаворваючы на прапахлых супамі інтэрнатаўскіх лінолеўмных калідорах, дашліфоўваючы ўначы, перабіраючы словы, як каштоўныя камяні, ён убачыў нас, што ішлі з начной разгрузкі брудныя і стомленыя, і сказаў: «Напрацавацца пасьпееце! Вучыцеся, пакуль у вас ёсьць такая магчымасьць, чытайце, пішыце, узрастайце, пакуль кормяць вашыя бацькі! Вас сюды не працаваць пасылалі!» Гэта ўразіла мяне. Я падумаў — і праўда! І болей на начныя разгрузкі не хадзіў.

Але была яшчэ адна начная разгрузка, на якую мы трапілі ў будатрадзе разам зь Едрусем і Толікам. Разгрузка калійных угнаеньняў з вагонаў. Мы будавалі дамы ў Бабчыне, якія цяпер стаяць пустыя — радыяцыйная зона. Грошай плацілі мала, і вось нашы камандзіры дамовіліся на калым. Па два чалавекі на вагон, цэлую ноч мы кідалі шуфлямі гэтае ўгнаеньне, а Толік час ад часу запяваў магутным голасам штосьці з Доны Самэр. Была такая папулярная амэрыканская сьпявачка. Амаль сюррэалістычная карціна. Ціхая палеская ноч, якая, не пасьпеўшы скончыцца, ужо запалілася на ўсходзе мяккім золкам, вязізныя празрыстыя зоркі, чысты сьпеў звар'яцелых салаўёў і магутны рык нястомнага Сыса.

Тады ў Бабчыне ў Сержука Сыса пачаліся непрыемнасьці зь мясцовымі хлопцамі праз тамтэйшую прыгажуню, і яны пачалі адлоўліваць яго ўсёй сваёй вясковай грамадой, ганяючыся за ім, як статак быкоў, каб пабіць (хоць Сяржук быў невінаваты, і дзяўчына — ні сном ні духам, а заварыў кашу тутэйшы хлопец, п'яны стрыечны брат Міколы Мятліцкага). Толік прапанаваў нечаканы



**Алесь Бяляцкі** — літаратуразнаўца, праваабаронца, кіраўнік праваабарончага цэнтру «Вясна», зачыненага ў кастрычніку 2003 г.

ход — усім хлопцам з будатраду пастрыгчыся нагала, каб было немагчыма пазнаць Сержука. Паехаўшы у лазьню ў Хойнікі, мы, чалавек дванаццаць, салідарна гэтак і зрабілі. Памятаю выраз на тварах у хойніцкіх габрэйскіх хлапцоў, якія тады яшчэ жылі ў Хойніках і тусаваліся каля лазьні, калі яны ўбачылі цэлую купу лысых будатрадаўцаў. Сержука ўжо было немагчыма адрозьніць, хаця вечна п’яны Мятліцкі са сваімі быкамі і прыходзіў на апазнаньне, ды дзе там!

### Навяртаньне

Першыя спробы ўцягнуць Толіка Сыса ў моладзевы нацыянальны рух у 1981-м, які тады распачалі менскія студэнты — В.Вячорка, С.Сокалаў, С.Дубавец, — ён успрыняў насьцярожана. Казаў, што ў Менску там нацыяналісты і што ўсё гэта скончыцца турмой, а ён хоча пісаць вершы і нічога болей.

Хоць і з праблемамі, унівэрсытэт ён дзякуючы дэкану скончыў і пайшоў у войска, служыў у польскай Легніцы, у пантонным батальёне. У Польшчы разгортваўся незалежніцкі рух, і, як расказваў Сыс, на плоце вакол вайсковай часьці ім часта малявалі тое, што думалі пра іх.

За гэты час падрасьлі і мы, перайшоўшы на беларускую літаратурную мову, павялічыўшы свае веды ў беларушчыне ды пашырыўшы кола аднадумцаў. Гэта моцна ўразіла Толіка па прыходзе з войска. Яго шыкоўная трасянка, якой ён вечна фарсіў падчас вучобы, цяпер выглядала анахранізмам. І ён адразу ж перайшоў на літаратурную мову, на якой размаўляў да канца жыцьця. Ён і да нас пачаў ставіцца ўжо як да роўных. Працуючы ў Веткаўскай «раёнцы», часта бываў у нас у інтэрнаце, браў чытаць кніжкі, слухаў мае гарачыя аповеды па гісторыі Беларусі, што я здолеў накапаць па пэрыёдыках, чытаў Ермаловіча, Абдзіраловіча, «Калосьсе» і «Студэнцкую думку», якія ў фатакопіях хадзілі па руках. І не такія страшныя ўжо былі для яго нашыя нацыяналісты. Неўпрыкмет, атрымаўшы патрэбныя веды, ён і сам стаў носьбітам беларускай нацыянальнай ідэі.

Увосень 1984 г. я паступіў у асьпірантуру Інстытуту літаратуры Акадэміі навук і атрымаў месца ў інтэрнацкім пакоі на Акадэмічнай. Там яшчэ давучваўся Юзік Янушкевіч, ужо вучыўся гісторык Мікола Крывальцэвіч, толькі паступіў Генадзь Сагановіч. У нас адразу ж склалася беларускае кола, і закіпела актыўнае жыцьцё.

У гэты час, кінуўшы «раёнку», у Менск прыехаў Толік Сыс. Ня маючы жытла, спаў у пакоі ў мяне, у Сагановіча, які меў аднаасобны пакой. Хадзіў-шукаў па Менску працу, пакутаваў, шумна ўздыхаў і напісаў хіба што за пару гэтых месяцаў адны з найлепшых сваіх вершаў — «Пацір», «Маналёг Апанаса Філіповіча», «Дух» ды яшчэ некалькі іншых. Таксама напісаў пару артыкулаў па беларускай культуры, у прыватнасьці для «Маладосці» пра слуцкія паясы. Урэшце знайшоў працу на тэлебачаньні, за што вельмі дзякаваў Бураўкіну, атрымаў пакой у інтэрнаце і неяк зачапіўся за Менск. За гэты час пазнаёміўся са сьвядомай беларускай моладзьдзю.

Назвы, дарэчы, для сваіх «маналёгаў» часам даваў адвольна, як з тым жа ж «Апанасам Філіповічам», за старасьвеччынай маскуючы сучасны зьмест. А часам натхняўся якой-небудзь постацьцю зь беларускіх нацыянальных дзеячаў, якая ўражвала яго сваім яскравым талентам ці трагічным жыцьцёвым лёсам. Так, ужо пазьней, перабіраючы старую беларускую пэрыёдыку, я прачытаў пра беларускага артыста Рамуальда Жакоўскага, які скончыў жыцьцё самагубствам, перапісаў гэтую інфармацыю і паказаў Толіку. Той схапіўся за яе і напісаў «Маналёг Рамуальда Жакоўскага».

Увесну 1985 г. на Радаўніцу на Ўсходніх могілках сьвядомая моладзь і старэйшыя наладзілі ўскладаньне кветак да магілы Караткевіча. Прыйшлі і мы. Былі прамовы і выступы. Толік таксама выступіў і прачытаў свой верш «Дух». Як ён чытаў вершы — гэта асобная гаворка. Ён зачароўваў людзей. Кожнае слова клалася ў сэрца і душу, гонячы мурашак па целе і выбіваючы сьлязу. Усе зьнерухомелі, бо было ў вершы, апроч усяго, і пра «плюгавага», які скажа: «Дух — гэта, людзі, Я!» — Скажа, а сам з рагамі. Людзі разявяць рот — Як жа ж, такія словы: «З намі — увесь народ! Шлях да адзінай мовы!» — зь якой пагардай і нянавісьцю гучалі гэтыя радкі пра «адзіную мову»! Пракорам вяшчаў ён пра Духа-заступніка, які «Выжыве — гэна так! Знойдзе… і вам на тацы медны падасьць пятак: «Вось вам на хлеб, засранцы!»» Пра «адзіную мову» тады вяшчалі з самых высокіх трыбун. І асацыяцыі з «плюгавым» былі вельмі празрыстыя.

Адразу пасьля сканчэньня прамоў да Анатоля падышлі тры коратка пастрыжаныя хлопцы ў цывільным, якія дагэтуль абшараліся ў натоўпе, сунулі яму пад нос кніжачкі і памкнуліся затрымаць яго. У мяне было адчуваньне роспачы, як, мабыць, і ва ўсіх, хто там быў. Бо што на той час азначала такое затрыманьне, ня ведаў яшчэ ніхто. Я інстынктыўна схапіў аднаго зь іх за локаць, спрабуючы нейкім чынам затрымаць, задаючы нейкія недарэчныя пытаньні, накшталт «За што?». Адзіны, хто не разгубіўся, дык гэта быў Анатоль, які рэзка разьвярнуўся і… пабег! Гэтага не чакалі і «ціхуны», якія са спазьненьнем кінуліся за ім. Толік зьявіўся ўвечары да нас у інтэрнат і расказаў, што ўцёк ад іх, — добра, на могілках на Радаўніцу тады было шмат людзей, і ён, пераседзеўшы за адной з магілак, выбраўся незаўважаным.

Увесну 1985-га прыйшла мая чарга ісьці ў войска на паўтара году. Вярнуўшыся ў Менск увосень 1986 г., я ўбачыў, што Толік ужо асвойтаўся ў Менску, пазнаёміўся шмат з кім зь беларускіх культурных дзеячаў, фатографаў, мастакоў, моладзевых нацыянальных актывістаў. Алег Бембель, Алег Мінкін, Анатоль Кляшчук, Аляксей Марачкін — гэты шэраг неардынарных асоб можна было б працягваць і працягваць. Знаёмствам спрыяла ягоная праца. Цягаючы драты — іншага яму не прапаноўвалі — за камэрамі і асьвятляльнымі лямпамі, ён меў шмат часу, каб пагаманіць і пазнаёміцца зь цікавымі для яго людзьмі. Сытуацыя ў грамадстве пачала мяняцца, гарбачоўская перабудова надала нам рэальнага імпэту і аптымізму. Зьявілася магчымасьць для легальнай працы, прапаганды беларускіх ідэй. Пачала пераглядацца ў аб’ектыўны бок беларуская гісторыя, зьявіліся ў друку забароненыя доўгія гады літаратурныя творы.



АРХІЎ А. БЯЛЯЦКАГА

**Анатоль Сыс з кніжкай — нават у войску. Польшча. Легніца. Пантонны батальён. 1983 год.**



АРХІЎ А. БЯЛЯЦКАГА

**Анатоль Сыс на паседжаньні таварыства «Тутэйшыя». 1987 год.**

Назвы, дарэчы, для сваіх «маналёгаў» Сыс даваў адвольна, за старасьвеччынай маскуючы сучасны зьмест.

### Маналёг Апанаса Філіповіча

У гэтай краіне ня маю я дому,  
Вось воблака — сяду і ў сьвет палячу.  
Над гэтай гаморай, над гэтым садомам,  
Ні грошай, ні славы — я волі хачу.

У гэтай краіне ня маю я долі,  
Вось посах і торба і сотні дарог.  
Па долю пайду. Не вярнуся ніколі.  
Няхай мяне судзяць хоць людзі, хоць Бог.

У гэтай краіне ня маю я Бога,  
Ушчэнт разапселі яго сьвятары:  
Дзе церні павінны насіць — носяць рогі.  
Які ж тагды бог, калі служкі зьвяры?

У гэтай краіне ня маю я роду,  
Забыўся народ мой найменьне дзядоў,  
І сьвету ня бачыць далей азяроду,  
І дзецям ня дорыць на шчасьце падкоў.

У гэтай краіне ня маю я песьні,  
Якая б народнай была і маёй,  
Якую б сябрына запела ў Бярэсьці,  
А рэха ўзышло за Дняпром і Дзьвіной…

У гэтай краіне ня маю я дому,  
Вось воблака — сяду і ў сьвет палячу.  
Над гэтай гаморай, над гэтым садомам  
Ні грошай, ні славы — я волі хачу,

Бо ў гэтай краіне ня маю я волі…



**Апошні прыжыцьцёвы здымак.**

Павевы волі пасьля доўгага перыяду задушша і застою п’янілі нам галовы. Была спроба далучыць Анатоля да падпольнай дзейнасьці, якую тады праводзілі мы па меры сваіх магчымасьцяў. Я расказаў яму пра нашу групу, у якую ўваходзілі Вячорка, Суша, Івашкевіч, Дубавец ды іншыя, расказаў пра мэты і задачы. Цяпер ідэя незалежнасьці Беларусі, яе дэсаветызацыі не была такой недасяжнай. Ён пагадзіўся працаваць, удзельнічаў у некалькіх зборках, здаваў складкі, штомесячна па пяць рублёў, але далей справа не пайшла. Падпольная праца патрабавала скрытнасьці і канспірацыі, а Толікава паэтычная імпульсіўнасьць і шчырасьць маглі нашкодзіць і яму, і ўсім нам, таму было вырашана глыбей яго ня ўцягваць, шчыльна працуючы разам у легальным полі. Тым больш што мы разумелі: ягоны паэтычны талент, тыя тэмы, на якія ён пісаў, тыя праблемы, якія ён ставіў у сваіх вершах, ягоныя прамоўніцкія здольнасьці, здольнасьці пераконваць і ўплываць на людзей ужо маглі быць рэалізаваны адкрыта і легальна зь вялізнай карысьцю для Бацькаўшчыны. Ён жыў Беларусьсю і дзеля Беларусі, а што яшчэ трэба было?

У кастрычніку—лістападзе 1986-га на чарговай нарадзе Міктарату, як мы называлі свае патаемныя зборкі, было прынята абавязковае для выкананьня рашэньне максымальна разьвіваць легальныя мэтады працы ў грамадстве праз стварэньне «нефармальных», як іх называлі, арганізацый. А ў сьнежні 1986 г. у інтэрнатаўскім пакоі Анатоля Сыса на Авангарднай упершыню сабраліся шэсьць маладых літаратараў, якія запачаткавалі Таварыства маладых літаратараў «Тутэйшыя», якое адыграла значную ролю ў творчым і дэмакратычным жыцьці Беларусі напрыканцы 1980-х.

Як пазьней высьветлілася, адзін з нашай шасьцёркі яшчэ раней быў завэрбаваны КДБ, але ўжо нішто не магло спыніць моладзевага руху і тых грандыёзных перамен у гісторыі Беларусі, якія неўзабаве надышлі, да чаго мы таксама, наколькі маглі, прыкладалі свае намаганьні. Бліскучая роля ў тагачасным моладзевым нацыянальным руху належала Анатолю Сысу. Больш падрабязна я напішу пра гэта пазьней. Жыцьцё «Тутэйшых», літаратурныя вечарыны, удзел у розных «нефармальных» імпрэзах, узьняцьце на шчыт у сваёй творчасьці нацыянальнай ідэі — усё гэта натхняла ня толькі Анатоля, але і тых людзей, зь якімі ён кантактаваў. Эпоха зьмен нараджае вялікіх творцаў. Трагедыя гэтай эпохі становіцца часта і іхняй асабістай трагедыяй.

**Алесь Бяляцкі**

*Паводле часопісу «Асамблея»*

# З прысмакам параноі

— кажа **Томас Венцлава** пра беларускую сытуацыю. Але беларуская апазыцыя мусіць паступова гадаваць свой народ, ператвараць яго ў нацыю.

Пра Беларусь мы ведаем няшмат. Нават яе імя ў нашым друку не ўсталявалася — часта яе называюць «Гудзія». Беларусы разумеюцца як адсталыя, нацыянальна безаблічныя, савецізаваныя людзі, якія ад часоў сярэднявечча не спазналі нічога, апрача рабства. Рэдка ўспамінаем іх сьмеласьць і стойкасьць, праяўленыя ў часы паўстаньняў XIX ст. і ў апошняй вайне. Наша няведаньне і незацікаўленасьць зьяўляюцца парадаксальнымі, бо нас злучае (праўда, цяпер падзяляе) даўжэйшая мяжа, чым зь іншымі суседзямі, і агульная гісторыя, якая цягнулася многія стагоддзі.

Сёй-той злуецца, што нацыянальна сьвядомыя беларусы лічаць сябе сапраўднымі спадкаемцамі Вялікага Княства Літоўскага, але гістарычныя вузлы тут цяжка разблытаць: Канстанцін Астроскі ці Леў Сапега сапраўды былі русінамі, то бок продкамі беларусаў. Беларускае нацыянальнае адраджэньне было вельмі шчыльна зьвязанае з нашым, была думка і пра агульную дзяржаву (пародыяй на яе стаў «Літбел» Вінцаса Капсукаса). У незалежнай Літве некаторы час існавала Міністэрства беларускіх справаў. Закрытая мяжа паміж Вільняй і Ашмянамі або Гарадняй зьявілася толькі апошнім часам — сотні гадоў яе не было. Пачуцьцё супольнасьці канчаткова зьнікла толькі ў савецкія часы, калі праявіліся сымпатыі да латышоў і эстонцаў, а беларусы ў Балтыйскую садружнасьць ужо не ўмясьціліся.



**Томас Венцлава** (нар. 1937) — літоўскі паэт. У 1977–м быў высланы з СССР. Выкладае славянскія мовы і літаратуры ў Ельскім унівэрсытэце (ЗША).

Таму Літва, я б сказаў, гістарычна адказная за Беларусь — больш за іншыя краіны. Не дарма наш і беларускі гербы да эпохі Лукашэнкі былі аднолькавыя — такія рэчы ў сьвеце здараюцца рэдка.

Сёньня ў Беларусі, як нам вядома, камічная паўсавецкая дыктатура. У ёй нават больш, чым у Расеі, захаваліся эканоміка і ідэалёгія тых часоў з прысмакам прымітыўнага нацыяналізму ды параноі. Сцьвярджаецца, што Аляксандра Лукашэнку падтрымліваюць 80% насельніцтва, хоць гэта, хутчэй за ўсё, міт. Так ці інакш, ён любімы многімі, як усе папулісты: гуляе ў хакей, публічна лае сваіх чыноўнікаў. Але яго нэрвовыя паводзіны апошняга часу сьведчаць, што ён не адчувае сябе ўпэўнена.

Пашырана меркаваньне, што Расея сёньня альбо заўтра праглыне Беларусь. На маю думку, гэта таксама міт. Пра аб'яднаньне гаворыцца колькі гадоў, але рэальна яно не набліжаецца. Лукашэнка зусім ня хоча стаць шараговым расейскім губэрнатарам. Яшчэ больш важна тое, што аб'яднаньне дадасьць Расеі невырашальных праблем, якіх ёй і так не бракуе… Непакояцца, што беларуская мова можа зьнікнуць, але нават і гэта ня стала б катастрофай. Аўстрыйцы размаўляюць па-нямецку, а ірляндцы — па-ангельску, але іх краіны не зьяўляюцца ні Нямеччынай, ні Ангельшчынай. З другога боку, трэба сказаць, што беларуская мова трымаецца лепш, чым мы думаем: для інтэлігенцыі і моладзі яна стала справай прэстыжу і нават моды. Парадаксальна, але ўжо вырасла пакаленьне беларусаў, якія зь дзяцінства разумеюць Беларусь як асобную дзяржаву.

Згодны з тымі, хто гаворыць, што найгоршай палітыкай у дачыненьні да Беларусі была б яе ізаляцыя — эскаляцыя канфлікту і гэтак далей. Напрыклад, трэба зразумець неспакой Беларусі пра нашы сховішчы ядзерных адкідаў — яна, так ці інакш, перажыла Чарнобыль. Трэба думаць і пра літоўскую грамаду ў Беларусі: яе становішча на сёньняшні момант прымальнае, але ўжо ёсьць пагрозьлівыя сыгналы таго, што яна, як і ў шмат разоў большая грамада палякаў, можа стаць закладніцай Лукашэнкі. Эканамічныя сувязі, кантакты зь дзеячамі культуры і моладзьдзю (якая пакрысе вэстэрнізуецца), нарэшце, больш жвавы турызм у Нарачанскі ці Наваградзкі край нам пэўна не пашкодзяць, а беларуская сыстэма захістаецца, як гэта здарылася з намі ў пэрыяд акупацыі. З другога боку, важна арганізаваць сетку дапамогі беларусам — такую, якую Захад і эміграцыя арганізавалі для нас яшчэ да «Саюдысу»: заахвочваць незалежную беларускую культуру, падтрымліваць пацярпелых. Гэта маюць рабіць грамадзкія арганізацыі, якія пры неабходнасьці не пазьбягалі б і неафіцыйных шляхоў. У сваю чаргу, беларуская апазыцыя мусіць паступова гадаваць свой народ, ператвараць яго ў нацыю, і ня толькі ў Менску.

Сілы Лукашэнкі і апазыцыі выглядаюць няроўнымі, але гэта можа быць аптычным падманам. Беларусы маюць адну супольную зь літоўцамі рысу: яны марудныя, але могуць зьмяніцца за некалькі дзён. І гэтая перамена можа адбыцца нават больш удала, чым ва Ўкраіне, бо Беларусь меншая і больш маналітная за яе краіна.

**Зь літоўскай пераклаў Андранік Антанян**

*Гэты тэкст Томаса Венцлавы прагучаў у штодзённай аналітычнай праграме «Savaitės kometrai» Літоўскага радыё (www.lrt.lt) 29 верасьня.*

## АГП папраўляе «НН»

У апошнім нумары газэты «Наша Ніва» сьцьвярджаецца, што Аб'яднаная грамадзянская партыя «патрабавала паставіць дзейнасьць штабу адзінага кандыдата пад кантроль органаў, створаных Кангрэсам». Ці так гэта насамрэч?

Камэнтуе сытуацыю намесьнік старшыні АГП Яраслаў Раманчук:

— Пытаньне пра які–небудзь кантроль за дзейнасьцю штабу адзінага кандыдата ніколі не ўздымалася і не абмяркоўвалася ні на адным пасяджэньні «дзясяткі» і не адлюстравана ні ў адным праекце дакумэнту. Гэта суцэльная выдумка з дамешкам галюцынацый. Усе аднадушныя, што штаб павінен браць сабе столькі паўнамоцтваў, колькі неабходна для пасьпяховай выбарчай кампаніі, гэта значыць для перамогі. Наша прапанова зрабіць Кангрэс пастаянна дзейным, найвышэйшым прадстаўнічым органам усіх прыхільнікаў зьмен ніякім чынам не перасякаецца з работай штабу па правядзеньні выбарчай кампаніі.

**Прэс-служба АГП**

## Зьміцер Дашкевіч папраўляе

У «НН» №37 ў артыкуле «Магу — сказаў Мілінкевіч» пішацца, што Зьміцер Дашкевіч на Цэнтральнай Радзе Маладога Фронту галасаваў за Лябедзьку, а на Кангрэсе падтрымаў Мілінкевіча. Хачу патлумачыць: на Цэнтральнай Радзе я, як і мой паплечнік, сустаршыня Маладога Фронту Сяржук Бахун, падчас рэйтынгавага галасаваньня аддаваў голас і Лябедзьку, і Мілінкевічу. У выніку гэтага галасаваньня з 17 прадстаўнікоў Цэнтральнай Рады Мілінкевіч атрымаў 17 галасоў, Лябедзька — 6.

Па–другое, я, як сустаршыня Маладога Фронту, у сваім выступе, дзе зазначыў, што Малады Фронт падтрымае любога кандыдата апроч камуніста, выказваў ня ўласную пазыцыю, а рашэньне зьезду Маладога Фронту. Гэтым рашэньнем Малады Фронт выказаў сваё стаўленьне да палітычнае кампаніі 2006 году: НЯ СУПРАЦЬ Лукашэнкі, а ЗА Незалежную, дэмакратычную Беларусь! За Хрысьціянскае адраджэньне Бацькаўшчыны!

**Зьміцер Дашкевіч**

## УДАКЛАДНЕНЬНЕ

У панядзелак у рэдакцыю патэлефанавалі зь Вярхоўнага суду, каб унесьці ўдакладненьні ў артыкул «Лішкі бранятанкавай прадукцыі» («НН»№37). Замест фразы «З кожнага будзе спагнана 529 млн рублёў на карысьць 140–га танкарамонтнага заводу» трэба чытаць «З Сакача і Дземяшкевіча будзе спагнана 529 млн рублёў на карысьць 140–га танкарамонтнага заводу». Замест фразы «Пасьля паўгадзіннага абмеркаваньня судзьдзя Валеры Цалко пастанавіў не задавальняць скаргі» трэба чытаць «Пасьля паўгадзіннага абмеркаваньня суд пастанавіў не задавальняць скаргі». Дзякуй за ўдакладненьні.

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

Наш адрас:
а/с 537, 220050, Менск.
e-mail: nn@promedia.by.
Факс: (017) 284-73-29.

**Кампанія за беларускую мову «Нямецкай хвалі» дае плён: радыёстанцыя заявіла, што вяшчаньне стане дзьвюхмоўным «у сярэднетэрміновай пэрспэктыве». Раней гаворка была пра «доўгатэрміновую пэрспэктыву».**

**Справа важная: прыняўшы рашэньне аб расейскай мове 30-хвілінных перадачаў «Нямецкай хвалі», эўрапейская дыпляматыя сымбалічна перадала Беларусь у зону расейскага ўплыву. Але бура пратэстаў у Беларусі прымусіла Брусэль і Бэрлін задумацца над адэкватнасьцю ўласнага бачаньня беларускай сытуацыі.**

**Тым часам у Таварыства беларускай мовы працягваюць паступаць лісты. Зварот да надзвычайнага і паўнамоцнага пасла ФРГ у Беларусі сп. Марціна Хэкера з прапановай, каб беларуская праграма «Нямецкай хвалі» выходзіла па-беларуску, а не па-расейску, падпісалі:**

Яўген Скрабутан (студэнт, якога выключылі з унівэрсытэту за графіці «Спыніць русіфікацыю»), Павал Красоўскі, лідэр жодзінскае моладзі, Мікалай Калінін, лідэр цыганскае супольнасьці, Андрэй Петравых, ад згуртаваньня праваслаўнай моладзі, Міхась Карэнда, Яўген Таціла, Алеся Пятух, Вольга Гінзбург, Аліна Стрыца, Валеры Стрыца, Алёна Леванкова, Яўген Лемеш, Тацяна Куўшынкава, Вольга Рымша, Вера Рымша, Юля Масьцілоўская, Натальля Масьцілоўская, Аляксей Лазарчык, Вячаслаў Шэйнас, А.Палей, А.Фалей, А.Тамко, М.Фалей, А.Бабко, Т.Костыр, М.Падывалаў, І.Шарасі, А.Петракова, А.Кур'ян, Вольга Каралёва, Таіса Цыганкова, Ніна Прэснакова, Юры Радзымоўскі, Міхаіл Карнееў, Сьвятлана Вяргейчык, Уладзімер Гук, Ганна Гук, Натальля Хоміч, Уладзімер Сідарэвіч, Аляксандар Навумчык, Юры Валах, Алена Завацкая, Іна Разжаравец, Алена Селюжыцкая, Натальля Пекун, Іна Радзько, Яніна Барысевіч, Натальля Сідарэвіч, Аркадзь Блінкоўскі, Яня Блінкоўская, Людміла Талызіна, Тамара Кармінская, Пётар Карасюк, Леанід Крот, Надзея Крот, Васіль Салажэнік, В.Мехаль, О.Сяргейчык, Вера Шкмеева, Іван Шкмееў, Сьвятлана Куцікава, Натальля Хлюдзінская, Вольга Кабяк, Натальля Ціканові, Андрэй Жураўлёў, Алеся Шлыкава, Вера Балакірава, Іна Кудравец, Уладзімер Гоўша, Юры Занцэвіч, Аляксандар Сідарэнка, Ірына Сідарэнка, Віктар Сасіновіч, Мікалай Севярцаў, Тамара Зьверава, Тацяна Малашчанка, Алег Малашчанка, Мікола Жыляк, Вераніка Кучур, Павал Міхадзюк, Дзьмітры Міраў, Валянціна Зянішына, Яўген Анупін, Дзьмітры Кутко, Мікіта Бяспалаў, Віталь Кутко, Юры Шукала, А.Жудро, У.Ткачэнка, Натальля Анціпіна, Вадзім Поклад, А.Сельвіч, П.Урублеўскі, Ю.Ляўчук, Ю.Аўгусьціновіч, Г.Бадак, Воўча Лазарчык, Зьмітрок Веліч, Кацярына Веліч, Алена Лелес, Вікторыя Лелес, Дар'я Бяспалава, Сяргей Кулак, Максім Івашка, Тацяна Бурэц, Уладзімер Каўзевіч, Мілана Мазайла, Н.Аўгусьціновіч, Сяргей Шчарбук, Мікалай Гранік, Алесь Цялюк, Алег Кудраўчык, Генадзь Швед, Сяргей Паляшчук, Станіслаў Вайтулевіч, Алесь Лабко, Валянціна Лапато, Алена Бубен, Сьвятлана Аўтуховіч, Лілія Шлынс, Натальля Верамейчык, Марына Альелішка, Васіль Дуброўка, Натальля Салавей, Алена Пярозка, Уладзімер Станкевіч, Леанід Бадун, Іван Пагасей, Валер Вінюк, Віктар Радзіяковіч, Мікалай Гіз, Валянцін Палешын, Уладзімер Таўкач, Міхаіл Андросік, Іван Коўчар, Віктар Скок, Уладзімер Кулдыкоў, Уладзімер Астаповіч, Віталь Кадыка, Аляксандар Бернат, Фэлікс Грынцэвіч, Віталь Тамашэвіч, В.Дупяк, Вольга Ракіцкая, Аляксандар Піньнік, Яўген Скок, Валянцін Скок, Андрэй Калясінскі, Сьвятлана Скок, Вячаслаў Амялішка, Іван Кантор, Мікалай Міхадзюк, Міхась Бернат, М.Лысюк, Раіса Скок, Надзея Калясінская, Васіль Бойка, Генадзь Чэрап, Васіль Стрэльчык, Эдуард Сьцяпура, Віктар Януш, Дзьмітры Барсук, Віктар Кораб, Тацяна Вядмедзік, Іван Лабко, Валер Зяленскі, А.Талысевіч, Алесь Ганчарык, Павал Кумейша, Тамара Касьпер, Алена Пісарэнка, Станіслаў Шустал, Вольга Вярэніч, Андрэй Вярэніч, Сьвятлана Бартніцкая, Юлія Несьцяровіч, Вікторыя Касяк, Настасьяя Габрусік, Іна Мохарт, Кацярына Шчэрба, Натальля Шамрыла, Кацярына Крузько, Натальля Сушко, Сяргей Радзевіч, Настасьсся Пукач, Марыя Бароўка, Наста Карлінская, Марына Антылава, Ганна Манкевіч, Аркадзь Манкевіч, Аляксандар Манкевіч, Руслан Гарбачоў, Людміла Гарбачова, Сяргей Паўлюк, Аляксей Белы, Павал Войпаў, Марыя Ясюк, Дзяніс Бычок, Павал Ярашук, Ганна Ярашэвіч, Іван Ярашэвіч, Андрэй Ангурэц, Яня Норкіна, Міхась Станкевіч, Юля Арцюх, Марыя Біза, Пятро Кучура, Уладзімер Ямельчанка, Павал Жукель, Аксана Жаўняк, Віктар Ліс, Вольга Аскерка, Вера Аскерка, Надзея Северцава, Руслан Равяка, Алесь Грыцавец, Віктар Сырыца, Тацяна Сырыца, Алена Дарэўская, Іван Дарэўскі, А.Канапатава, У.Канапатаў, Раіса Сырэй, Іван Сырэй, А.Шамп, Т.Затаўла, А.Зімін, Т.Слуцкая, С.Слуцкі, А.Шніп, Д.Морчык, Н.Янулевіч, Н.Шніп, А.Жукевіч, Ю.Затаўка, В.Стасевіч, М.Жукевіч, Л.Чавусаў, Н.Хацяноўская, Ігар Клімаў, В.Мартыненка, А.Тарасевіч, М.Жадановіч, А.Таболік, А.Пракофіеў, А.Качаноўская, І.Малец, Андрэй Расінскі, Сямён Бародзін, Мікалай Тамашоў, Ганна Бародзіч, Галіна Астаповіч, Тацяна Чучына, Натальля Ерно, Людміла Краснашчок, Мікалай Галох, Алена Шабуля, Вікторыя Бекешка, Ала Шышкавец, Леанід Мінаў, Ігар Сімбіроў, Людміла Саўчэня, Міхась Леньнік, Міхаіл Козел, Георгі Станкевіч, Леў Навуменка, Мячыслаў Сінякевіч, Міхась Таласа, Ірына Анцілеўская, Аляксандар Ахроменка, Уладзімер Паветкін, Аркадзь Губар, Станіслаў Карабан, Ніна Кавалёва, Уладзімер Мішула, Зьміцер Кухлей, Мікалай Горбач, У.Лякоўскі, Л.Косенчык, Іван Шаранговіч, Канстанцін Хіла, Раман Рудкевіч, Натальля Клімовіч, Аляксандар Лаеўскі, Раман Гарадзецкі, Валеры Пазьнякевіч, Ала Убожанка, Валеры Качарго, Васіль Маляёнак, Анатоль Карабейнік, Генадзь Чарняўскі, Ганна Апановіч, Іван Васілевіч, Ганна Лагутка, Вольга Геронік, Ганна Сьлiж, Валянціна Рачыцкая, Валер Маліноўскі, Ганна Чарняўская, Мікалай Карабейнік, Тацяна Тарасенка, Віктар Ірбак, Анатоль Абрамчык, Мікалай Ісьціменка, Людміла Ліцьвінава, Марыя Лянарская, Вольга Забаўская, Ліка Касенюк, У.Глад, К.Бондарава, Алена Асіпцова, Алесь Асіпцоў, Яніна Асіпцова, Ала Афаневіч.

# На вайне як на вайне

ВІТАЛЬ ТАРАС

*Канстытуцыйны суд Гішпаніі пастанавіў, што суды гэтай краіны могуць разглядаць справы аб ваенных злачынствах альбо злачынствах супраць чалавечнасьці незалежна ад таго, хто стаў ахвярай гэтых злачынстваў, і ад таго, дзе яны былі зьдзейсьнены.*
***З газэт***

Мой бацька любіць часам паўтараць: «Далі б мне аўтамат! Я б з усімі гэтымі нягоднікамі не размаўляў бы — паставіў бы да сьценкі і… тра-та-та!» Гаворыцца гэта жартам, але калі ўлічыць партызанскае дзяцінства бацькі, то як бы і не зусім.

Прыходзіць на памяць сучасны анэкдот. Хто ёсьць беларус? Патрыёт. А два беларусы? Партызанскі атрад. Тры? Партызанскі атрад і… здраднік. Таксама нясьмешны нейкі жарт. Дый не да жартаў увогуле. Хто — з маладзейшага нават, «непартызанскага» пакаленьня — ня марыў калі-небудзь узяць у рукі той аўтамат? І не нямецка-фашысцкіх захопнікаў пайсьці страляць, а некаторых сваіх суайчыньнікаў? Лекары кажуць, што гэта ў нас натуральная, прыроджаная агрэсіўнасьць. Але ёсьць амаль у кожнага яшчэ адна мара, нават саладзейшая за аўтамат. Гэта суд. І не вышэйшы, завоблачны нейкі суд, а самы сапраўдны, зямны — з прысяжнымі засядацелямі, судзьдзямі ў чорных мантыях і з буклямі, строгімі ахоўнікамі з аўчаркамі, сумнымі шматтомнымі пратаколамі допытаў ну і, зразумела, лавай падсудных.

## Калі б Чаўшэску быў жывы

Мужа ды жонку Чаўшэску, расстраляных у баязьлівай мітусьні ў нейкім двары ня так ужо й шкада. Асабліва румынам, якім давялося жыць пад яго уладай. Шкада, што не было суду, што не змаглі паглядзець у вочы дыктатару былыя ахвяры. Напрыклад, Юльюс Піліп — рабочы, які насьмеліўся ўвосень 1980-га адправіць з Румыніі прывітальную тэлеграму на адрас польскай «Салідарнасьці». За гэты свой учынак Піліп адседзеў шэсьць з паловай гадоў у вязьніцы, закаваны ў кайданы. Праз 25 гадоў Піліпа вітала воплескамі, стоячы, шматлюдная заля ў Варшаве, дзе праходзіла канфэрэнцыя, прысьвечаная спадчыне «Салідарнасьці». Шкада, што Чаўшэску да гэтага не дажыў. Але нават калі б і дажыў, ці ўбачыў бы нешта? Ці зразумеў, што зьмянілася ў сьвеце за апошнія 15 гадоў?

На той канфэрэнцыі заля авацыямі вітала вядомага праваабаронцу Сяргея Ковалёва, былога вязьня ГУЛАГу, потым — паплечніка Андрэя Сахарава. У Расеі імя Ковалёва сёньня згадваюць у самым нэгатыўным кантэксьце: здраднік, што прадаўся заходнім імпэрыялістам і чачэнскім бандытам.

У Расеі напачатку 1990-х нібыта быў суд над КПСС. Хоць які там суд? Няма чаго ўспомніць. Сярод абаронцаў «гонару й годнасьці» КПСС — ніводнага запамінальнага твару, ніводнага сапраўднага Насфэрату. Судзьдзі сёньня засядаюць у Думе альбо працуюць у Адміністрацыі прэзыдэнта. Суд «над сыстэмай» загадзя быў наканаваны на правал. Судзіць сыстэму не выпадае, як і любую абстракцыю. Судзіць можна толькі людзей — з імёнамі, прозьвішчамі, фактамі біяграфіі. Таксама яны ёсьць у ахвяр. І гэтым — тым, што жылі або выжылі насуперак усяму, — страшныя яны сваім катам і іхнім нашчадкам.

## Нож у сэрцы

Катынь, як і Курапаты, ім як востры нож у сэрцы. Ня хочуць нічога чуць, ня хочуць



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Дакладчык ПАРЭ Хрыстас Пургурыдэс вінаваціць Дзьмітрыя Паўлічэнку ў выкраданьні апанэнтаў Лукашэнкі.**

прызнаваць факты, ня хочуць нават называць лічбы закатаваных. Пра імёны тых, хто расстрэльваў, даваў загады, гаварыць няма чаго — сьцерагуць як зрэнку вока. Лепей за ўсё — зваліць віну на каго-небудзь іншага.

Але калі на ўвесь экран бульдозэр закопвае ў траншэі тысячы трупаў закатаваных вязьняў канцлягеру, тады арганізатары й натхніцелі злачынстваў адварочваюцца, адчуваюць сябе брыдка, але мусяць глядзець, мусяць адказваць на пытаньні, мусяць гаварыць хоць нешта ў адказ.

Але ці адчувалі падсудныя на лаве Нюрнбэрскага трыбуналу згрызоты сумленьня? Юльюс Штрайхэр, адзін з галоўных функцыянэраў Райху, якія адказвалі за вырашэньне «габрэйскага пытаньня», абяцаў трыбуналу, калі яго пакінуць у жывых, верай і праўдай да скону дзён служыць «сусьветнаму габрэйству». Але гэта быў гнюсны псыхалягічны выверт. Ва ўсялякім выпадку, не раскаяньне. «Злачынцы ня хочуць прызнаць сваёй віны» — так называецца кніга польскага публіцыста Караля Малцужыньскага, якому давялося асьвятляць Нюрнбэрскі працэс. Дастаткова паглядзець на тое, як нахабна паводзіць сябе былы прэзыдэнт Югаславіі Слабадан Мілошавіч у гаагскай турме, як бессаромна зацягвае працэс, павучае ды абвінавачвае заходнія дэмакраты, дзякуючы інстытутам якіх ён так утульна ды ўпэўнена адчувае сябе ў зьняволеньні. Усе ягоныя правы як абвінавачванага абаронены, і былы дыктатар ахвотна карыстаецца прынцыпамі міжнароднага права, пры гэтым абвінавачваючы суд у беззаконьні.

## Пакараньне на курорце

Наіўна спадзявацца, што Мілошавіч, ці Хусэйн, ці яшчэ нехта з былых дыктатараў пад цяжарам абвінавачаньняў і фактаў раскаюцца ва ўчыненым. Яны ўсе, падобна да Патрыярха з раману Гарсія Маркеса, служылі толькі свайму народу… Палацы, рахункі ў замежных банках ня трэба згадваць — яны ў сваім служэньні народу заслугоўвалі большага, на іх думку. Суды, міжнароднае права прыдуманы не для таго, каб перавыхоўваць злачынцаў. Для гэтага ёсьць царква, псыхааналіз ды іншыя інстытуты. Пакараньне злачынстваў патрэбна, як гэта ні сьмешна гучыць, не злачынцам, а іх ахвярам. Дзеля таго, каб існавала надзея. Хаця б ейны агеньчык — на тое, што злачынцы будуць пакараныя яшчэ пры жыцьці. І што гэта хоць некалі некага ды стрымае…

Ня так даўно былы эсэсавец Эрых Прыбке, асуджаны на пажыцьцёвае пакараньне за тое, што падчас вайны па яго загадзе былі расстраляныя 335 італьянцаў, быў зьвучна на беразе возера, на віле сябра, таксама эсэсаўца. Выявілася, што дазвол вязьню на адпачынак даў рымскі суд — той самы, які судзіў Прыбке. Фармальна і на віле ў свайго сябра былы эсэсавец знаходзіўся пад «хатнім арыштам» — за вілай назіралі карабінэры. Суд кіраваўся нібыта гуманнымі матывамі. Прыбке споўнілася 92 гады, вось і было вырашана трохі аслабіць рэжым старому. Але як быць з памяцьцю ахвяраў? Гісторыя выклікала абурэньне ва ўсёй Італіі — зразумела, найперш сярод былых удзельнікаў Супраціву. Сам жа Прыбке, калі мерказаць па ягоных інтэрвію, лічыць, што ўжо даўно расплаціўся за «грахі юнацтва». Цяпер можна і на заслужаны адпачынак. А што, былыя чыны НКВД-КГБ на «заслужаныя пэнсіі» думаюць інакш?

Былы чылійскі дыктатар Пінахет, якому споўнілася дзевяноста, напэўна, ня надта разумеў, што зь ім адбываецца, калі яго затрымлівалі. За што яго, заслужанага генэрала, можна судзіць? У 1998 г. гішпанскі судзьдзя Бальтазар Гарсон, які адстойвае прынцып вяршэнства міжнароднага права над нацыянальным заканадаўствам, выдаў ордэр на арышт Пінахета, які ў той час быў у Лёндане. Ангія адмовілася тады выдаць чылійскага генэрала гішпанскаму правасудзьдзю на падставе кепскага стану здароўя Пінахета. Між тым дзякуючы намаганьням Гарсона ў Мадрыд былі дастаўлены некалькі былых афіцэраў, якія спрычыніліся да выкраданьня тысяч людзей у 1970-я гады ў Аргентыне. Адзін з афіцэраў асуджаны на пажыцьцёвае зьняволеньне.

## Справядлівасьць бязь межаў

Цяпер чарга за ваеннымі злачынцамі з Гватэмалы, на сумленьні якіх масавыя забойствы падчас грамадзянскай вайны 1978—1986 г. Ляўрэатка Нобэлеўскай прэміі міру Рыгабэрта Мэнчу, якая не змагла дабіцца справядлівасьці ў сваёй краіне, зьвярнулася ў гішпанскі суд з позвай аб пакараньні ўдзельнікаў нападу на пасольства Гішпаніі ў 1980 г. Падчас яго былі забітыя 37 працаўнікаў гватэмальскага рэжыму, якія спрабавалі схавацца ў дыпмісіі. Канстытуцыйны суд Гішпаніі прызнаў, што «важнейшымі за нацыянальныя інтарэсы ёсьць прынцыпы міжнароднага права й справядлівасьці», таму краіны, якія падпісалі канвэнцыю аб перасьледзе за злачынствы супраць чалавечнасьці, могуць судзіць абвінавачваных у такіх злачынствах незалежна ад таго, дзе яны былі ўчынены.

Усё гэта гучыць у Беларусі як нейкая прыгожая казка, зусім далёкая ад рэчаіснасьці, як нейкая фантастычная мара. Што значыць для амонаўца, які ударыў жонку зьніклага журналіста, а потым яшчэ й выйграў у судзе маральную кампэнсацыю ў сваёй ахвяры, міжнароднае права й прынцыпы справядлівасьці? Ці чуў ён калі-небудзь у сваім жыцьці гэтыя словы? Што тым людзям, якія выкрадалі Захаранку, Ганчара, Красоўскага або прыкрывалі выкрадальнікаў, да дзясяткаў тысяч зьніклых у Гватэмале? Ім цяжка вымавіць імя кіпрыёта Хрыстаса Пургурыдэса, які займаецца расьсьледаваньнем зьнікненьняў палітычных апанэнтаў рэжыму ў Беларусі, а словазлучэньне «Парлямэнцкая асамблея Рады Эўропы» наўрад ці ўвогуле нешта ім гаворыць.

Ёсьць, праўда, іншая катэгорыя людзей. Яны з усьмешкай на вуснах растлумачаць вам усё пра палітыку «двайных стандартаў». Пра тое, што ў Гішпаніі ўсё яшчэ ня знойдзены ўсе ўдзельнікі страшных тэрактаў на вакзале ў Мадрыдзе. Што гішпанская паліцыя бесчалавечна абышлася зь нелегальнымі імігрантамі-афрыканцамі. Што ў Іраку гінуць і зьнікаюць штодня дзясяткі людзей. Што ўмовы ўтрыманьні вязьняў у Гуантанама невыносныя, а ў Амэрыцы ад ураганаў гінуць нэгры. Што тысячы людзей зьнікаюць штодня ў розных кутках сьвету. А гэта значыць, што Беларусь для гэтых спадароў, якія любяць усё тлумачыць, таксама ўсяго «нейкі кутох», дзе жывуць тубыльцы. Праўда, асабліва спрытным зь іх дазваляюць ньбдлага карміцца і нават займаць некаторыя пасады. І за гэта трэба быць удзячнымі ўладзе. А каго звольнілі ці адправілі на хімію за «паклёп» — туды ім і дарога. Судзіць за гэта нельга. Але памятаць будуць. І хай спадарства паспрабуе нешта растлумачыць наконт двайных стандартаў і двайной маралі сваім дзецям…

## Суд ідзе…

Гэты фэномэн вядомы ды апісаны ў літаратуры, у тым ліку айчыннай, не аднойчы. Людзі, якія падчас вайны праяўлялі дзівосы сьмеласьці, якія не згіналіся пад кулямі, пасьля вайны зноў ператвараліся ў звычайных людзей. Яны зноў, як некалі, пачыналі баяцца выступіць на сходзе, запярэчыць начальніку, сказаць праўду. Мабыць, адна з прычын такіх паводзін была даволі простай. На вайне не было чаго губляць — акрамя ўласнага жыцьця. Пасьля ў людзей зьявіўся хоць і прымітыўны, але дабрабыт. Пакойчык у камунальнай кватэры, сякаятакая зарплата, на якую можна пракарміць сямʼю, бясплатныя школьныя сьнеданкі.

Зь цягам часу жыцьцёвыя стандарты вырасьлі. Сёньня можна і катэдж пабудаваць, і дзяцей у элітную школу ўладкаваць. Адно засталося нязьменнае. У мірным жыцьці ня тое што праявіць сябе героем — проста зьдзейсьніць мужны ўчынак неймаверна складана.

Ці можна абвінавачваць у гэтым людзей? Ці варта шкадаваць аб тым, што вайна скончылася 60 гадоў таму і няма ў руках аўтамата? Не ў лясах і не на вуліцах ідзе сёньня вайна — яна ў галовах і сэрцах людзей. І чым меншая тэрыторыя сэрца застаецца вольнай і незалежнай, не захопленай хамскай уладай, тым больш жорсткім і адчайным робіцца змаганьне. Бо няма іншага выйсьця.

Суд над злачынцамі паводле міжнародных працэдур застаецца далёкай марай. Але судзіць паводле законаў сумленьня не забаронена нікому. І таму яны ўжо сёньня асуджаныя. Яны прайгралі працэс, нават калі сёньня яны яшчэ на свабодзе і марацьзакаваць нас у кайданкі.

# Поліўка

Афіцыёзна–сталоўская назва — «першая страва». Нэўтральная — «суп». Колісь жа ў нас называлі гэтую страву поліўкай. Піша **Алесь Белы**.

Колісь беларусы поліўкамі называлі ўсе супы, апрача тых, што мелі адметныя назвы: боршч, капуста й г.д. Зрэшты, нават самі поліўкі мелі розныя назвы. Так, поліўка зь піва называлася граматкай, з гусінае ці сьвіное крыві — чорнай поліўкай. Звыклае нам сёньня слова «суп», запазычанае праз нямецкую, прыйшло ў Беларусь толькі ў XVIII ст. і ўжывалася найперш паміж прывілеяваных пластоў грамадзтва.

Найдаўжэй назва «поліўка» затрымалася ў сялянскім асяродзьдзі: панскі «суп» тут прыжываўся цяжка. Дый што казаць, калі нават яшчэ на мяжы XIX—XX ст. сяляне гатавалі поліўку: сьпярша закідалі варыцца мяса з прыправамі (у посныя дні — грыбы, рыбу), потым невялікую колькасьць мукі разводзілі вадой і залівалі ў гаршчок (часам закалочвалі сухую муку), далівалі хлебным квасам або сыроваткай, бурачным расолам. У некаторых раёнах у поліўку дадавалі хлебную рошчыну.





**Алесь Белы** (нар. у 1968 у Менску) — дасьледчык гісторыі матэрыяльнай культуры. Сябар рэдкалегіі часопісу «Спадчына». Ляўрэат прэміі Беларускага ПЭН–цэнтру імя Ф.Багушэвіча 2001 г.

## Замяшанае на крыві

Гэтую страву згадвае Адам Міцкевіч у паэме «Пан Тадэвуш»: Яцак Сапліца атрымаў чорную поліўку як знак адмовы пры няўдалым жаніхоўстве. Цяпер мы б сказалі — «атрымаў гарбуза». Адсюль бачым, што колішняя шляхта не разьменьвалася на садавіну, а гатавала адмысловую страву.

Чорная поліўка — густая страва са сьвіное (а часьцей з гусінае ці качынае) крыві — здавён вядомая многім эўрапейскім народам. Гусіную ды качыную поліўку варылі з костак і вантробаў, сьвежай крыві (каб кроў не загусла, у яе дадавалі крыху солі або воцату), загушчалі мукой або цёртай булкай. Для лепшага смаку ў страву дадавалі сушаныя сьлівы, яблыкі або спэцы (перац, карыцу, гвазьдзікі). Падавалі яе з нарэзанымі птушынымі вантробамі, варанымі лазанкамі, клёцкамі і г.д.

## Граматка

Посная поліўка зь піва — граматка (яна ж фарамушка, ці бярмушка) — на працягу доўгіх стагодзьдзяў была абавязковай стравай шляхецкага сьняданьня. Граматку, запраўленую сырымі яечнымі жаўткамі, а таксама сьмятанай, тварагом ды living рознымі спэцыямі (кменам, карыцай, цукрам), было прынята есьці з грэнкамі. Сьцьвярджаюць, што вялікім аматарам гэтага віду поліўкі, асабліва падчас посту, быў кароль і вялікі князь Жыгімонт Стары.

Для шляхты доўгі час граматка (ці нават проста піва, падагрэтае, з кавалкамі чэрствага хлеба ці тварагом) была ня толькі стравай, але і ўнівэрсальным «дэсэртам», які замяняў за шляхецкім сталом каву й гарбату. Гэтыя напоі сталі выцясьняць граматку толькі з XVII ст., але яшчэ і ў XIX ст. «граматка» карысталася вялікай папулярнасьцю.

### Поліўка беларуская

**50 г жытняга хлеба,
25 г сушаных грыбоў,
1 морква, 1 цыбуліна,
1 ст. лыжка тлушчу,
1 ч. лыжка тамату-пюрэ, 1,2 л мяснога булёну,
0,5 шклянкі сьмятаны, соль.**

Загадзя замочаныя грыбы адварыць, булён працадзіць праз складзеную ўдвая тканіну, грыбы нашаткаваць. Жытні хлеб нарэзаць лустачкамі, падсушыць у духоўцы, зьмяльчыць, заліць невялікай колькасьцю гарачага булёну, накрыць, пачакаць, пакуль астыне. Пасьля гэтага хлебную масу працерці праз сіта, зьмяшаць з рэштай мяснога булёну, уліць грыбны адвар. Абсмажыць на тлушчы дробна парэзаныя моркву і цыбулю разам з таматам–пюрэ, пакласьці ў булён, які кіпіць. Дадаць падрыхтаваныя грыбы, соль, варыць 7—10 хвілін. Падаць поліўку са сьмятанай.

# «Пузата хата» ды «сьвінячэ пляцкі» зь вішнёвага сшытка

У кожнага застаюцца свае водары дзяцінства. Я ж на ўсё жыцьцё вынесла водар з бабулінай каморы... Піша **Наталка Харытанюк**.

Гэта была найсаладзейшая казка майго маленства. За тыдзень перад сьвятам бабуля пачынала складваць у камору ўсё печанае, і, калі мы прыяжджалі, там стаяў той чароўны водар, які паланіў дзіцячыя душы і ў якім надоўга маглі заблукаць небажаты, што зьбіраліся ў вёсцы на сьвята…

Я першай бегла ў камору і сасьмяглымі вочкамі ўбірала ў сябе ўсе фантастычныя вулканы тартоў з узьбітымі вяршкамі, дзе патаналі ягады, удыхала самы салодкі водар макавых пірагоў, у якіх абавязкова была праслойка зь бялюткім-бялюткім тварагом, ды, вядома, прыгашчалася цестачкамі, ажно пакуль хто-небудзь з дарослых мяне адтуль не выцягваў. Але ж найулюбёнейшым заняткам было церціся побач з бабуляю, калі яна пякла, ды нібыта дапамагаць ёй.



**Наталка Харытанюк** — студэнтка, жыве ў Берасьці.

Перабіраючы надоечы рэцэпты ад бабулі ў сшытку вішнёвага колеру, я знайшла «пузату хату», і ў мяне, як у Тараса Бульбы, аж сьлінкі пацяклі ды забурчала ў жываце… Гэта быў мой любімы торт у дзяцінстве, бо яго было весялей за ўсё пячы. «Пузату хату» трэба было будаваць зь «бярвёнаў», выдумляючы свае ўзоры, самастойна вырашаючы, колькі ў хаце будзе пакояў, дзе будзе ганак і якім будзе дах.

Калі ў вас ёсьць дзеці, гэта, пэўна, стане для вас самым займальным рэцэптам. Зрэшты, будаваць хату любіць ня толькі малеча, але й дарослыя. Тым больш у Беларусі, дзе, закладзеная генэтычна, гэтая прага стварыць свой дом так часта растоптвалася.

Вось, калі ласка, і стары рэцэпт для вашай хаты. Як казала бабуля, «хай ваша хата тэж будэ пузата!».

**Цеста:** 250 г маргарыну, 2 жаўткі, 4 шклянкі мукі, 1 чайная лыжка гашанай соды, 250 г сьмятаны. Цеста трэба падзяліць на 16 частак і паставіць у холад на 2 гадзіны.

**Начынка:** 650 г чарнасьліву, разынкі, цёртыя яблыкі, курага, 1 шклянка грэцкіх арэхаў, 1 шклянка цукру.

**Крэм:** 1 літар сьмятаны ўзьбіць з 1 шклянкай цукру, дабавіўшы лімонны кіслаты.

Раскачаўшы каржы, я кладу ў іх начынку ды скручваю «бярвёнамі». Са сьпечаных бярвёнаў, змазаных кіслым варэньнем, выкладваю хатку ды заліваю яе белым крэмам.

Мадэрнізаваны варыянт «пузатай хаты» патрабуе яшчэ й шакаладных плям на даху. Дый начынку таксама можна прыдумляць любую: бабуля клала часам «п'яную вішню», трускалкі ды сьвежыя абрыкосы. Выходзіць смачна… Уявіце, які стракаты зрэз з такой хаты!

Наш тоўсты сшытак вішнёвага колеру, у якім запісаны бабчыны рэцэпты, — сапраўдная крыніца тэрапіі. Гатуючы старыя бабуліны стравы, супакойваесься, пачынаеш бачыць вечнае ў штодзённым і малым, адыходзіш ад думак пра марнасьць. Нават гатаваць для гэтага неабавязкова — дастаткова пачытаць назвы страў. У іх схаваная свая філязофія.

Адна з гэтых назваў калісьці адыграла канчатковую ролю ў маіх адносінах з адным хлопцам.

Сяргей быў надта ўжо змрочным дзецюком. Аднойчы ён патэлефанаваў, каб запрасіць мяне на шпацыр. Адной рукой я трымала слухаўку, а другой даставала бляху зь печкі. Я пякла вялізны пірог па старым бабуліным рэцэпце, і ў гэты момант бляха ледзьве ня высьлізнула на падлогу. Пачуўшы грукат, Сяргей спытаў, што пяку. Тлумачыць, што назву пірага прыдумалі мае вясёлыя прапрабабулі і што назва сама па сабе вельмі вясёлая, не хацелася. Я проста сказала:

— Сьвінячэ пляцкі.

— Чаго?

— Сьвінячэ пляцкі…

Сяргей як быццам абразіўся і, нічога ня кажучы, паклаў слухаўку…

А дарма. Назва ў пірага вельмі нават лягічная: «пляцкі» — бо каржы ня трэба раскочваць, дастаткова іх рукамі расьцягнуць і кінуць на бляху. Чым ня пляцкі?

А «сьвінячыя» яны, бо ў цеста трэба класьці смалец («сьвінячы» тлушч). Дужа смачна. Хоць і складана. Ды, урэшце, паспрабуйце самі — вось рэцэпт:

Для цеста бярэцца паўлітра смальцу, паўлітра сьмятаны, паўлітра цукру, 1 ст. лыжка амоніку (ці парашку для печыва), дадаецца столькі ж мукі, як на варэнікі (цеста мусіць быць мяккім). Каржы трэба раскачаць тонкімі пластамі і выпякаць.

Для крэму варыцца манная каша (на 3 ст. лыжкі крупы — 2 шклянкі малака). Калі каша астыне, трэба ўзьбіць яе з 200 г масла, дабавіўшы цукар і лімонную кіслату на свой густ.

Асабліва добра «сьвінячэ пляцкі» ідуць з моцнай кавай… ды ў кампаніі файнага хлопца, якога не напалохае назва пірага.




PHOTO.BYMEDIA.NET

# Зомбі сапраўды існуюць

«Зомбі!» — «Сам зомбі!» — звычайны дыялёг палітычных апанэнтаў у Беларусі. Між тым зомбі — не прыдумка, а рэальнасьць XXI стагодзьдзя. Піша **Андрэй Расінскі**.

Адна за адной на кінаэкраны выходзяць карціны з жывымі трупамі: «Праз 28 дзён», «Прытулак зла», «Зямля мёртвых». Кінакампаніі з імпэтам распрацоўваюць залатую жылу. Замежныя газэты прысьвячаюць рэдакцыйныя артыкулы зомбі-буму. Што стаіць за апошняй атакай зомбі? Якія страхі і комплексы? І чаму слова «зомбі» такое папулярнае ў Беларусі?

## Тайны і страхі зомбі

Жывыя трупы зьяўляліся на экранах здаўна: Жорж Мэльес забаўляўся пякельнымі вобразамі, Абэль Ганс абвінавачваў уладароў сьвету ў кашмарах Першай сусьветнай з дапамогай дывізіі мерцьвякоў. Але паважаны статус зомбі трупы набылі, калі эўрапейцы азнаёміліся з гаіцянскім культам вуду.

Эстэтычны пераварот адбыўся ў 1968 г.: стужка Джорджа Рамэра «Ноч жывых мерцьвякоў» скаланула царства кашмараў. Зомбі ў ім зьяўляліся зь ніадкуль, няма аніякіх магаў і ведзьмакоў, ёсьць проста навала, і купка жывых абараняецца ад арміі памерлых у забарыкадаваным доме. Рамэраўскія «Досьвітак мерцьвякоў» і «Дзень мерцьвякоў» яшчэ больш узмацнілі сарказм і сацыяльную крытыку: людзі-спажыўцы як зомбі.

У XXI ст. вытворчасьць карцін пра зомбі набыла нечуваны размах. «Прытулак зла» каштаваў 35 млн даляраў; «Досьвітак мёртвых» (Зэк Снайдэр, 2004) прынёс 100 млн прыбытку, а знакамітая студыя «Юнівэрсал» фінансавала «Зямлю мёртвых» Джорджа Рамэра. Людзі ратуюцца ўцёкамі, зомбі займаюць гарады. У гэтым бачылі і мэтафару тэрарызму, і Трэці сьвет, які пагражае багатаму Захаду.

Але рэч у тым, што зомбі сапраўды існуюць.

## Тэхналёгіі замбаваньня

У 1950-х у лябараторыях былі распрацаваныя мэтады, якія надавалі жывому рысы зомбі: праграмаванасьць, аўтаматызм, падпарадкаванасьць маніпулятару. У гіпаталямус пацукоў уводзілі электроды — і жывёлы былі згодныя на ўсё, толькі б адчуць стымуляцыю: ня елі, не пілі — і калі была магчымасьць самім раздражняць мозг, даводзілі сябе да зьнясіленьня. Раздражненьне іншых зон выклікала непрыманьне, голад, агрэсію — ці яе спыненьне. Дасьледчык Хасэ Дэльгада выходзіў на арэну ў касьцюме тарэадора. Замест клінка ў навукоўца быў пульт кіраваньня. Націск на кнопку — бык атакуе, націск на іншую — спыняецца. У Інстытуце мозга ў Пецярбургу электроды ўводзілі і ў мозг людзей (афіцыйна — для лячэньня эпілепсіі). Але паводзіны людзей не былі падобныя на «эмоцыі» зомбі. Сёньня брутальныя электроды замяняюцца нэўрачыпамі.

Іншая тэхналёгія была знойдзена выпадкова: пэўныя электрамагнітныя хвалі здольныя раздражняць сятчатку й вуха — чалавек бачыць мільгаценьне й чуе гукі. Але калі да вас зьвернецца нехта з аповедамі пра «прамяні», страшнае праграмаваньне праз радыё і тэлефон — сьмела адпраўляйце такога чалавека ў Навінкі.

«Індывідуальныя» тэхналёгіі замбаваньня мала зьмяніліся з стараэгіпецкіх часоў: што чорная магія, што гіпноз. А вось зомбіфікацыя як масавая, грамадзкая практыка ўвесь час мяняецца.

## Масавыя радасьці зомбі

Гучней за ўсіх пра «замбаваньне» — хаця самога слова ня ведалі — пракрычалі францускія асьветнікі-энцыкляпэдысты. Маўляў, царква замбуе людзей — трэба ачысьціць сьвядомасьць ад забабонаў. Калі старыя каштоўнасьці былі адкінуты як цемрашальскія, выбухнула Француская рэвалюцыя: натоўпы віталі гільятыну. Старыя грамадзкія сувязі былі цалкам парушаныя, і ў нечуваных маштабах стваралася аднародная маса, здольная на ўсё — але й зь лёгкасьцю кіраваная.

Ле Бон і Фройд прысьвяцілі гэтай масе кнігі, а нацысты й камуністы скарысталіся іх парадамі. Для масавага замбаваньня быў неабходны татальны кантроль над усімі сфэрамі жыцьця.

Сэкты й шматлікія рухі, якія ёсьць і зьяўляюцца, зыходзяць з гэткай жа лёгікі: «толькі прыхільнікі Марыі Дэві-Хрыстос — правільныя, усе астатнія — злыя робаты»; «невэгетарыянцы, прыгнечаныя мясной ежай»; «фэміністка-абартыстка — вольная і не замбаваная мужчынскім шавінізмам».

Але падобная «пільнасьць» — неабходны складнік любой зомбі-палітыкі: сваім усяляк прамываць мазгі, чужых — абвінавачваць у маніпуляцыях. Беларусі ў гэтым сэнсе асабліва «пашанцавала».

## Асновы беларускай зомбі-палітыкі

«Зомбі!» — «Сам зомбі!» — звычайны дыялёг палітычных апанэнтаў у Беларусі. У каго болей сродкаў для замбаваньня — той гучней і крычыць, каб схаваць уласныя грахі.

Але любая зомбі-палітыка здольная бачыць аб'ект — і ніколі суб'ект: не чалавек, а адзінка для маніпуляцыі, не народ — а электарат, не самастойныя людзі — натоўп. Зомбі-палітыка змагаецца за аб'ект, грызецца зь іншымі.

Толькі праўда ў тым, што «аб'ект» заўжды праяўляе (ці праявіць) сябе як асоба — свавольная, са сваім інтарэсам. І любая зомбі-палітыка запраграмаваная на правал. Пытаньне толькі ў тым, паскорыць яго ці зацягнуць. Разбурае зомбі-палітыку й мастацтва, якое робіць відавочнымі схаваныя страхі й комплексы.

Пад канец карціны «Зямля памерлых» Джорджа Рамэра зомбі пад кіраўніцтвам «Вялікага Бацькі» (гэта афіцыйнае імя ў стужцы) урываюцца ў галоўны хмарачос. Людзі сыходзяць, каб заснаваць новы фарпост. Жывое да жывога, мёртвае да мёртвага. Але калісьці ўцекачы вернуцца — каб ажывіць горад.

**Навукоўцы дасьледавалі**

**зельле гаіцянскіх магаў — здробненыя косткі, расьліны. Адзін складнік прыцягнуў пільную ўвагу. У сумесь уваходзіў тэтрадатаксін — наймацнейшая біялягічная атрута, якая карыстаецца найвялікшай пашанай нэўрафізіёлягаў. Гэтае рэчыва спыняе перадачу нэрвовых імпульсаў да мышцаў — атручаны гіне страшнай сьмерцю. Спачатку адключаюцца рукі й ногі, потым цела, а апошнімі блякуюцца мышцы грудзей — чалавек памірае ад удушша. Тэтрадатаксін — настолькі моцная атрута, што звычайна сьмерць настае адразу. Але можна падабраць мікрадозу, што чалавек будзе здавацца памерлым, застаючыся жывым. Калі такога «нябожчыка» выкапаць, астатняе зробяць забабоны й страх — ён сам будзе лічыць сябе зомбі. Так клясычная вуду–тэхналёгія знайшла навуковае абгрунтаваньне.**

# 185 мільёнаў рублёў... на здачу

Самы вялікі грашовы выйгрыш у гісторыі Беларусі зваліўся на галаву простага сялянскага хлопца з адной зь вёсак Цясноўскага сельсавету. Алег (прозьвішча яго ня будзем прыводзіць і мы, бо не зьвяліся аматары пажывіцца за чужы кошт) выйграў такую суму ў лятарэю.

А справа была так. Алег вырашыў зацэмэнтаваць падвал і падаўся за будматэрыяламі ў Дзяржынск. Купляючы цэмэнт, на здачу ўзяў прапанаваныя лятарэйныя білеты.

І вось сэнсацыя! Пасьля атрыманьня выйгрышу Алег узяў на рабоце водпуск — разам з жонкай і двума сынамі выехаў, мяркуючы, на адпачынак. Больш падрабязную інфармацыю ня толькі карэспандэнтам, але і вяскоўцам шчасьліўчык не імкнецца даваць. І гэта зразумела, бо, на жаль, ня ўсе толькі радуюцца, калі іншаму пашанцуе...

**Газэта «Прамень», Стоўпцы**




**Парыж рыхтуецца да лета. 7 кастрычніка там была прэзэнтаваная калекцыя моднага адзеньня на вясну-лета 2006.**


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**«Я сяджу і гляджу ў чужое неба з чужога акна». На фота: Алег Манаеў, кіраўнік Незалежнага інстытуту сацыяльных, эканамічных і палітычных дасьледаваньняў, які аднавіўся ў Вільні пасьля забароны ў Беларусі.**

## Тацяна Барысік

ВАЙНА ПАД СТРЭХАМІ

*Мы, беларусы, — мірныя людзі…*

Усе мы героі, усе мы салдаты.
У нас партызанская кожная хата.
Змагаемся так — ажно шыба трасецца,
Ніхто не адступіць, ніхто не здаецца!
— Прызнайся нарэшце, старая халера,
Каму, як памрэш, дастанецца кватэра?
Ваюе Мікола з унукамі, дзецьмі
За права сьвятое спакойна памерці.
Нашчадкаў фашысцкімі катамі лае
І радые ноччу напоўна ўключае!
Ня згасьне ваярскі запал у Алёны,
Алёна паўсюль дасылае праклёны.
Нядзелькаю божай Савончык Марыля,
Як ворага злога, ката задавіла —
Каб знаці на вуліцы ўсе тарбахваты,
Што коцік пярэсты ня краў кураняты!
Маленькі Валодзя, сыночак Гаўрылаў,
У клясе вучыўся з вайсковым ухілам.
Унадзіўся хлопчык хадзіць на чыгунку,
Ня раз забіралі яго з пастарунку.
На рэйкі жалезкі цішком ускладае —
Цягнік пад адхон, а Валодзька ўцякае!
Зрабіўся дзіцёнак нібы тэрарыстам —
Ня хоча быць лекарам ці трактарыстам.
Дзяржаве на радасьць, бацькам на бяду
Гаворыць адно: «Ў партызаны пайду!»
У доме дванаццаць, другой палавіне,
Жыве ўсё жыцьцё Панасюк Валянціна.
Крый божа, ня даць Панасюк анальгіну,
Ці то не падвезьці яенага сына!
Адмовіш — у сьпіну адразу пачуеш:
— Глядзі, галубок мой, яшчэ пашкадуеш.
Пагрозу бабуля, хутчэй за ўсё, спраўдзіць,
Хаціну тваю разам з пуняю спаліць.
Ў сантэхніка Грышкі пасьля самагонкі —
Ружжо, востры нож і пагоня за жонкай.
Няхай пакалоцціца, хай патрывае,
Раз, гадаўка, грошы мае забірае!
Я зьвыклася змалку, ужо не дзіўлюся
Ваеннай сучаснасьці ў Беларусі.
Штодня забіваюць, пужаюць, нявечаць.
Пад кожнай страхою, у кожным мястэчку.

## Віктар Цой

*Пераклаў з расейскае
Сяргей Балахонаў*

ПАЧАК ЦЫГАРЭТ

Я сяджу і гляджу ў чужое неба з чужога акна
І ніводнае зоркі не магу пазнаць.
Я блукаў па бездарожжы ад відна да відна,
Азірнуўся і пабачыў, што сьледу няма.
Але пакуль я маю пачак цыгарэт,
Не зусім усё так кепска на сёньняшні дзень.
І квіток на самалёт са срэбным крылом,
Што ляціць і пакідае зямлі толькі цень.
І ніхто не хацеў быць вінаватым безь віна,
І ніхто не жадаў рукамі жар заграбаць.
А бяз музыкі на людзях сьмерць як сястра,
А бяз музыкі ня хочацца прападаць.
Але пакуль я маю пачак цыгарэт,
Не зусім усё так кепска на сёньняшні дзень.
І квіток на самалёт са срэбным крылом,
Што ляціць і пакідае зямлі толькі цень.

ГРУПА КРЫВІ

Цёплае месца, ды вуліцам мець
Трэба водціскі нашых ног.
Зоркавы пыл боты нясуць.
Добра ў фатэлі. Коўдра. Камін.
Шчэ націснуць цынгель не пасьпеў.
Сонечны дзень перасьчаных сноў.
Рэзус фактар, група крыві,
Мой парадкавы нумар на рукаве.
Пажадай, каб фартунным быў бой.
Пажадай мне не застацца ў гэтай траве,
Не застацца на мураве.
Пажадай мне фартуны.
Ёсьць чым плаціць. Ахвоты няма
Да ўзмогі за кожны кошт.
Прагі няма хоць камусьці на грудзі ставаць.
Я хацеў бы застацца з табой,
Проста застацца з табой,
Ды высокая зорка наноў
Заве ваяваць.
Рэзус фактар, група крыві,
Мой парадкавы нумар на рукаве.
Пажадай, каб фартунным быў бой.
Пажадай мне не застацца ў гэтай траве,
Не застацца на мураве.
Пажадай мне фартуны.

СОНЦА–ЗАРА

Белы сьнег. Шэры лёд.
Люты боль з ран зямлі імкне.
Шматкалёрнаю коўдрай на ёй
Места ў дарожным вязьме.
А над местам тым аблокі плывуць,
Захінаюць нябесны сноп.
А над местам тым жоўты дым.
Месту аж дзьве тысячы год,
Выжытых у промнях зары,
Імя якой Сонца.
І дзьве тысячы год вайна,
Вайна без адметных прычын.
Вайна — бава маладых
І лекі супраць маршчын.
Чырвань — чырвоная кроў.
Праз гадзіну проста зямля.
Праз дзьве на ёй кветкі ў траве,
А праз тры яна зноўку жыве
У праменьні гарачай зары,
Імя якой Сонца.
І вядома, што было так заўжды:
Хто ня помніць ні чыноў, ні імён,
Той гатовы дацягнуцца да зор,
Калі нават навокал сон,
І прапасьці, згарэўшы ў зары,
Імя якой Сонца.

ЗЯЗЮЛЯ*

Песьняў, дагэтуль нястворaных, колькі?
Парай, зязюля, як сьлед:
Месьцічам мне быць ці жыць на хутары,
Крыцай ляжаць ці азараць сусьвет?
Сусьвет.

Сонца маё, вачэй не хавай,
Зірні, я сьціснуў далонь у кулак,
І, даўшы мне порах, рады дай,
Што й як…

Хто памкне дарогаю самотнікаў?
Волаты адважныя
На нажы ўскіпелі ў полі ў баях.
Мала хто, унікнуўшы бяспамяцтва,
З розумам ясным здольны цярэбіць
Шлях.
Той шлях.

Сонца маё, вачэй не хавай,
Зірні, я сьціснуў далонь у кулак,
І, даўшы мне порах, рады дай,
Што й як…

А дзе ж ты цяпер, воля вольная?
У якіх краях золак залатым вітаеш і з кім?
Хораша з табой ды кепска безь цябе,
Голаў свой ды плечы шматпакутныя пад кій,
Пад кій.

* Гэты пераклад ахвярую Сяргею Скрабцу.

Сонца маё — вачэй не хавай,
Зірні, я сьціснуў далонь у кулак,
І, даўшы мне порах, рады дай,
Што й як…

## Юрась Нераток

КАСТРЫЧНІЦКАЯ МРОЯ

Дрэвы апрануць кідкія касьцюмы,
Як на баль «Для тых, каму болей за…»,
Восень падаб'е і акругліць сумы,
А пасьля ў разьлік выдасьць гарбуза.

Скрыюць копы хмар прамяні ў далоні,
Ціша захіне векам ад труны,
Вецер-самахвал сыпне сьнег на скроні,
У паўсьне замруць думкі-валуны.

Але гахне гром — спыніцца плянэта!
Адляціць увысь рэха ад грымот,
І праз нейкі час зноў надыдзе лета,
Сонца пабяжыць з захаду на ўсход!

Віхрам улячу ў велічную эру
І пачну з нуля, зь першага глытка…
Зьнішчу ў сьвеце тым чыстую паперу,
Каб не напісаць лішняга радка.

А сьвятло і змрок скончаць кампрамісам
(Гэтага ніхто колісь не міне!) —
Фінішны радок з прочыркам-дэфісам
Змогуць напісаць, пэўна, безь мяне.

## Норма Бэліні

ВОМРАК

Марныя мары,
Змрочныя мроі,
Цені у ба́ры,
Смутак сутоньня.
Музыка грае
Надта журботна —
Клявішаў зграя,
Цёмныя вокны…
Марныя мары,
Змрочныя мроі.
Смутна ў бары…
Ты не са мною.

ЛІПЕНЬ

У ліпені лета ў зэніце,
У ліпені сонца пячэ.
У ліпені мухі ліпнуць
(І нешта такое яшчэ).

У ліпені лісьце жоўкне
І долу ляціць спакваля.
І млява зьвісаюць аблокі —
Здаецца, заснула зямля.

У ліпені вельмі ляніва
Ўсялякія справы рабіць.
У ліпені ці не найлепей
Піць піва і бінды біць.

У ліпені можна адзначыць
Угодкі Грунвальдзкіх падзей,
А потым, што важна зазначыць,
Сустрэць Незалежнасьці дзень…

Я крочу па ліпеньскіх вулках —
Духмяныя ліпы цьвітуць —
І ад невыразнага смутку
Пішу гэту ўсю каламуць.

ПАСТУЛЯТ ПІЎНОГА АЛЬКАГОЛІКА

Жлукціць піва ў адзіноце ганарлівай —
Не такая ўжо благая пэрспэктыва.
Горш, калі сябры табе у шклянку
Наліваюць адно толькі мінэралку!

# Як беларусы Міцкевіча вярталі

іранічны аповед

**СЯРГЕЙ АСТРАВЕЦ**

Ангельцаў некалькі стагодзьдзяў турбуе шэксьпіраўскае пытаньне, грэкам хранічна ня сьпіцца з-за гамэраўскага. А беларусы доўга пакутавалі над міцкевіцкім. Як гэта ўраджэнец беларускай зямлі, сын беларускага шляхціца раптам мог стаць нацыянальным паэтам у літоўцаў, якія яго лічаць самым літоўскім, хаця ён быў славянінам па бацьку, габрэем па маці і ня меў жмудзкай крыві?

Праўда і некаторыя замежнікі дагэтуль у непаразуменьні. Як сказаў у роспачы і зьдзіўленьні адзін польскі дасьледнік: як так магло здарыцца, што вялікі польскі паэт беларуска-габрэйскага паходжаньня напісаў па-польску «Літво, ойчызна моя!», маючы на ўвазе цяперашнюю Беларусь... Саміх беларусаў яшчэ заўсёды ўражвала і абурала, што Адам Міцкевіч, пахваліўшы ў сваіх сарбонскіх лекцыях іх саміх і мову іхнюю, не пакінуў на ёй аніводнага радка, ня кажучы ўжо пра вершы. Зрэшты, па-літоўску ён тым больш ніколі не пісаў, але ад гэтага беларусам было не лягчэй.

І вось аднойчы надарыўся шанец заявіць пра свае правы на паэта, якога паміж сабой бессаромна падзялілі суседзі. Але тут раптам на вялікія ўгодкі Адама беларускі галава абвесьціў чамусьці год Пушкіна, які быў маладзейшым за Міцкевіча. Памылачка атрымалася. Што зробіш, калі ў ягонай адміністрацыі з арытмэтыкай у некаторых праблемы. Але потым улада выправіла памылку затушаваць, сьпехам пачалі рамантаваць родны паэтаў Навагрудак. І стварылі нават спэцкамітэт, каб адзначыць угодкі на ўзроўні. А мяне запрасілі ад пісьменьніцкай арганізацыі ўдзельнічаць, паколькі я Міцкевіча люблю і нават маю ягоны бюст. Стаіць галава паэта на стале, за якім я займаюся літаратурнымі справамі.

Такім чынам, нас сабралі ў райвыканкаме на нараду. Прыехаў са сталіцы ўрадавы куратар літаратуры і мастацтва. Верагодна, каб даказаць, што Міцкевіч ніякі не Адомас Міцкус, як яго калісьці назвалі здуру суседзі. Але гэта, мабыць, толькі я так меркаваў з уласнай наіўнасьці. Размова набыла з самага пачатку нечаканы накірунак. Загаварылі пра мясцовага Леніна, які развальваўся надвадоку, замест рук меў куксы — з мэталёвай арматурай замест пальцаў. Слова далі прадстаўніку мясцовай улады, які стаў апавядаць пра яе тытанічныя высілкі, якія, хутчэй, нагадвалі Сызыфаву працу.

— Мы ўжо спрабавалі сваімі сіламі яму рукі прыляпіць, у сэнсе — пальцы і далоні цэлыя. Адсыхаюць, як на злосьць. Трэскаюцца і адвальваюцца. І колер не супадае, людзі гавораць: Ленін у пальчатках. Нос таксама рассыпаўся ад часу, з праваленым носам стаіць, народ сьмяецца. Але мы разумеем, што без помніка як без рук. І перад замежнікамі нельга, каб чырванець.

— Ён павінен застацца дамінантай у горадзе, — загаварыла сапраўднымі словамі Дар'я Макараўна Бурдзюкова — ідэалягічная начальніца. — Сьвяты розныя — да каго кветкі? Да яго. Рапарты герояў жніва, выступы сьвяточныя. У піянэры прымаць. Як у старыя добрыя часы. А калі кветкі панясуць да гэтага самага паэта, а не да правадыра — што будзе?! Што ён тут самы галоўны?! — Што скажаце, спадар пісьменьнік? — нечакана запытала мяне Дар'я Макараўна.

— Я, я, што я магу сказаць? Калі параўнаць мастацкія ці моўныя асаблівасьці, то Ўладзімер Ільліч быў яўна не паэтам. Але мы калісьці вывучалі спэцкурс «Ленін — майстар нэкралёгу» і ягоныя мэтафары — «палітычныя прастытуткі», «сяўружына з хрэнам» — гэта пра творы апанэнтаў, далей — «лібэральныя ваніты».

— Ну, гэта ўжо, ведаеце... — паспрабавала мяне перапыніць ідэалягічная начальніца. Але мне неабходна было дакончыць думку: «Замест Леніна лепей паставіць Міндоўга альбо хопіць проста Міцкевіча».

— Горад без галавы ня можа быць, — адсекла Бурдзюкова. — Леніна мы ні на каго не прамяняем. Ён у нас у сэрцы засеў. А паэтамі быць усім не абавязкова. Нэкралёгі таксама некаму трэба пісаць.

— «Паэтам можаш ты ня быць, грамадзянінам быць абавязан», — падтрымаў даму крыху гульліва ўрадавы прадстаўнік Загібалін і працягнуў зь іншай — дырэктыўнай інтанацыяй. — Галава дзяржавы паставіў задачу: даказаць гэтым, якія хацелі паміж сабой нашага паэта падзяліць надвая, нам нічога не пакінуўшы...

— І каторыя ў НАТО... — ня вытрымала Дар'я Макараўна.

— Так, і якія цяпер пішчом лезуць у агрэсіўны блёк, так мы ім павінны даказаць, што мы ня горш за іх разьбіраемся ў паэзіі. Такую задачу паставіў сам галава дзяржавы. І гэта яшчэ ня ўсё. Дзяржава згодна даць грошы на рамонт вашага райцэнтру і помніка. Каб ня пляснуцца тварам у гразь перад замежнымі дэлегацыямі, — важка зазначыў чыноўнік. — Хаця ў нас клопатаў хапае бяз вашага Леніна: сяўба вось-вось, потым бітва за ўраджай і галоўнае дзяржаўнае сьвята «Дажынкі».

— І на прыбіральню грамадзкую, калі ласка, дайце грошай, — раптам, не чакаючы слова, загаварыў раённы начальнік з жабрачымі ноткамі ў голасе. — Перад музэем стаіць старая: хмары мух, пах непрыемны. Турысты скардзяцца. Разбурыць ніхто не дазваляе — на балянсе ў Мінкульце стаіць — сам Міцкевіч туды хадзіў, гаварылі. Дый на новую ніколі няма грошай, увесь час трэба змагацца за прывагі, за надоі. Туалет — наша балючае месца, таварыш прадстаўнік ураду, наша ахілесава пята.

— Ладна-ладна, будзе вам клязэт, — з усьмешкай лагодна паабяцаў Загібалін.

— І пажадана, каб ачкоў па пяць-шэсьць з кожнага боку — і для хлопчыкаў, і для дзяўчатак, — нейк цнатліва дадаў мясцовы бюракрат, — каб усім хапіла.

— Ну я ж сказаў: будзе вам туалет — зь літарамі «мэ» і «жо», — шырока пасьміхнуўся ўрадавы чыноўнік, — але я хачу канкрэтна пачуць, што ў нас атрымліваецца з помнікам Ільлічу?

Абласны архітэктар пачаў павайсковаму сьцісла і дакладна тлумачыць свой плян. Старога Леніна — дэмантаваць. Новага паставіць не пасярэдзіне, а збоку пляцу. Сталічныя скульптары-ляўрэаты запатрабавалі цану... Маўляў, сёньня спэцыялістаў на Ільлічу амаль не засталося, усе на вагу золата. Але мы зробім інакш. Мы возьмем у падвале вялікую белую галаву правадыра, якая стаяла раней у абкаме. Атрымаецца «і дзёшава, і сярдзіта».

— Брава! — не стрымаўся Загібалін, які не хаваў лагоднага гумору. — А зараз, таварышы, пяройдзем да абмеркаваньня самога паэта, яго, так сказаць, вартасьцяў і ўласьцівых здольнасьцяў.

Тут слова далі чамусьці гісторыку, які перш пахваліўся, што застаўся на марксісцкіх пазыцыях, чым вельмі ганарыцца. Ён загаварыў у такім рэчышчы:

— У Парыжы Міцкевіч уступіў у сэкцыю нудыстаў, шпацыраваў па Элізэйскіх палях «у чым мама нарадзіла». У Стамбул да турак пацягнуўся. Ці бачыце, хацеў падтрымаць француска-ангельскую агрэсію. Стаць героем Крымскай вайны. Чаго яму там не хапала? Зноў гарэм у Бахчысараі зрабіць? Бясслаўна памёр у турэцкім духане ад антысанітарыі. Увогуле, як ён пра нашых рускіх афіцэраў у сваім «Тадэвушы» напісаў? Ганьба!

— Папрашу без эмоцый, — загадаў Загібалін.

— Прабачце. Я толькі хацеў сказаць, што ён стаў рэакцыйным паэтам пасьля таго, як перастаў сябраваць з Пушкіным і ўцёк на Захад. Гэта, кажучы па-сучаснаму, здрада радзімы, артыкул 58 — 25 гадоў альбо нават расстрэл.

Начальства, як мне здалося, зьлёгку нават зьніякавела. Сытуацыю ўратаваў, як ні дзіўна, абласны архітэктар, які сказаў, што цяпер Ленін будзе кантраляваць сытуацыю — глядзець менавіта ў бок Міцкевіча, да якога раней стаяў сьпінай і нічога ня бачыў, што робіцца ў Доме-музэі.

— Ну, добра, — перапыніў яго Загібалін, — хопіць. З помнікам вырашылі, з туалетам разабраліся, якія яшчэ праблемы?

— Пікетчыкі стаяць на вуліцы, — з трымценьнем азваўся прадстаўнік мясцовай улады.

— Пікетчыкі? Якія пікетчыкі? Што ім трэба?

— Школу польскую патрабуюць. У горадзе Міцкевіча трэба, каб польская школа была.

— Мы ж ім далі адказ! — знэрвавана выгукнула Дар'я Макараўна.

— Так, далі. Ім адказалі, што палякаў у нас можна па пальцах пералічыць, і школу адкрываць немэтазгодна. У нас ужо і беларускай школы няма, хоць беларусаў — колькі хочаш. І нічога, ніхто не абураецца.

— Правільна! — згадзіўся прадстаўнік ураду. — У нас усе выдатна разумеюць рускую мову. І дзякуй Богу, як кажуць. Ну што, таварышы, закончым на сёньня. А што ў Леніна такая вялікая галава будзе стаяць, гэта справядліва — ён 55 тамоў напісаў, а колькі гэты ваш Міцкевіч?..

На сьвяткаваньне ў Дом-музэй наш галава дзяржавы запрасіў суседніх галоваў — польскага і літоўскага. У райцэнтры так рыхтаваліся, асфальт з мылам мылі. Наш галава разам з суседнімі галовамі павінен быў, паводле сцэнару, пасадзіць дубкі — цэлую алею, — пад якімі любіў бавіць час Адам Міцкевіч са сваімі каханкамі. Затым наш правадыр павінен быў зрабіць выступ пра паэзію.

Народу сабралася паглядзець на высокае начальства — процьма. Наперад выйшаў мужчына пад гальштукам у сьветлым гарнітуры, з рыдлёўкай у руках. Натоўп вакол мяне ажно скалануўся. Ніхто не пазнаў правадыра, твар якога штодня прапагандавала тэлебачаньне. «Няўжо-няўжо цяпер кіруе іншы? А гэты куды дзеўся?» Але раптам нехта пазнаў прэм'ера Лангова, які звычайна пакорліва ў тэлевізары выслухоўваў лаянку нашага бацькі, спрунянеўшы стоячы, таму ніхто яго як сьлед не запомніў. Маўчуной народ не запамінае і ня любіць.

Але народу ніхто нічога не тлумачыць. Адно ўсюдысныя журналісты хутка разьнюхалі, што наш бацька раззлаваўся і не прыехаў, бо адмовіліся ад візыту літовец з палякам. Напісалі: дзякуй за запрашэньне, але ў вас тут парушаюцца на кожным кроку правы чалавека... Ну, а начальства наша так і не зразумела: якія адносіны мае вялікая паэзія да славэтных правоў чалавека? Карацей, грандыёзнае сьвята было сапсавана. Затое сёньня ў зямлякоў вялікага паэта ёсьць новы Ленін, праўда, бяз рук, але гэта нават і лепей. І вотэрклязэт, пра які яны марылі, таксама ёсьць. Так што і турысты нарэшце ўздыхнулі з палёгкай.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Старая Горадня. Вуліца Давыда Гарадзенскага.**



**Сяргей Астравец** — *пісьменьнік, журналіст. Жыве ў Горадні.*



АЛЕНА АДАМЧЫК

ГОМЕЛЬСКІ ДЗЁНЬНІК

# Дзеўка са «Свабодай»

**СЯРГЕЙ БАЛАХОНАЎ**

Ёсьць у гомельскім паноптыкуме адзін выдатны экзэмпляр — невысокая бабулька з савіным носам. Ейны твар у любую пару году чырвоны — незважаючы на свой век, бабця любіць наступаць раз-пораз на корак. «Бабушка выпіла», — з годнасьцю рэклямуе яна сваё п'янства, чапляючыся да мінакоў.

Ехаў неяк я тралейбусам, месца хапіла, каб сесьці. Побач прыладзілася дзяўчынка з плэерам. Акурат у гэты час у салён уплюшчылася тая самая бабцяп'янца, распасьцерла руку і хрыпла прастагнала: «Ну вот, уселася». Рэпліка прызначалася дзяўчынцы. Тая адразу ўсё зьмікіціла і паднялася, саступаючы месца. «Бабушка села». Я міжволі паморшчыўся. Бабуля зьнячэўку стала цікавіцца: «Ета ваша дзевушка?» Ага, мая. Старая паднялася і перасела — было куды! Малая вярнулася на месца, цярэбячы свой mp3-player і зазіраючы ў маленькі каляндарык зь лягатыпам «адной падрыўной радыёстанцыі». За ўвесь час яна ня вымавіла ні слова.

### Касцы ілюзій

«Ідуць касцы, зьвіняць іх косы», — знаёмыя яшчэ са школы словы, што трывала замацаваліся ў сьвядомасьці. *Ідуць касцы, зьвіняць іх косы і tertium non datur*. Але аднойчы давялося перажыць культурны шок: косы не зьвінелі. Здарылася гэта непадалёк ад Мельніцкага мосту, дзе паміж гаражамі й шматпавярхоўкамі захаваўся добры кавалак пусткі. Улетку там буяе разнатраўе, якое муляе вока камунальным службам.

Радоўка мужчынаў у засьцерагальных акулярах мерна крочыла, трымаючы ў руках здабытак цывілізацыі — мэханічную касілку. Карціны ў стылі Стывэна Кінга. Зблытаныя думкі нарадзілі толькі адну фразу: «Ідуць касцы, гудуць іх косы…» Але гэта не азначае, што ўсе закінулі дзядоўскія літоўкі. Напамінам пра тое, што старасьветчына парадаксальна ўпісваецца ў сучаснасьць, для мяне стала іншая гарадзкая карціна. Стыльны дзяцюк у чырвонай майцы з надпісам «Дякуй богу, що я не москаль» і разабранай касою ў правіцы крочыў на пару зь дзяўчынай, адзетай у вельмі лёгкую саколку і кароткую спаднічку.

### Плятформа сораму

На прыпынку адна паненка знаходзілася ў таварыстве мамы і бабулі. Яна была гатовая праваліцца ў царства Жыжаля, абы ня чуць сваіх спадарожніц. Кабеты не пераказвалі зьмест N-й сэрыі лацінаамэрыканскай мыльнай опэры. Яны абмяркоўвалі сваю родную крывіначку: як яна вырасла, як яна пахарашэла, зь якой высознай плятформай носіць абутак. Незагарэлая дзяўчына ўмомант зрабілася чырвонай. Яна драматычна закочвала вочы і паказвала белыя зубы ці то ва ўсьмешцы, ці то ў зласьлівым ашчэры. Безумоўна, увесь сьвет — тэатар, а людзі ў ім — акторы. Але гэтай акторцы давядзецца многа рэпэтаваць, каб навучыцца ігнараваць ня столькі назойлівую любоў родзічаў, колькі прысутнасьць падчас праяў гэтай любові трэціх асобаў, накшталт мяне. А плятформа ейнага абутку сапраўды высозная.

**АДАМ ГЛЁБУС**



# Сучасьнікі

### Саша і малако

Імчым па праспэкце Міру, што ў Маскве. За стырном джыпа — Саша Іваноў: «У такім джыпе я езьдзіў па Танзаніі!» «А я не люблю джыпаў і Афрыкі, мэгаполісы люблю». — «А ў мяне ўсё наадварот. Вось і цяпер думаю, што я раблю ў чортавым горадзе. Хочацца ў Намібію, у Танзанію… У Афрыцы засталося шэсьць сапраўдных запаведнікаў, дзе жывёлы яшчэ пачуваюцца больш-менш вольнымі. Дый тое ўмоўнасьць. Паехалі мы фатаграфаваць вадапой насарогаў, а нэгры паналівалі малака ў лужыны, каб насарогі забавіліся па дарозе на вадапой. «Нашто вы гэта зрабілі?» — «Дзеля вас!» Крэтыны. А што ў вашых запаведніках творыцца?» — «У нас ёсьць Нью-Ёрк бабровы. На Палесьсі, паміж Мазыром і Пінскам, ёсьць мэгаполіс баброў. Уражвае». — «Бабёр маленькі, а я люблю вялікіх жывёлаў: сланоў, жырафаў, насарогаў…» — «Зуброў у нас хапае!» — «А можна прыехаць і сфатаграфаваць? Толькі не ў загоне, а ў краявідзе… Я фатаграфую вялікіх жывёл у краявідзе…» — «Друкуеш у часопісах?» — «Не. Я здымаю толькі для сябе…» — «Апошнія запаведныя мясціны?» — «Штосьці такое… У Намібіі, на мінулым тыдні, я зрабіў цэлую серыю здымкаў пра львіцу. Па саване ішлі тры маладыя львіцы, а на акацыі сядзеў ягуар. Ён задраў нейкую антылёпку, нейкую козачку, і зацягнуў на дрэва, на самую вяршаліну, і там закусваў. Ільвіцы падышлі да акацыі, адна палезла да ягуара, ён, вядома, паспрабаваў супраціўляцца, але львіца парвала ягуара імгненна, забіла і скінула на зямлю. Я думаў, яна і антылёпу скіне. Не. Уладкавалася на дрэве і пачала есьці. Пакуль усё ня зьела, ня зьлезла… Дык як з зубрамі?» — «Думаю, можна паехаць. У мяне брат у Берасьці жыве. Пацікаўлюся…» — «Ты паедзеш?» — «Не. Я ў дзяцінстве бачыў, як зубар напаў на машыну. Шофэр, ідыёт п'яны, хацеў зубра пагладзіць. Маўляў, што бык, што зубар — бяз розьніцы. Толькі некалькі крокаў ён зрабіў у бок зубра, той павярнуўся і на шофэра пайшоў. Шофэр схаваўся ў кабіну сваёй «Калхіды». Зубар баднуў бампэр і сышоў. Я глядзеў на гэта праз акно аўтобуса. Страшнавата было. Пасьвіць авечкі і каровы я нават любіў, а да нясвойскіх жывёлаў я абыякавы…»

*11.09.2005, 13:23*

### 1944. Глобус і Сікорскі

У архіве Польскага інстытуту і музэю імя генэрала Сікорскага (IPMS, Greaf Britain) ёсьць дакумэнт (Sydn.: XII.3.31) ад 17.VI.1944, у якім згадваецца Сьцяпан Глобус, праваслаўны з Баранавіцкага павету, ён служыў у 1-й танкавай дывізіі, у 9-м стралецкім батальёне.

Выпіску ў архіве зрабіў Ігар Войніч.

# Знакі прыпынку



**УЛАДЗІМЕР НЯКЛЯЕЎ**

* * *

Прабыў тыдзень у Македоніі, на кангрэсе Міжнароднага ПЭН-клюбу ў Охрыдзе… Ці ня кожны другі македонец казаў мне: «Нас з Расеяй дзьвесьце мільёнаў». Тое самае я чуў і ад сэрбаў, толькі тыя ўжо бралі круцей, налічвалі трыста мільёнаў… З гэтага можна было б зрабіць выснову пра ролю Расеі ў славянскім сьвеце, каб за год, пражыты ў Польшчы, я пачуў нешта такое хоць ад аднаго паляка.

* * *

Сэрбы мараць пра Вялікую Сэрбію, альбанцы — пра Вялікую Альбанію, македонцы — пра Вялікую Македонію, аж да Плоўдзіва. Баўгарам, якія двойчы ў мінулым стагодзьдзі займалі Македонію як сваю этнічную тэрыторыю, гэта, канечне, прыемна.

* * *

П'ю каву з баўгарынам Георгіем Канстантынавым, падымаюся з-за стала, адразу падыходзіць македонскі паэт: «Як ты можаш зь ім каву піць, калі баўгары ў апошнюю вайну прыйшлі ў Македонію з фашыстамі!..»

А Георгі па бацьку — македонец.

* * *

Ужо іншы македонскі літаратар, празаік, даводзіць мне, што і Аляксандар Македонскі — іх нацыянальны ваяр, і Кірыла зь Мятодам — македонцы, якія прыдумалі кірыліцу — македонскую азбуку.

Спажываем масьціку, выпілі ўжо грамаў па дзьвесьце, таму адказваю, што яно не зусім так. Македонскага, кажу, можаце забіраць сабе, ён нам без патрэбы… А што да першай славянскай азбукі, дык створаная яна была Кірылам і Мятодам не ў Македоніі і нават не ў Баўгарыі, а ў Канстантынопалі па загадзе тамчаснага цара *дзеля аб'яднаньня дзікуноў*. І называлася не кірыліцай, а глаголіцай, на якой ніводны сёньняшні македонец ні бэ ні мэ. А кірыліцу стварылі ўжо вучні Кірылы і Мятода, пяцёра зь якіх купіў на рынку рабоў вэнэцыянскі купец і, ня ведаючы, што далей зь імі, такімі разумнымі, рабіць — адпусьціў на волю. Яны і рушылі на Балканы…

— Куды канкрэтна? — пытаецца захмялелы празаік, і я адказваю, што спачатку ў Баўгарыю, да цара Барыса…

— Тады пі адзін! — падсумоўвае мой лікбез македонец і адсоўвае ад сябе кілішак.

* * *

На выхадзе з гэтэлю «Мэтраполь» размаўляю з рухавым хлопцам. Ён пра што заўгодна — весела і бойка, а пра палітыку — мнецца, ніяк. Пытаюся: «Ты, можа, не македонец?» — і чую ў адказ:

— Я таксіст.

# Афрыка

## для электрадзіцяці



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

У электронным сьвеце Жэню клічуць Luna:r — гэта азначае, што зараз спыніцца брутальны драм'н'бас, брэйк-біт і брыкс і пачнецца расслабуха — павольны трып-хоп і чылаўт. Піша Тэда Лі.

Жэня жыве адзін у вялізным трохпавярховым доме. Улетку ён выкапаў сажалку ў форме фасоліны ў двары і запусьціў туды залатую рыбку. Залатая рыбка не канчала жыцьця самагубствам, яна проста ўсплыла ўверх брухам. Цяпер Жэня ведае: залатыя рыбкі не жывуць у мутнай вадзе.

### Песьні тэктанічных пârод

Упершыню пачуўшы Жэневу музыку на электроннай вечарынцы арганізацыі Electrokids, яго сябар параўнаў гукі з паскораным рухам тэктанічных пârод. Сам Жэня абыякава ставіцца да любых азначэньняў сваёй музыкі — ён робіць справу, якая падабаецца яму. У электронным сьвеце Жэню клічуць Luna:r — гэта таксама азначае, што зараз спыніцца брутальны драм'н'бас, брэйк-біт і брыкс, пад якія можна каўбасіцца да раніцы, і пачнецца расслабуха — павольны трып-хоп і чылаўт.

— Цяпер ад мяне чакаюць менавіта такога, і таму для вечарынак я адбіраю з усіх зробленых трэкаў тое, што людзі зьбіраюцца пачуць пад назвай Luna:r, — кажа Жэня.

У тусоўку «электрадзяцей» Жэню запрасіў Ягор два гады таму, калі для правядзеньня вечaрынак адбіралі прэтэндэнтаў на тое, каб граць у СЭВе («Сыстэме электроннага вар'яцтва» — так завецца большасьць мерапрыемстваў Electrokids). Luna:r прыгадвае, што першы іх выступ адбыўся ў «Budda-бары» — было шмат людзей, для якіх Жэню іграць спадабалася.

— Калі я раблю музыку, я не імкнуся адразу вызначацца з напрамкам, — расказвае Luna:r. — Я раблю тое, што ўдаецца, тое, што адчуваю і чую: калі усе гукі гучаць гарманічна, прысутнічаюць элемэнты з самых розных стыляў. Я не хачу належаць да адной пэўнай стылістыкі.

### Разьдзяўбайства па волі

— Жэня, ты ж разьдзяўбай? — выпрошваю я ў яго прызнаньне. На гэтым момaнце сябры электроншчыка пачынаюць гучна сьмяяцца і просяць адказаць на гэтае пытаньне за яго.

— Ага, мае сябры могуць лепш расказаць пра тое, чым я часам займаюся. Так, я разьдзяўбай. Я не шкадую сябе, ня думаю пра заўтра, не гляджу на сябе збоку, ня думаю пра вынікі і раблю кучу глупстваў.

Фундамэнтам Жэневага разьдзяўбайства зьяўляюцца тры рэчы, у спажываньні якіх ён ня мае ніякай меры, — алькаголь, грошы і сябры. Калісьці раней Luna:r прызнаваўся мне, што ў тыдні ён мае толькі адзін шчасьлівы дзень — пятніцу: тады ён вясёлы і бадзёры, пакуль не пачнецца «загул» да наступнай пятніцы. Калі пачынаеш гуляць, немагчыма спыніцца.

— Я не адказваю ні за што, апроч сябе, — сьмяецца Жэня, — таму мяне ня стрымлівае ні сям'я, ні грамадзкія рамкі. Калі хочацца зрабіць якую-небудзь дурноту, я раблю яе.

### Не для друку

— Ненавіджу людзей, якія праз сваю скаванасьць і няўпэўненасьць у сабе паводзяць сябе агрэсіўна і наадварот, хочуць здавацца раскаванымі, — зазначае Жэня. — Не люблю, калі людзі без пэўных здольнасьцяў бяруцца за нейкую справу. Хоць любы чалавек без жаданьня быць лідэрам зрабіў бы гэта нашмат лепей. Не люблю ўпэўненых у сабе ёлупняў.

— О, гэта вельмі палітычна, — хіхікае яго сябрук, — гэта не для друку.

### Каб любіць Беларусь нашу...

— Я люблю сваю радзіму ў будынках, дрэвах, вуліцах, у матэрыяльных рэчах, — разважае Luna:r. — Але я не люблю яе ў масе людзей, увогуле беларусаў не люблю. Тыя нацыянальныя рысы, якія выдаюцца за нашы плюсы, зьяўляюцца велічэзнымі мінусамі. Памяркоўнасьць для мяне — ня больш чым проста баязьлівасьць. І тая гасьціннасьць — звычайная паслужлівасьць. Калі ў сям'ю прыяжджае госьць, яго прымаюць ледзьве не шыкоўна, а пасьля ад'езду гаспадыня пачынае ныць: «Бюджэт патрацілі дзе цяпер грошы на жыцьцё знайсьці…» Няўжо нельга адразу сказаць: «Я вас пачастую гарбатай зь печывам, а то пасьля ў нас будуць праблемы». Не, яны дастануць усё, а пасьля будуць і шкадаваць, і пляткарыць пра яго.

— Можа, хоць *нешта* табе ў гэтых беларусах падабаецца? — пытаю я.

— Ёсьць шмат людзей, якія, хоць і адчуваюць інфармацыйны голад, хоць і «варацца» сярод тых, хто хоча зрабіць іх сярэднестатыстычнымі, шэрымі, памяркоўнымі, застаюцца разумнымі, мілымі, каляровымі і абаяльнымі, — намазвае Жэня масла на маё сэрца.

— Усё роўна Беларусь як краіна зьнікне з палітычнай мапы сьвету, — праракуе Жэню сябар.

— Калі ўжо Беларусь зьнікне, — кажа Luna:r, — то тады, значыць, астатнія краіны таксама пазьнікаюць.

— А як ты ўяўляеш сабе ідэальную краіну? — пытаецца яшчэ адзін сябар электроншчыка.

— Па-першае, — задумваецца Жэня, — трэба, каб усё рабілася для людзей, а не народ араў на нейкі ілюзорны дабрабыт. Падругое, павінна быць свабода для самарэалізацыі кожнага. Ну і, вядома, нацыянальная самасьвядомасьць.

— Ты б хацеў, каб вуліца размаўляла па-беларуску? — цікаўлюся я.

— Вядома, я вельмі люблю, калі гавораць на нашай мове. Толькі не трасянка!

### Афрыка на даляглядзе

Праз тры тыдні Жэня зьяжджае ў зусім іншы сьвет. У Паўднёвай Афрыцы працуюць бацькі, і ён нарэшце вырашыў, што менскай адзіноты ды самастойнасьці яму хапіла.

— Чаго ты хочаш ад Афрыкі? — нападаю я.

— Найперш мне хочацца атрымаць новыя ўражаньні, пазбавіцца ад прышчэпленага Менскам пачуцьця будзённасьці. Я занадта доўга ўжо анідзе ня быў. Ну і, безумоўна (пераходзіць на ўзвышана-палётны тон), чакаю сустрэчы з унікальнымі краявідамі, расьлінамі і жывёламі.

Памятаю, як год таму, завіснуўшы ў страшэнна дэпрэсіўным стане, Luna:r расказваў пра сваё адзінае жаданьне: стаяць на вяршыні скалы і глядзець уніз на мора, якое пачынае штарміць. Афрыка нікому ніколі не абяцала спакою, Афрыка ўвогуле нікому нічога не абяцала. Можа, менавіта там усё будзе настолькі нечакана, наколькі гэта патрэбна Жэню, каб жыць. Можа, там ён стане знакамітым, і зьдзейсьніцца мара жыцьця любога творцы — жыць за кошт творчасьці. Можа, калінебудзь у дыскарнях нам прапануюць новы вельмі цікавы альбом нейкага далёкага паўднёвага Luna:r'а.

## СПОРТ СЬЦІСЛА

### Гандбольны мінус

За выходныя беларускіх прадстаўнікоў у гандбольных эўракубках паменела на дзьве адзінкі. Мужчынская «Вікторыя-Рэгія» ў двух гасьцявых паядынках саступіла македонскаму «Мэталюргу» — 31:34, 28:33. У другім крузе жаночага кантынэнтальнага кубку лёс зьвёў «Гараднічанку» і менскі БНТУ. Сталічныя гандбалісткі аказаліся мацнейшымі — 32:30, 24:24. Наступныя гульні ў дзяўчат — у студзені.

Першы хатні паядынак правёў у Лізе чэмпіёнаў Берасьцейскі гандбольны клюб імя Мяшкова. У менскім Палацы спорту БГК саступіў дацкаму «Колдынгу» 27:29. Наступныя гульні берасьцейцы правядуць у гасьцях: супраць плоцкай «Віслы» і таго ж «Колдынгу». Заключныя паядынкі групавога турніру пройдуць у Менску — 6 лістапада супраць «Кіля», 13 лістапада — супраць «Віслы».

### Бронзавыя гімнасткі

На тым тыдні ў сталіцы Азэрбайджану прайшоў XXVII чэмпіянат сьвету па мастацкай гімнастыцы. Зборная Беларусі заваявала чатыры бронзавыя мэдалі. Іна Жукава заняла трэцяе месца ў практыкаваньнях зь мячом, астатнія тры ўзнагароды былі заваяваныя ў шматбор'і ці групавых практыкаваньнях. У агульным мэдальным заліку беларускі занялі пятае месца. На першым — расейкі.

### Дзяўчаты б'юцца лепей

На чэмпіянаце сьвету па таэквандо ў Рызе беларусы заваявалі два бронзавыя мэдалі. Яны на рахунку дзяўчат — Юліі Сухавіцкай (катэгорыя да 63 кг) і Алесі Чарняўскай (72 кг). Хлопцы выступілі горш: Ігар Леановіч, Анатоль Качук, Віталь Малейка, Сяргей Сачук, Ігар Расахацкі трапілі толькі ў дзясятку лепшых.

### Раманцаў адмовіўся

Знакаміты расейскі трэнэр Алег Раманцаў адмовіўся ад прапановы ўзначаліць мужчынскую футбольную зборную Беларусі. «Кіраўнікі Беларускай фэдэрацыі раней прапанавалі мне ўзначаліць зборную, але я вымушаны быў адмовіцца. Палічыў, што з пастаўленай задачай — выхадам у фінал чэмпіянату сьвету — не спраўлюся. Чэсна зрабіў», — сказаў экс-трэнэр маскоўскага «Спартака» і зборнай Расеі.

**АР, belta.by, football.by**

ІНФАРМАТАР

## Тарты на замову ў сталіцы



**«Бэээ»**
пр.Скарыны, 18

**«Верас»**
вул.Славінскага, 45

**«Каравай»**
пр.Ф.Скарыны, 38

**«Ласун»**
пр Ф.Скарыны, 19

**«Тарты»**
вул.Казлова, 4

**«Кастрычніцкі»**
вул.Мясьнікова, 37

**«Пэгас»**
пр.Пушкіна, 63, офіс 74

**«Салодкі фальварак»**
вул.М.Танка, 2

**Універсам «Першамайскі»**
вул.Русіянава, 7

**Універсам «Цэнтральны»**
пр.Ф.Скарыны, 23

**Універсам «Юбілейны»**
вул.Заслаўская, 23, корп.1

**Хлебазавод №2**
вул.Крапоткіна, 33

**Хлебазавод №3**
пр.Партызанскі, 97

**Хлебазавод №5**
вул.Каліноўскага, 4

### У Горадні

**«Студыя сьвятаў»**
вул.Вялікая Траецкая, 1

КАІСА

# У Лунінцы адаптаваліся

У гарадку — пекны вакзал, нябедны музэй і шматколерная незалежная газэта «Інформ-прагулка». Няма ў Лунінцы шахматнага клюбу, дарма што прыхільнікаў Каісы хапала заўсёды — і «за польскім часам», і ў савецкім тумане. Напрыклад, нямала шахматыстаў сярод рабочых мікашэвіцкага «Граніту»: яны там ладзяць свае спартакіяды.

Гутарачы зь летапісцам лунінецкіх шахмат Вадзімам Жылком, разумееш, як шмат залежыць ад асобы. Жыў у Мікашэвічах трэнэр Уладзімер Хіргій — і яго выхаванцы Слава Дутчак, Алег Ліцкевіч заваёўвалі мэдалі на абласных спартакіядах. Зьехаў Хіргій на Магілёўшчыну — жыцьцё сьціхла. Цяперашнія трэнэры — «прагматыкі»: ігнаруючы культурны падмурак шахмат, «дрэсіруюць» вучняў, убіваючы ў галовы нацэленасьць на вынік. Але вынікаў не відаць і праз лупу.

Уключэньне шахмат у праграму гарадзкіх сьвятаў ды мэмарыялы партызана Кулакевіча, якія штовесну ладзяцца пад эгідай раённага ўпраўленьня спорту ў розных кутках рэгіёну, — вось і ўсе яркія падзеі.

Калі мала прасторы для практыкі, шахматысты выходзяць сродкі для дыстанцыйных зносінаў… Раней хлопцы з гуртка пры цэнтры дзіцячай творчасьці актыўна ўдзельнічалі ў конкурсах БТ, што ладзіла Кіра Зварыкіна ў праграме «Пра шахматы і шахматыстаў». Адзін зь пераможцаў тых конкурсаў — шматразовы чэмпіён раёну Ўладзіслаў Каташук — стаў кампазытарам і вядомым у Берасьці трэнэрам.

Сёй-той у Лунінцы гуляе празь перапіску, аднак перапісачнікаў — жменька. Затое жыве ў горадзе Сяргей Сахвон, які пераклаў на беларускую мову аўстралійскую шахматную праграму, вывесіўшы спасылку на сваім сайце. «Чаму менавіта аўстралійскую? Я паспрабаваў папрактыкавацца ў перакладзе чаго-небудзь на беларускую мову», — тлумачыць сп.Сахвон. Гэтым «чым-небудзь» і аказалася «KchessElite» работы Роба Макдонэла.

У 1990-я нямала чытачоў прыцягнуў шахаддзел у раённай газэце «Лунінецкія навіны», а цяпер В.Жылко ладзіць аж VIII конкурс рашэньня і складаньня задач у «Інформ-прагулцы». Свае творы ў Лунінец дасылаюць кампазытары з паловы сьвету, ад Берасьця да Магадану; вядома, рашальнікам такая разнастайнасьць даспадобы.

Чым ганарацца лунінецкія аматары шахмат, дык гэта выдавецкімі справамі. З пачатку 1990-х у мястэчку накладам 100 асобнікаў выходзіць адзіны ў краіне бюлетэнь па шахматнай кампазыцыі «Альбино». Тутсама выдаюцца брашуры мясцовых аўтараў на шахматную тэму: «Дзьве музы», «Кропка на шахматнай карце». Як дадатак да «Альбино» сёлета выпушчаны і зборнічак задач Мікалая Наруця, праблеміста з Плешчаніц.

Так, шахматна-шашачны клюб — не самамэта. Як кажа сп.Жылко, «безь яго неяк адаптаваліся». У кастрычніку ён плянуе правесьці чарговы чэмпіянат раёну па шахматах і шашках на базе гуртка «Фэрзь», з дапамогай райвыканкаму.

Дзе загрузіць белмоўную шахматную праграму: http://luninetsm.at.tut.by/chess.html.

**ВД, ВР**



### Як бы вы згулялі?

Каташук—Собаль, Берасьце, 1995. Ход белых.

**Адказ:** можна было пабіць каня (1. Се4), аднак белыя паставілі пастку: 1. Тf3!? і пасьля 1...Кс3? (1...Кf8) далі мат за два хады.

НАШЫ ШАШКІ

# Ракітніцкі і Купала

Майстар спорту і заслужаны трэнэр Беларусі Аркадзь Ракітніцкі быў выдатным апавядальнікам. Нават людзям, аддалена знаёмым з правіламі шашак, дастаткова было пару разоў паслухаць яго выступы ў перадачы «Белыя і чорныя» на БТ, каб далучыцца да шашачнага ўнівэрсуму. З кожнай старонкі яго апошняй кнігі з гаваркой назвай «Дарагія аматары шашак» (1993), напісанай і выдадзенай па-беларуску, праточваецца захапленьне гульнёй — але ня толькі гульнёй як такой. Сп.Аркадзь расказваў пра людзей, якія адваёўвалі сабе права на вольнае жыцьцё, немагчымае без разумных забаў. Вось Янка Купала: любіў карты, шахматы і шашкі, цікавіўся кампазыцыяй. Паводле слоў Ракітніцкага, вельмі падабалася Купалу наступная задача (па сутнасьці, этуд), складзеная французскім праблемістам Мануры ў 1770 г.



Ці мажліва тут выйграць за белых, нават пры іхнім ходзе? У іх не хапае шашкі, чорная дамка на галоўнай дарозе… Рашэньне сапраўды ўражвае: 1. h4-g5 a1-g7 (на іншы ход — 2. f4-h2) 2. f4-c1(d2) і чорныя пагарэлі, як Заблоцкі на мыле. Ня дзіва, што Купалу прыйшоўся даспадобы трыюмф духу над матэрыяй.

ВАРТА БАЧЫЦЬ

### Пятніца, 14 кастрычніка

**«Лад» 10.25**

«Люстэрка».

Расея, 1974, рэж. Андрэй Таркоўскі.

Фільм-споведзь.

Шэдэўр А.Таркоўскага, дзе дакумэнтальныя кадры становяцца асабістым сном, а дзіцячыя ўспаміны — архетыпамі. У галоўнай ролі — Маргарыта Церахава.

**НТВ, 22.45**

«Сем».

ЗША, 1995, рэж. Дэйвід Фінчэр.

Трылер пра маньяка.

Стары й малады паліцэйскія (Морган Фрымэн і Брэд Піт) расьсьледуюць забойствы, кожнае зь якіх сымбалізуе сьмяротны грэх. Дапаможнік для пошукаў — Дантэ і Біблія. Адзін з найлепшых страшных фільмаў за апошнія дзесяць гадоў.



**БТ, 23.35**

«Блакітны лёд».

Вялікабрытанія—ЗША, 1992, рэж. Расэл Малкехі.

Дэтэктыў паводле твору Тэда Олб'юры.

Былы разьведчык знаёміцца зь пекнай жанчынай. Новая знаёмая просіць абараніць яе ад шантажыста — і герой трапляе ў гісторыю з крывавымі забойствамі і карупцыяй.

Піянэр відэакліпаў Расэл Малкехі — больш вядомы як рэжысэр «Горца» — стылізаваў фільм пад 1960-я.

### Субота, 15 кастрычніка

**«Лад», 23.00**

«Група «Дорз».

ЗША, 1991, рэж. Олівэр Стоўн.

Біяграфічная драма.

Рок-музыка Джым Морысан і ягоны гурт «Дорз» сталі сымбалем цэлага пакаленьня. Энэргетыка, містыцызм, брутальнасьць і п'янкая музыка эпохі — у магутнай карціне О.Стоўна.

Вэл Кілмэр («Аляксандар») бліскуча пераўвасабляецца ў Дж.Морысана. Іншыя ролі выконваюць Мэг Раян, Кайл Маклахлэн, Майкл Мэдсэн.

**АНТ, 23.00**

«Вярнуць час назад».

Францыя, 2004, рэж. Андрэ Тэшынэ.

Мэлядрама.

Немалады чалавек (Жэрар Дэпард'ё) адпраўляецца ў Марока на пошукі былой каханкі. Але гераіня (Катрын Дэнёў) за трыццаць гадоў прызвычаілася да нуднага жыцьця. «Гэта толькі мары», — гаворыць яна. Але й мары здольныя стацца рэальнасьцю.

Дэнёў і Дэпард'ё сустракаюцца на здымачнай пляцоўцы ўжо шостым разам, у рэальнасьці іхнія стасункі таксама былі няпростымі — так што каханьне паміж героямі набывае жыцьцёвыя падставы.

Майстар эўрапейскага кінэматографу А.Тэшыне («Спатканьне», «Я не цалуюся») быў намінаваны на «Залатога льва» Бэрлінскага кінафэстывалю.

**СТВ 00.25**

«Ілюмінато».

ЗША—Гішпанія—Японія, 1998, рэж. Джон Туртура.

Драма.

Нью-ёрскі тэатар пачатку ХХ ст. Акторы іграюць на сцэне, а за кулісамі плятуць інтрыгі, кахаюць. Імпрэсарыё канфліктуе з акторамі й рэжысэрам, а драматург зацікаўлены толькі ў тым, як бы прабіць сваю п'есу «Ілюмінато».

Джон Туртура — адзін зь лідэраў незалежнага амэрыканскага кіно. Карціна была намінаваная на «Залатую пальму» Канскага кінафэстывалю.

### Нядзеля, 16 кастрычніка

**«БТ, 22.05**

«Блубэры».

Францыя—Вялікабрытанія, 2004, рэж. Ян Коўнен.

Містычны вэстэрн.

Шэрыф Майкл Блубэры (Вэнсан Касэль) змагаецца са старым ворагам (Майкл Мэдсэн). Бойка адбываецца ня толькі на кольтах, але і ў галюцынацыйна-кампутарнай прасторы.

**Андрэй Расінскі**

## ДНІ СЛАВАЧЧЫНЫ

**Белае прывітаньне для Беларусі**

Канцэрт «Славакія — Эўропа ў малым». **18 кастрычніка.** Беларуская дзяржаўная філармонія, а 19–й. Творы славацкіх кампазытараў у выкананьні Дзяржаўнага акадэмічнага сымфанічнага аркестру Беларусі.

Лекцыя Адрыяна Райтэра «Славацкая музыка з глядзішча гісторыі». **17 кастрычніка** (15.30). Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі.

Адкрыцьцё выставы славацкіх мастакоў «Белае прывітаньне для Беларусі». **19 кастрычніка** а 17–й. Палац мастацтваў (вул.Казлова, 3).

Выстава «Славацкая графічная творчасьць (да 12 лістапада)». Адкрыцьцё **20 кастрычніка,** а 17–й. Музэй выяўленчага мастацтва (пр.Скарыны, 49).

Выстава «Сучасны славацкі жывапіс і скульптура». **21 кастрычніка,** а 17–й. (Нацыянальны музэй, вул.Леніна, 20). А 12–й лекцыя Паўла Урбана «Сучаснае славацкае выяўленчае мастацтва».

## ПРЭЗЭНТАЦЫЯ

**Паміж**

**14 кастрычніка** ў бібліятэцы Дому літаратара (вул.Фрунзэ, 5) — прэзэнтацыя часопісу «Паміж», №4. У вечарыне ўдзельнічаюць: А.Анціпенка, В.Акудовіч, П.Васючэнка, А.Спрынчан, В.Трэнас, В.Жыбуль, Джэці, гурт «Жаба ў каляіне». Пачатак а 18–й.

## КІНО

**Фэстываль кароткамэтражнага кіно**

**14–16 кастрычніка** ў Доме кіно (вул.Талбухіна, 18) — чарговы паказ работ Бэрлінскага міжнароднага фэстывалю кароткамэтражнага кіно «ІнтэрФільмУсход». Гэтым разам у праграму «Ад шасьці да шасьцідзесяці» ўключана 11 фільмаў вытворчасьці Аўстраліі, Нямеччыны, ЗША, Францыі і Швайцарыі. Пачатак а 19–й і 21–й.



**Грэта Гарба**

У кіназалі Музэю гісторыі кіно (вул.Сьвярдлова, 4) ідзе рэтраспэктыва фільмаў з удзелам Грэты Гарба:
**19** (ср) — «Дама з камэліямі» (1937 г.). Пачатак у 18.30.



## СПОРТ

**Хакей**
**Міжкантынэнтальны кубак. Чвэрцьфінал**
**14 кастрычніка** (пятніца)
«Хака» (Гішпанія) — «Сокал» (Кіеў). Пачатак а 15.30.
«Юнацтва» (Менск) — «Тарпэда–Казцынк» (Усьць–Каменагорск). Пачатак а 19.30
**15 кастрычніка** (субота)
«Сокал» — «Тарпэда–Казцынк». Пачатак а 15.30.
«Юнацтва» — «Хака». Пачатак а 19–й.
**16 кастрычніка** (нядзеля)
«Хака»—«Тарпэда–Казцынк». Пачатак а 15.30.
«Юнацтва» — «Сокал». Пачатак а 19–й.
Усе матчы пройдуць у менскім Палацы спорту.

**Чэмпіянат Беларусі. 23-ці тур**
**16 кастрычніка** (нядзеля)
«Тарпэда» (Жодзіна) — «Гомель».
«Зорка–БДУ» (Менск) — «Шахтар» (Салігорск). Стадыён «Трактар».
«Нафтан» (Наваполацак) — «Дняпро–Трансмаш» (Магілёў).
«Дынама» (Берасьце) — «Славія» (Мазыр).
«Нёман» (Горадня) — «Лякаматыў» (Менск).
**17 кастрычніка** (панядзелак)
«Дарыда» (Ждановічы) — МТЗ–РІПА (Менск).

## ТЭАТРЫ

**Опэра**
**13** (чц) — Вечар вакальных дуэтаў (на сцэне Белдзяржфілармоніі).
**13** (чц) — «Чароўная флейта» (на сцэне Цэнтральнага дому афіцэраў).
**14** (пт) — «Хаваншчына» (ЦДА).
**15** (сб) — «Яўген Анегін» (ЦДА).
**17** (пн) — «Мадам Батэрфляй» (ЦДА).
**20** (чц) — «Чайкоўскі–гала» (Белдзяржфілармонія).
**Балет** *(на сцэне Палацу рэспублікі)*
**13** (чц) — «Карсар».
**17** (пн) — «Лебядзінае возера».
**Купалаўскі тэатар**
**13** (чц) — «Чорная панна Нясьвіжу».
**14** (пт), **22** (сб) — «Кім».
**15** (сб) — «Івона, прынцэса Бургундзкая».
**16** (ндз) — «Памінальная малітва».
**17** (пн) — «Смак яблыка».
**19** (ср), **20** (чц) — «Ідылія».
**21** (пт) — «Згублены рай».
**23** (ндз) — «Паўлінка».
**Ранішнія спэктаклі**
**16** (ндз) — «Ажаніцца — не журыцца».
**23** (ндз) — «Паўлінка».
**Малая сцэна**
**15** (сб) — «Беларусь у фантастычных апавяданьнях».
**17** (пн) — «Саламея».
**Тэатар беларускай драматургіі**
**13** (чц) — «Нязваны госьць».
**14** (пт) — «Містэр розыгрыш».
**15** (сб) — «Адвечная песьня».
**18** (аўт) — «Адэль».
**19** (ср) — «Паўночная цішыня».
**Музычны тэатар**
**13** (чц) — «Баядэра».
**15** (сб) — «Ноч у Вэнэцыі».
**16** (ндз) — «Кажан».
**Тэатар лялек**
**13** (чц), **14** (пт) — «Боская камэдыя».
**20** (чц), **21** (пт) — «Прыгоды ўдалага салдата Швэйка».
**Тэатар імя Горкага**
**13** (чц) — «Перад захадам сонца».
**14** (пт) — «Дзядзькаў сон».
**15** (сб) — «Адзіны спадчыньнік».
**16** (ндз) — «Ад'ютант–Ша Яго Вялікасьці».
**18** (аўт) — «Вольны шлюб».
**19** (ср) — «Дзівакі».
**21** (пт) — «Суцяшальнік удоваў».
**22** (сб) — «Анджэла і іншыя».

## КЛЮБНАЕ ЖЫЦЬЦЁ

**Bronx** (288–10–61, GSM «Velcom»: 103 і 105)
13 (чц) 22.00 — жывая музыка: квартэт «Port Monet» / dj Dust.
14 (пт) 22.00 — жывая музыка: «Atava» dj Bergamo.
15 (сб) 22.00 — Roskow Kretschmann (Jazzanova), Clara Hill, Jazz Avoiders (Масква), dj Laurel.
16 (ндз) 17.00 — нядзельны кінасэанс.
**Ізюм** (206–66–18)
13 (чц) 23.00 — «RNB Royalty Party».
14 (пт) 21.00 — жывая музыка / erotic show.
15 (сб) 22.00 — «Fusion dance».
16 (ндз) 21.00 — жывая музыка / disco–program.
**Белая вежа** (284–69–22, 239–16–00)
13 (чц) 23.00 — «White Tower»: dj Top, dj Bergamo.
14 (пт) 23.00 — Sergei Pimenov (Moscow), dj Alex.
15 (сб) 1.00 — dj Dee.
16 (ндз) 23.00 — жывая музыка: «Acoustic Band» / dj LP aka Al Paliony, dj Alex.

## КІНО Ў МЕНСКУ

**Фэстываль польскага кіно «Камэдыі XXI ст.»**
«Супэрпрадукцыя» (камэдыя, Ю.Махульскі). **13** (чц) 19.00.
«Вінчы» (камэдыя, рэж. Ю.Махульскі). **14** (пт) 19.00.
«Анёл у Кракаве» (камэдыя, А.Віцэк): **15** (сб) 19.00.
«Ніколі ў жыцьці!» (Р.Заторскі): **16** (ндз) 19.00.
Паказы ў кінатэатры «Цэнтральны».
**«Аўрора»** (253–33–60)
«Перавозчык–2»: **14** (пт) 15.00 (іл), 19.20, 21.20; **15, 16** (сб, ндз) 13.00 (іл), 15.00, 17.00, 19.00, 21.00.
«Басанож па бруку»: **14** (пт) 16.30, 18.40, 20.50; **15, 16** (сб, ндз) 16.30.
«Саракагадовы нявінькік»*** (прэм'ера): **15** (сб) 14.00, 18.40, 20.50, 22.50; **16** (ндз) 14.00, 18.40, 20.50.
**«Бярасьце»** (272–87–91)
«Браты Грым»***: **14** (пт) 18.50 (іл), 21.10; **15, 16** (сб, ндз) 14.00 (іл), 16.30, 18.50, 21.10.
**«Дом кіно»** (266–35–26)
«ІнтэрФільмУсход» прадстаўляе: «11 фільмаў за 1 сэанс… ад 6–ці да 60–ці»: **14—16** (пт—ндз) 19.00, 21.00
«Браты Грым»***: **15, 16** (сб, ндз) 16.45.
**«Дружба»** (240–90–13)
«Мужчына па выкліку–2»***: **14—16** (пт—ндз) 16.30 (іл), 19.00, 21.00.
**«Кастрычнік»** (232–93–25)
«Перавозчык–2»: **14** (пт) 14.10, 16.00, 17.50, 19.40, 21.30; **15, 16** (сб, ндз) 13.40 (іл), 15.30, 19.40.
«Саракагадовы нявінькік»*** (прэм'ера): **15, 16** (сб, ндз) 17.20, 21.30.
**«Масква»** (203–14–48)
«Перавозчык–2»: **14** (пт) 17.00, 19.00, 21.00; **15, 16** (сб, ндз) 12.30 (іл), 16.50.
«Саракагадовы нявінькік»*** (прэм'ера): **15, 16** (сб, ндз) 14.30, 19.00, 21.20.
**«Мір»** (288–22–33)
«Птушкі–2: падарожжа на край сьвету»: **14** (пт) 16.00 (іл); **15, 16** (сб, ндз) 14.00 (іл).
«Красуні»: **14—16** (пт—ндз) 16.40.
«Калі сьвякроў — монстар»: **14** (пт) 18.00, 20.00; **15, 16** (сб, ндз) 16.00, 18.00, 20.00.
«Мужчына па выкліку–2»***: **14** (пт) 19.00, 21.00; **15, 16** (сб, ндз) 15.00, 19.00, 21.00.
**«Перамога»** (203–77–66)
«Браты Грым»***: **14** (пт) 14.00, 19.00, 21.10; **15, 16** (сб, ндз) 14.00 (іл), 19.00, 21.10.
«Перакладніца»: **14** (пт) 16.30, **15, 16** (сб, ндз) 16.30 (іл).
**«Піянэр»** (227–64–87)
«Ключ ад усіх дзьвярэй»***: **14—16** (пт—ндз) 17.00, 21.10.
«Правілы здыманьня: Хітчаў мэтад»***: **14—16** (пт—ндз) 19.00.
**«Цэнтральны»** (200–34–16)
«Калі сьвякроў — монстар»: **14** (пт) 13.00, 15.00; **15, 16** (сб, ндз) 13.00 (іл), 15.00.
«Мужчына па выкліку–2»***: **14—16** (пт—ндз) 17.00, 21.20.

(2с) — кінафільм падоўжанай працягласьці
(іл) — ільготны сэанс (зьніжка 50% для ўсіх гледачоў)
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 гадоў не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 гадоў.



ДЗЯНІС РАМАНЮК

## Музыка беларускіх касьцёлаў

**13 кастрычніка**

**а 21–й на радыё «Юністар» (99,5 FM, он–лайн — www.unistar.by) канцэрт касьцельнае музыкі. Бяруць удзел гурт «Золак», парафіяльны хор «Залатая горка», арганістка В.Паўлоўская (касьцёл Сьв. Роха, Менск), хор «Крыніца» (касьцёл Узвышэньня сьвятога крыжа, Баранавічы), гурт «Magnificat» (парафія Беззаганнага пачацьця Найсьвяцейшай Панны Марыі, Бабруйск).**

## ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

**Тэатар**
**Тэатар лялек**
**15** (сб) — «Чароўная лямпа Аладзіна».
**16** (ндз) — «Прыгоды алавянага салдаціка, пастушкі і камінара».
**19** (ср), **22** (сб) — «Тры парсючкі».
**23** (ндз) — «Кот у ботах».
**Музычны тэатар**
**15** (сб) — «Зачараваны прынц».
**Опэра**
**16** (ндз) — «Казка пра Каракаля, Вераніку і Горад майстроў» (на сцэне ЦДА).

## КІНО

**«Аўрора»**
«Казка пра мёртвую царэўну і сем багатыроў» і іншыя мультфільмы: **14** (пт) 14.30; **15, 16** (сб, ндз) 11.30.
«Джынсы–талісман»: **15, 16** (сб, ндз) 12.00.
**«Бярасьце»**
«Варвара–краса, доўгая каса»: **15, 16** (сб, ндз) 12.00.
«Модная мамачка»: **14** (пт) 15.00.
**«Дом кіно»**
«Скарб»: **14** (пт) 15.00.
«У пошуках Нэма»: **15, 16** (сб, ндз) 12.00.
**«Дружба»**
«Кніга джунгляў–2»: **14** (пт) 12.00, 14.30; **15** (сб) 11.00; **16** (ндз) 13.00.
Мультзборнік: **15** (сб) 13.00; **16** (ндз) 11.00.
**«Мір»**
«Алёша Паповіч і Тугарын Зьмей»: **15, 16** (сб, ндз) 13.00.
**«Піянэр»**
Мультзборнік «Вясёлы гармідар»: **14** (пт) 11.00; **15, 16** (сб, ндз) 10.30.
«Шрэк–2»: **14** (пт) 12.20; **15, 16** (сб, ндз) 12.00.
«Лемані Сьнікет: 33 няшчасьці»: **14** (пт) 14.30; **15, 16** (сб, ндз) 14.00.
**«Цэнтральны»**
«Вэліянт: птушыны спэцназ»: **14—16** (пт—ндз) 11.00.

## КІНО НА DVD

**Master Records**
**«Тры экстрымы»**
Фільм жахаў, Японія—Ганконг—Карэя, 2004, рэж. **Такашы Мііке, Фрут Чан, Парк Чан Вук**.
Сястра, спаленая жыўцом у скрыні, ды адсечаныя пальцы піяністкі — сёньняшняя рэаліі экстрэмальных азіяцкіх навэляў.
**Менск, Кісялёва, 12, 643-21-08**

## ВЫСТАВЫ

**Мэбля-2006**

**З 18 да 22 кастрычніка** ў НВЦ «Белэкспа» на Я.Купалы, 27 і Машэрава, 14 пройдзе спэцыялізаваная выстаўка–кірмаш «Мэбля–2006».



**Графіка**

Да 21 кастрычніка ў «М–Галерэі» Інстытуту імя Гётэ (вул.Фрунзэ, 5) працуе выстава графікі Валер'я Слаўка. У экспазыцыі — ілюстрацыі да першага тому «Беларускага фальклёру».

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Дыктатараў чакае Гаага

**«Перакладніца» («The Interpreter»)**
ЗША—Вялікабрытанія—Францыя, 2005, каляровы, 128 хв.
**Жанр:** палітычны дэтэктыў.
**Адзнака:** 4 (з 10).

Гэта фільм пра дыктатара, які пераследуе апазыцыю і нарываецца, урэшце, на міжнародны трыбунал. Цікава?

Перакладніца ў ААН (Ніколь Кідман) выпадкова даведваецца пра пляны забойства афрыканскага лідэра. Адзіная надзея выратавацца самой і выратаваць іншых людзей — спэцагент з посттраўматычным сындромам (Шон Пэн).



WWW.MOVIEWEB.COM

Гэта першы ігравы фільм, зьняты ў будынку ААН. У сюжэце маюцца: змовы, перасьлед, стралянiна, забойствы. Але фільм халодны, як Ніколь Кідман. Ёсьць намёк на любоўную лінію, але няма выбуховай сумесі добрага дэтэктыву. Галоўная праблема героя фільму — што ж рабіць з дыктатарамі: змагацца зь імі ўзброена ці судзіць міжнародным трыбуналам. Карацей, не дапрацаваў Полак. Але беларусам усё адно спадабаецца. Актуальна, ці ведаеце. Хоць мода на палітычныя дэтэктывы мінулася, а дыктатуры ў сьвеце можна пералічыць на пальцах.

Дарэчы, рэжысэр «Перакладніцы» Сыдні Полак быў адным з найлепшых майстроў палітычнага дэтэктыву, што квітнеў у 1970–я. Нават савецкі пракат закупіў ягоны «Тры дні Кондара».

**Андрэй Расінскі**

ФЭЛЬЕТОН

# Парады чэсным журналістам

*Мне загадана славіць тут*
*вёсны і росквіт,*
*А зірну на бярозкі — гадуюцца розгі.*
***Уладзіслаў Сыракомля***

Як справядліва адзначыў прэзыдэнт, наша краіна ўжо дзесяць год зьяўляецца аб'ектам інфармацыйнай вайны. Такая сытуацыя патрабуе ад журналістаў асаблівай чэснасьці. Што патрабуецца ад журналіста, каб лічыцца чэсным у Беларусі?

Некаторыя мяркуюць, што журналісту дастаткова дакладна перадаваць факты. Глыбокая памылка. Факт — усяго толькі неабскубаная курыца, зь якой не атрымаеш навару. Больш за тое, у сваім «голым» выглядзе факты могуць быць вельмі непрывабныя і мець самыя непрыемныя вынікі — зьніжэньне тонусу насельніцтва, памяншэньне даверу да ўлады, стварэньне скажонага вобразу нашай мірнай і квітнеючай Беларусі. Каб пазьбегнуць гэтага, трэба паказваць пераважна тыповае для нашай краіны — будоўлі, спартыўныя спаборніцтвы з удзелам нашага прэзыдэнта, народныя сьвяты.

Такія зьявы, як крымінал, галеча, карупцыя, хоць і сустракаюцца ў нашай краіне, ня могуць лічыцца для яе тыповымі, таму іх лепш паказваць на прыкладзе замежжа. Толькі так народ паверыць, што жыве ў сапраўды моцнай і шчасьлівай краіне. Калі ж ён так ня думае, гэта таму што ён кепска разабраўся ў сытуацыі. Статыстыка заўжды павінна пацьвярджаць высокі давер насельніцтва да нашай дзяржавы, яе кіраўніка і інстытутаў. Так абясшкоджваецца самы ўпарты скептык, бо хто гэты скептык, калі не прадстаўнік меншасьці, ад якой нічога не залежыць?

Наша дзяржава вядзе барацьбу за шматпалярны сьвет. Свой уклад сюды павінна ўносіць і журналістыка. Перш за ўсё трэба падкрэсьліваць разнастайнасьць формаў дэмакратыі. Бо, як вядома, дэмакратыя ёсьць улада, што выходзіць ад народу, а кожная ўлада, у сваю чаргу, выходзіць ад народу. Такім чынам, можна сьмела сьцьвярджаць, што кожная ўлада — гэта своеасаблівая форма дэмакратыі ўжо таму, што яна існуе. А ўсё, што існуе, як вядома, разумна. Таму тых, хто выступае супраць улады, трэба паказваць ня толькі як ворагаў дэмакратыі, але і як людзей неразумных. Зь іх заўжды трэба сьмяяцца. Але ня толькі сьмешнымі павінны быць гэтыя людзі — яны павінны выклікаць яшчэ і агіду, і тут ужо вы не павінны спыняцца ні перад чым. Той, хто выступае супраць улады, павінен быць абсалютна благім — красьці, забіваць. Асабліва карысна выкарыстоўваць сэксуальныя матывы. Бо гэта можа, па-першае, выставіць апанэнта абсалютна брыдкім, прывабіць аўдыторыю, а за адным махам і дапамагчы самім чэсным журналістам пазбавіцца ад уласных комплексаў.

Зразумела, гэта далёка ня ўсе парады, што патрэбны чэсным журналістам, але і яны могуць дапамагчы вам узьняць свой прафэсійны калібр і ўзвысіцца да ўзроўню грандыёзуса.

**Лукаш Кандратавіч Пруцікаў, заслужаны дзеяч прапаганды СССР і БССР, ляўрэат прэміі «За духоўнае адрачэньне»**



**Выходнымі ў ляску бліз вёскі Літусава (Аршаншчына) прайшлі міжнародныя спаборніцтвы паляўнічых сабак-лаек на падсадного мядзьведзя і вальернага кабана. Часам канкурсантам удавалася разьюшыць нават падсадного мядзьведзя.**


## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ЛІЦЭЙ

**Для заняткаў** зь ліцэістамі запрашаем беларускамоўнага выкладчыка ангельскай мовы. Т.: 633–48–59 (сп.Лявон)

### КАНТАКТЫ

**Хлопец пазнаёміцца** зь дзяўчынай–беларускай для сур'ёзных адносінаў. Т.: 373–23–74, 238–87–93. Сяржук

### КЛЮБ

**Пачаў дзейнасьць** магілёўскі клюб аматараў беларускамоўнай музыкі. Хто жадае спрычыніцца да сумеснае дзейнасьці, тэлефануйце: 241–62–14 (Сяржук), 749–83–72 (Воля)

### ПРАЦА

**Беларускамоўныя няні і гувэрнанткі** ў сем'і, дзе размаўляюць на роднай мове. Т.: 226–50–31, 750–14–11. Іна

**Беларускі тамада** й вядоўца імпрэзаў. Вясельны мэнэджмэнт, мерапрыемствы «пад ключ». Тэл. 658–47–78

**Вусныя/пісьмовыя** пераклады з/на італьянскую мову. Дыяна. Т.: 757–42–97

**Navuču** niamieckaj movie. Padrychtuju da paśpiachovaj zdačy testu ci ispytań pa niamieckaj movie. Т.: 290–47–72

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Зьвяртацца загадзя пасьля 17–й. Т.: 235–18–72. Юры


## «НН» 100 ГАДОЎ З ВАМІ

**Вільня.** Мінуўшы тыдзень — гэта былі цікавыя дні для ўсёй Вільні. Усе, ад старога да малога, зацікаўленыя ішлі на поле на канец гораду — Антокаль, пакрывалі яго, як мурашкі, каб убачыць як чалавек, быццам зраўняўшыся з птушкай Божай, паляціць у паветра на сваёй машыне — аэрапляне. Найцікавей было ў панядзелак: тысячы народу, сабраўшыся, гудзелі, гаманілі і глядзелі на вялізную птушку–машыну, каля каторай рупіўся чалавек. Нешта раптам затрашчэла, завурчэла, і машына, як бусел, бяжыць па зямлі, падскоквае… і… вось ужо ў паветры — высока, высока!.. Як нявядомая страшная птушка, носіцца ў вышыні над дамамі, лесам, ракой… Вось адляцела далёка на заходзячае сонца і, пераліваючыся ў яго прамянях, зьнікае з вачэй. Публіка крычыць, махае шапкамі, хусьцінкамі.

Гэтак пралётаўшы 22 мінуты, авіятар зрабіў 35 вёрстаў і таксама дзіўна, як птушка, сьпусьціўся на зямлю, як і падняўся зь яе. І добра было, і сэрца радасна білася, што чалавек гэтулькі мае сілы і моцы, што патрапіў ужо зavaяваць і птушкамі мераны абшар.

**І.Н.**
**1910, №38**


## ЗАПРАШАЕМ У ПАДАРОЖЖА

**23 кастрычніка**: Дамашаны—Алесіна—Ляды—Убель—Сьмілавічы—Дукора—Раванічы—Багушэвічы—Беразіно.

**5—6 лістапада** па маршруце: Вільня—Трокі—Меднікі

Т.: 232–54–58, 622–57–20 (Зьміцер), 264–12–38, 776–24–35 (Павал)



Ліцэнзія №02310100189 ад 24 траўня 2001 году

**АЛЬТУС ПЛЮС**

**Край азёраў, касьцёлаў, паркаў**

**30 кастрычніка**

**Мядзел—Нарач—Камаі—Паставы**

Камаі — касьцёл Сьв.Яна Хрысьціцеля (1603—1606 гадоў), помнік абарончай архітэктуры Беларусі. У нашыя дні тут гучыць арганная музыка...
Каменны крыж XV ст.
Паставы — вадзяны млын 2–й паловы XIX ст. Цяпер тут дом рамёстваў, дзе можна набыць традыцыйную кераміку, вырабы з саломкі.
Палац Тызэнгаўза (1788 г. — 1–я палова. XIX ст.)
Касьцёл Сьв.Антонія Падуанскага (1898—1904 гадоў.)
І пад канец — заезд на страусіную фэрму, дзе ў адкрытых вальерах пасьвяцца страусы, бегаюць рознакаляровыя трусы і нават жывe горны казёл Боцік. Побач — кавярня, дзе можна набыць экалагічна чыстыя сыры, масла, страусіныя яйкі і мяса.

**Кошт туру — 35000**

**«Альтус Плюс» г. Менск, вул. Кастрычніцкая 5-320 (к/з «Менск»)**
**т. 222 46 51, GSM 762 72 33**
**www.vandrouka.com**



**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
нам. галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**



© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.



12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

**Наклад 3362.** **Газэта выдаецца 48 разоў на год.**

Нумар падпісаны ў друк 20.00 12.10.2005.

Замова № 5870.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а